№ 7 (317) 21 лютага 2003 www.nn.by

Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА

Заснаваная ў 1906. Адноўленая ў 1991. Выходзіць у пятніцы

Мужчыны, зважай!

Чужое сьвята, свая гісторыя.

старонка 3

Выбары ў акрузе з заапаркам

Рэпартаж з Чыжоўкі.

старонка 4

Квартплата забівае

Першыя ахвяры.

старонка 6

Юбілей Вінцэнта Жук-Грышкевіча, Сяргей Навумчык пра вайну...

Што пішуць. Старонка 7

Сьвятары супраць храмаў

Калі спытацца ў якога-небудзь уладыкі дазволу замяніць слова ў малітве на іншае, прыгажэйшае, ён прыме цябе за вар'ята ці блазна. Зусім ня так — з храмамі. «Уладыка Філарэт неаднаразова пытаў у нас дазволу паставіць на сабор купалы. А мы кажам: там іх не было», — расказвае Васіль Абламскі, дырэктар Дэпартамэнту па ахове гісторыка-культурнай спадчыны і рэстаўрацыі пры Міністэрстве культуры. Пераробкі, непрафэсійныя рамонты — пасьля іх старажытныя цэрквы і касьцёлы губляюць аўтэнтычны выгляд. Найчасьцей нявечаць храмы самі гаспадары — сьвятары зь вернікамі.

Працяг на старонцы 11.

АНАТОЛЬ КЛЯШЧУК

«Духоўнасьці» стала болей

Выйшла ў сьвет беларускамоўнае выданьне кнігі прэзыдэнта Туркменіі Сапармурата Ніязава «Рухнама» («Духоўнасьць»).

Беларускае выданьне — ня першае ў шэрагу перакладных. У верасьні 2002 г. адбылася прэзэнтацыя «Рухнамы» па-расейску. Апроч таго, кніга выйшла па-турэцку, па-ангельску (ёю займаліся навукоўцы з Кембрыджу), па-японску, па-арабску, на фарсі. Асобнае выданьне выйшла па-туркменску, але арабіцай. Увадначас зь беларускім перакладам пачалася праца над польскім, украінскім, кітайскім і нямецкім перакладамі.

Мала таго, што «Рухнама» лічыцца ў Туркменіі другой кнігай пасьля Кур'ану, — ейны продаж яшчэ і не абкладаецца падаткамі. Пры гэтым цану кнігі Туркменбашы прызначыў сам — 50 тыс. манатаў (9,5 даляра ЗША, паводле афіцыйнага курсу).

Дзяржаўны пієтэт да гэтага твору ў Туркменіі настолькі вялікі, што нават верасень — месяц, калі была скончаная «Рухнама», — пераназваны ў ейны гонар. У гонар гэтага твору будзе пабудаваная бібліятэка «Рухнама» зь некалькіх будынкаў. Адзін зь іх будзе цэнтральным, і там мусіць захоўвацца толькі адна кніга — сама «Рухнама». Туркменбашы атрымаў за напісаньне кнігі найвышэйшую дзяржаўную ўзнагароду — «Залаты паўмесяц». Гэта пятая ягоная найвышэйшая ўзнагарода.

Пераклалі кнігу на беларускую мову Мікалай Сільчанка, Анатоль Бутэвіч, Анатоль Кудравец, Леанід Дранько-Майсюк. Не з арыгіналу.

Твор Туркменбашы — рэдкі вынятак на беларускім кніжным далягляддзе. Кнігі адыёзных замежных палітычных дзеячоў у нас зазвычай зьяўляюцца па-расейску. На кніжным кірмашы ў Менску можна купіць за 20 даляраў нават «Майн кампф». Адзіная беларускамоўная папярэдніца «Рухнамы» — «Зялёная кніга» Муамара Кадафі.

АШ

Камэнтары Валянціна Тараса й Анатоля Кудраўца — старонка 2.

«Наша Ніва» запрашае да супрацоўніцтва рэклямныя агенцыі і агентаў па рэкляме на выгадных умовах. Інфармацыю пра сябе дасылайце на электронны адрас nn@promedia.by.

Т./факс: 284-73-29.

З жыцьця ня выкрасьліць нічога

50 гадоў назад, у сакавіцкія дні 1953-га, калі памёр Сталін, я, тады студэнт БДУ, прысьвяціў памяці Сталіна ўсхваляваны верш, які быў надрукаваны ва ўнівэрсытэцкай шматтыражцы «За сталінскія кадры». Празь дзесяцігодзьдзі, ужо на пачатку 90-х, калі ў Беларусі разгараўся адраджэнскі, дэмакратычны рух, да якога без ваганьняў далучыўся і я, мне пра той верш неаднойчы напомнілі «непахісныя сталіністы», каб абвінаваціць у беспрынцыповасьці, крывадушнасьці, у здрадзе «сьветлым ідэалам» сваёй маладосьці. Атаясамілі юнака — аўтара таго вершу — са сталым чалавекам, які прыйшоў да новых сваіх пераканаьняў шляхам пакут сэрца і розуму, праз гады балючага разбурэньня лжывых ілюзій і догмаў, што ўцямяшаныя былі ў галаву ледзь не зь пялюх. Я і ня думаў апраўдвацца. Што тут апраўдвацца? І перад кім? Перад «вечна ўчорашнімі»? Ім даказваць, што ты ня малпа, каб не мяняцца, не бервяно, здольнае толькі гніць? І ўсё ж, калі напомнілі мне пра той верш, было такое адчуваньне, нібы мяне тыцнулі ў яго носам, як шчанюка ў ягонае гаўно на падлозе…

Зноў згадалася пра тое гэтымі днямі, калі даведаўся, што ў нас, у Менску, выдадзена на беларускай мове кніга прэзыдэнта Туркменістану. А перакладчыкі яе — вядомыя літаратары. Не наіўныя юнакі — сталыя людзі. І, здавалася, дэмакратычных поглядаў, ніяк не прыхільнікі дэспатычных таталітарных рэжымаў, дзе б тыя рэжымы ні існавалі. Здавалася…

Балюча, горка ўжываць у дачыненьні да іх гэтае слова. Але даводзіцца.

…Ці можа хто-небудзь назваць імя хоць аднаго вядомага пісьменьніка, які ў свой час пераклаў на сваю родную мову «Майн кампф» Адольфа Гітлера? Ніхто не назаве. Бо «біблію» Адольфа перакладалі толькі нікому не вядомыя рамесьнікі. Таму мне цікава, што прымусіла беларускіх перакладчыкаў «Рухнамы» закрыць вочы на асобу яе аўтара? Няўжо грошы? *Такія* грошы — *пахнуць*, і вельмі гідка.

Думаю, што ўсё-такі ня варта было людзям сталага, мудрага веку пляміць свой талент абдымкамі з Туркменбашы. Бо рана ці позна будзе за гэта сорамна. Як было сорамна мне нават за юначы мой, несьвядомы грэх галашэньня над труной ката. З жыцьця ня выкрасьліць нічога.

Валянцін Тарас, віцэ-прэзыдэнт Беларускага ПЭН-цэнтру

15 РАДКОЎ РЭДАКТАРА

У чаканьні «Б»

Апошнім часам шмат гаворыцца пра энэргетычную ды інфармацыйную бясьпеку краіны. Праектуюцца ГЭС на Нёмане, Дзьвіне, ЦЭС на польскім вугалі, рэанімуюцца дробныя ЭС. Прапануецца аддаць у канцэсію беларускія радовішчы бурага вугалю. Нацыянальнае ТВ нарэшце атрымала інвэстыцыі. Апошняя заява вышэйшага кіраўніцтва: энэргетычная незалежнасьць немагчымая без пабудовы беларускіх АЭС.

Але, кажучы «А», трэба нарэшце сказаць і «Б». Энэргетычная і інфармацыйная роўназалежнасьць, нібы тая пабудова АЭС, магчымая толькі пасьля прыходу заходніх інвэстыцый. Пасьля павароту да Захаду. Толькі тады можна будзе казаць пра курс на незалежнасьць. Інакш выходзіць проста ламаньне, набіваньне сабе цаны перад здачай.

Праціўнікі цяперашняга курсу ня будуць спаць у шапку. У слонімскім мікраёне былой Групы савецкіх войскаў у Германіі ўжо сабралі 2000 подпісаў за аднаўленьне РТР. Калі не сказаць «Б», энэргетычную і інфармацыйную незалежнасьць зьядуць, як беларусізацыю на пачатку 90-х. Тады, помніцца, кампанія супраць беларускіх школ таксама пачалася з гарадкоў ГСВГ.

Андрэй Дынько

• МЭДЫІ •

СТВ вызвалена ад падаткаў

Сёлета зь 1 ліпеня ЗАТ «Сталічнае тэлебачаньне» пачне атрымліваць субсыдыі зь дзяржбюджэту. Памер грашовай дапамогі будзе роўны падаткам на прыбытак і даданую вартасьць, якія СТВ мусіць сплачваць, займаючыся рэклямай ды прадпрымальніцкай дзейнасьцю. Фактычна тэлеканал на тры гады вызвалены ад галоўных падаткаў.

Ужо падрыхтаваны і ўзгоднены з Саўмінам адпаведны прэзыдэнцкі загад. Менгарвыканкаму прапанавана даваць такія ж субсыдыі з свайго бюджэту — інакш кажучы, СТВ ня будзе плаціць і мясцовых падаткаў.

Згодна з указам, субсыдыі павінны выкарыстоўвацца выключна на паляпшэньне працы СТВ, стварэньне й разьвіцьцё яго вытворчае базы. Наглядаць за тым, каб кіраўніцтва тэлеканалу выдаткоўвала грошы паводле прызначэньня, будзе Міністэрства інфармацыі.

Летась 19 ліпеня была прынятая такая самая пастанова пра вяртаньне падаткаў на даданую вартасьць ды прыбытак тэлеканалу АНТ. Чаму тэлеканалам не дазволілі проста не плаціць падаткаў? Каб кантраляваць грошы. АНТ ды СТВ мусяць спачатку цалкам выплачваць сумы падаткаў, потым інспэкцыя Міністэрства па падатках ды зборах у 5-дзённы тэрмін пераводзіць тыя грошы на рахункі тэлеканалаў у разьдзел «мэтавыя фінансавыя паступленьні». СТВ ды АНТ павінны залічаць атрыманыя сродкі ў свае фонды разьвіцьця. Калі б тэлеканалы проста не плацілі падаткаў, нельга было б адсачыць, на што яны выдаткавалі сродкі.

Сёлетнія прыбыткі ад рэклямнай ды камэрцыйнай дзейнасьці тэлеканалу мусяць скласьці больш за 2,8 млрд. рублёў. 144 і 477 млн. рублёў — прыкладныя сумы, якія канал ашчадзіць на падатках. За тры гады атрымліваецца эканомія амаль на мільён даляраў. І гэта толькі падлік па мінімуме: калі СТВ удала мадэрнізуецца ды пашырыць аўдыторыю, прыбыткі ад рэклямы ўзрастуць.

Летась у траўні СТВ пачала трансьлявацца на Менскую вобласьць на частаце расейскага каналу «Культура» празь перадатчыкі ў Мядзеле ды Салігорску. Аляксандар Зімоўскі, генэральны дырэктар «Сталічнага тэлебачаньня», мае намер пашырыць вяшчаньне на ўсю краіну. Грошы ёсьць.

У Беларусі пачынаецца эра мясцовага тэлебачаньня.

Алесь Кудрыцкі

Адказ Анатоля Кудраўца

На старонках «Рухнамы» можна было б зьвярнуць увагу на пэўныя радкі. Дапусьцім, такія: «Нацыя, як і чалавек, мае плоць, сэрца і розум. Яе плоць — нацыянальная культура, яе сэрца — мова і музыка, яе розум — сьвядомасьць і філязофія народу» або «Некаторыя і сёньня настальгуюць па нядаўнім мінулым, лічаць, што ў часы СССР жылося лепш. Але ж ты, туркмен, ледзь не канчаткова страціў сваю мову, бязь веданьня расейскай мовы цябе ня бралі ні на вучобу, ні на працу. Хіба можна лічыць вартым лад жыцьця, пры якім народ страчвае самае сьвятое — сваю мову, рэлігію, нацыянальную памяць?» Магчыма, у чалавека, які прачытаў «Рухнаму», узьнікла б жаданьне параўнаць словы кнігі з словамі лідэра іншай дзяржавы, сказаныя ім у час сустрэчы з студэнтамі Беларускага дзяржаўнага ўнівэрсытэту інфарматыкі і радыёэлектронікі: «…Мы ня можам аддаць расейскую мову Расеі, бо ўклалі ў яе разьвіцьцё сваю душу. Гэта і наша мова».

Сытуацыя з выхадам «Рухнамы» па-беларуску мне трохі нагадвае эпізод з жыцьця партарганізацыі Саюзу пісьменьнікаў. Тады пры абмеркаваньні адзін зь вельмі актыўных літаратурных партыйцаў сказаў: «Я раману не чытаў, але лічу яго антысавецкім і шкодным».

Што датычыць асабіста майго ўдзелу ў перакладзе двух разьдзелаў кнігі, то я не шкадую. Іншае: калі б такая прапанова была зроблена мне пасьля таго, як стала вядома пра «замах» на прэзыдэнта Туркменістану і яго наступствы, рашэньне маё, безумоўна, было б іншае.

Анатоль Кудравец



Адзіная беларускамоўная папярэдніца «Рухнамы» — «Зялёная кніга» Муамара Кадафі. Яе перакладчыкі палічылі за лепшае не пакідаць для гісторыі свае прозьвішчы. У 1992 г. яе можна было спакойна купіць у шапіку ТБМ на праспэкце Скарыны. Беларускамоўнае выданьне «Зялёнай кнігі» і цяпер прадаецца ў Трыпалі, сталіцы Лібіі. Досьвед не мінуў марна, і «Рухнама» загучала па-беларуску раней, чым на многіх іншых мовах.

• СЬВЕТ •

Мухі асобна, сланы асобна

Прэзыдэнт Францыі Жак Шырак востра скрытыкаваў кандыдатаў у Эўразьвяз за праамэрыканскую пазыцыю па іракцкай праблеме. На каго разьлічваў францускі палітык, дапускаючы выказваньні на мяжы дазволенага дыпляматычным этыкетам? Адрасатамі ёсьць перш за ўсё французкія выбаршчыкі, ад якіх залежыць палітычная будучыня што самога Шырака, што ягонай партыі.

Рэакцыя Францыі мае характар хутчэй дэмагагічны, чымся практычны: нагадаць краінам-кандыдаткам пра іхняе месца ў эўрапейскім доме. Можам, маўляў, і на парог не пусьціць. Але насамрэч краіны-кандыдаткі даўно пераступілі парог і ня можа адна рэпліка перакрэсьліць шматгадовыя перамовы, сцэнар уваходу новых сяброў у Эўразьвяз. Шырак выпусьціў пару, але не зрабіў чагосьці такога, што магло б паўплываць на доўгатэрміновае разьвіцьцё падзеяў у абодвух — калі дадаць сюды іракцкі крызыс — кірунках.

Нягледзячы на ўсе інтэграцыйныя працэсы ў заходняй Эўропе, францускі палітык застаецца францускім, а не эўрапейскім. Кляса чыноўнікаў, якія бачаць у асобных краінах толькі правінцыі адзінай імпэрыі, у ЭЗ не займела такога голасу, які яна мае ў нашмат менш аформленым «саюзе Беларусі і Расеі».

На месцы аб'ектаў Шыракавай слоўнай атакі я б парадаваўся. Пакуль гучаць такія размовы, сьмяротная небясьпека сувэрэнітэту краінаў — сяброў ЭЗ не пагражае. І калі іхні голас быў пачуты цяпер, ён будзе мець вагу й пазьней. А ЗША займелі яшчэ адну нагоду аддзячыць за адданасьць. Так што ўсе ў выйгрышы.

Застаецца адзін непрыемны момант: уся гэтая спрэчка нагадвае пра пэўную несамастойнасьць эўрапейскай палітычнай сцэны. Падкрэсьліўшы малаважкасьць краін-абітурыентак, Францыя міжволі пазначыла сваё неадназначнае становішча: слон сярод мух, муха каля слана. Роўнай амэрыканскаму слану Францыя можа пачувацца толькі ў ролі лідэркі ЭЗ, захоўваць якую пасьля пашырэньня будзе нашмат цяжэй. Асобны ж францускі голас нязгоды для заакіянскай звышдзяржавы гучыць часам зыканьнем мухі. Мухі і сланы ўсё ж павінны разглядацца паводле адрозных крытэраў. Залішняя рэзкасьць заўвагаў Шырака можа быць выкліканая менавіта гэтым ня вельмі прыемным адчуваньнем. Бо ён — француз.

Аляксандар Карольчык, Горадня

БЯДА

«Раніца» пад пагрозай

У газэце «Обозреватель» адбыліся зьмены. Заміж скандальна вядомай Інгі Хрушчовай цяпер выданьне ачоліць Яўген Мялешка — ейны былы аднакурсьнік і калега па БТ. Зьмены могуць быць зьвязаныя з тым, што колькасьць непрададзеных асобнікаў газэты дасягала 80%. Сышла з газэты ня толькі галоўная рэдактарка, але й ейная намесьніца Сьвятлана Яскевіч. Цяпер яна ўзначальвае калектыў дзіцячае газэты «Раніца».

Настрой новай рэдактаркі выклікае трывогу ў супрацоўнікаў выданьня. У прыватнасьці, ёсьць небясьпека зьмены моўнага рэжыму «Раніцы»: газэта можа стацца дзьвюхмоўнай ці нават цалкам расейскамоўнай. Адказваючы на пытаньне «НН», С.Яскевіч зазначыла: «Пакуль выданьне застанецца беларускамоўным, а надалей мы будзем раіцца з чытачамі».

Найстарэйшая беларуская дзіцячая газэта (год заснаваньня — 1929) заўжды выходзіла панаску, раней называлася «Піянерам Беларусі». Калі зрабіць яе расейскамоўнай, беларускіх дзіцячых газэтаў папросту не застанецца.

Аркадзь Шанскі

ЧУЖОЕ СЬВЯТА, СВАЯ ГІСТОРЫЯ

Дзе вы служылі ў войску?

На савецкія вайсковыя сьвяты дагэтуль паказваюць кіно пра спэцбрыгаду, якая выконвала сакрэтную апэрацыю на «нэўтральнай тэрыторыі». Пры канцы галоўны супэрмэн-дэсантнік гіне. Звычайная была б агітка з таго кіно, каб не апошнія кадры. Разлогі Віцебшчыны ці Смаленшчыны. Вайсковы газік спыняецца пасярод вёскі. Сябры прывезьлі дамоў нават не цынкавую труну — дэсантніцкі барэт. З хаты насустрач ім выходзіць стары-стары бацька...

Імпэрыя не тлумачыць сваім салдатам, дзе і дзеля чаго яны мусяць ваяваць. Былі часы, калі й нашым землякам даводзілася ахоўваць бязьмежныя савецкія прасторы, выконваць «інтэрнацыянальны абавязак» у Аўганістане, Віетнаме, Усходняй Нямеччыне, Эгіпце. Тыя, хто браў удзел у афрыканскіх спэцапэрацыях, нават не захацелі дзяліцца з намі ўспамінамі — так гэта цяжка. Іншыя ж ахвотна распавялі, як служылася беларусам у савецкім войску. Жывую гісторыю.

Сяргей Грыц, фотакарэспандэнт: У савецкае войска быў прызваны ў 1983 г. і служыў каля Ленінграду, у вучэбным палку сувязі асаблівага прызначэньня, які забясьпечваў радыёвыведку. Нашы выпускнікі служылі ў Манголіі, Аўганістане, на Кубе, поўдні Ўзбэкістану. У часьць бралі толькі беларусаў, украінцаў, расейцаў і літоўцаў.

Недалёка знаходзіліся артылерыйскія палкі, у якіх служылі выхадцы з Каўказу ды Сярэдняй Азіі. І на іх тэрыторыі была чайная, куды хадзілі мы. Там у «маладых» адбіралі грошы і ежу. Раз тры азэрбайджанцы напалі на беларускага хлопца, які нёс з чайной піражкі. Але той, не выпускаючы піражкоў з рук, «адмалаціў» іх нагамі…

Алег Дашкевіч, рэжысэр-дакумэнталіст: Я служыў у Вугоршчыне ў 1981—83 г. Спачатку зь Менску трапіў у Мар'іну Горку, дзе быў перасыльны пункт. Перад намі адтуль пайшоў прызыў у Аўганістан... У Вугоршчыне патрапіў я ў сакрэтную часьць, якая падначальвалася наўпрост Маскве. У часьці была спадарожнікавая антэна. Разам зь іншымі «дзядамі» мы ўначы адчынялі «сакрэтныя дзьверы» й глядзелі спартовыя, музычныя ды эратычныя каналы. Зь іх упершыню даведаўся, што такое рок-музыка, эротыка.

Аўген Калубовіч, настаўнік гісторыі: Прызвалі мяне ў 1962 г. Спачатку служыў у Берасьці, у спэцчасьці па ахове перавалачнай базы. Празь яе ішлі грузы савецкім войскам ва ўсходняй Нямеччыне — ад іголак да ракетаў. Гэтыя цягнікі ахоўваў і суправаджаў. Сумна было і журботна — жыцьцё за калючым дротам. Ды яшчэ тры гады!..

Пасьля накіравалі ў Печы, вучыцца на сяржанта. Я добра страляў, бо з 14 гадоў — паляўнічы. Аднойчы на начныя стрэльбы прыехала начальства з інспэкцыяй. Давялося мне тады страляць за адзінаццаць чалавек. Уначы ж не відаць, хто выходзіць на пазыцыю. Атрымаў за гэта адпачынак.

Язэп Машкайла, рэдактар газэты «Голас Пружаны» (часова не выходзіць): Прызвалі мяне пасьля пэдвучэльні. Служыў у Варонежы, у 1983—85 г. Адпраўляў нас Гарадзенскі ваенкамат. Цэлы вагон беларусаў ехаў у Расею. Патрапіў у канвойныя войскі, ахоўваў асуджаных у час перавозу да «зонаў», але найбольш — судовыя паседжаньні аблсуду ў Варонежы. Аднойчы той суд разглядаў і палітычную справу нейкіх дысыдэнтаў, але тады не мая была чарга ахоўваць.

Іван Міско, скульптар: Адзінаццаць дзён у таварным вагоне ехаў з Слоніму да месца службы — у Забайкальле. Былі гэта 1953—54 г. Дагэтуль памятаю прыпеў з нашай песьні:

АНАТОЛЬ КЛЯЩЧУК

Лейся, песня, в голубые дали,
Чтобы слышал Сталин из Кремля,
Что в суровом нашем Забайкалье
Неприступна для врага земля.

Служыў у танкавых войсках і адначасова пасьпеў завочна скончыць трохгадовую школу імя Крупскай у Маскве па малюнку і жывапісе. У апошнія гады службы я быў мастаком у часьці. Намаляваў партрэты членаў Палітбюро (да двух мэтраў у вышыню), алеем напісаў камандзіра дывізіі Драгунскага. Я вельмі задаволены, што служыў у войску, бо гэта моцна паўплывала на мой далейшы лёс.

Іван Пашкевіч, дэпутат палаты прадстаўнікоў: Мяне прызвалі ў 1973 г. з Барысава. Служыў у Бабруйску ў інжынэрна-тэхнічных войсках, быў пантанёрам. Масты наводзіў цераз Нёман. Тады я надрукаваў артыкул у газэце «Во славу Родины», які абмяркоўваўся ва ўсіх вайсковых часьцях. Пра тое, што армія — школа жыцьця, але лепш у яе не трапляць, бо гэта выкінуты з жыцьця час.

Алесь Пушкін, мастак: Мяне прызвалі ў ліпені 1984 г., пасьля першага курсу тэатральна-мастацкага інстытуту. У Ташкенце на перасылцы падпалкоўнік запытаўся: «Маляваць умееш?» Я зразумеў, што, калі прызнаюся, прымусяць маляваць партрэты Ленінаў, Сталінаў. Кажу: «Не, не, я — актор!» Адправілі мяне ў Аўганістан, дзе праслужыў да 1986-га ў гелікоптэрным палку ў Кундузе. А на Вялікдзень вярнуўся дамоў.

Запісаў Сяргей Ёрш

Розьніца між Жлобінам і Вязьмай

Аўтарскі паказ новага фільму Юр'я Хашчавацкага «Каўкаскія палоньнікі» ў Беларускім ПЭН-цэнтры сабраў дзясятак гледачоў. На БТ ён сабраў бы мільённую аўдыторыю і выклікаў скандал. Такую стужку не пакажаш раней за поўнач. А засьне пасьля яе толькі чалавек з моцнымі нэрвамі.

IREX-PROMEDIA

Карціна змантажаваная з кадраў, адзьнятых чатырма апэратарамі розных расейскіх тэлеканалаў. Кадраў, што ня трапілі ў праграмы навінаў.

Напружаньне ў фільме нарастае паступова. Спачатку мы бачым непрыглядны рынак у Грозным пачатку 90-х, дзікаватых чачэнцаў-гандляроў. Той самы рынак гадоў празь 10, інспэкцыйны візыт на яго прамаскоўскага прэм'ера Ільясава ў атачэньні двух дзясяткаў целаахоўнікаў з аўтаматамі. Селішча. Краявіды з кінахронікі савецкіх гадоў. Ізноў сучасныя кадры. Зруйнаваныя, нібы ў Сталінградзе, будынкі. Генэрал Трошаў загадвае вывесіць над селішчам сьцяг дэсантных войскаў. Выпрасаваная гусеніцамі зямля. Уцякачка-чачэнка з кацянём за пазухай штурбае ў кірунку гораў. Адзін зь першых баёў 1994 г.: простасардэчнага афіцэра, няўлоўна падобнага да Стася Судніка, аўтара расейска-беларускага вайсковага слоўнічка, раняць першага. Яго вывозяць у палявы шпіталь, пасьля, яшчэ з сотняю такіх, гелікоптэрам. Насустрач ляціць такая самая «вінтакрылая машына». Толькі гарматнае мяса ў ёй яшчэ не пакрамсанае. Цытаты з хрэстаматыйных твораў Талстоя. Для талстойскага тэматычнага вечара на франка-нямецкім тэлеканале і здымаўся гэты фільм. Аўтар меў заданьне «паглядзець на цяперашнюю вайну вачыма клясыка».

Галоўны герой, маладзенькі афіцэрык марской пяхоты, суправаджае «груз 200» на радзіму (ці можа быць у трупа радзіма?). Ён вязе парэшткі свайго матроса, 19-гадовага Ляшчова. Афіцэра суправаджае апэратар. Па дарозе афіцэр спавядаецца ў камэру. Пад гарэлку, вядома. Як да вайны быў гатовы адзін баец зь дзесяці. Як, разьюшаныя, разарвалі БТРамі чачэнку-«снайпэрку». Яшчэ шмат чаго.

Напружаньне нарастае паступова, каб урэшце прывесьці нас да дзьвюх кульмінацый.

Самая жорсткая сцэна ўзятая з касэты, перададзенай чачэнцамі Эдуарду Джафараву, маскоўскаму апэратару-фрылансэру, які шмат працаваў у Чачэніі. Пагорак, проста дзівосна зялёны мурог, такі зялёны, які можа быць, напэўна, толькі на паўднёвым схіле гары ў паўднёвых краях. Палоннага расейскага байца ставяць на калені ў траву, каб адрэзаць яму галаву. «Людзі добрыя! Я жыць хачу!..» — плача ён. Кінжал абабягае шыю, нібы нож мясьніка — тушу на Камароўцы. Плач зьмяняецца енкам, пасьля хрыпам. Галава ляціць у раўчак. Ці трэ было ўстаўляць гэтую сцэну ў фільм? Адназначна трэба, мяркуе рэжысэр.

Другая кульмінацыя. Скрыню з матросам Ляшчовым — прозьвішча напісана крэйдаю на дошках — заносяць у «ізбу». З мацюканьнем, бо не праходзіць у дзьверы, чапляе за вушак. Бабы галосяць атупела. Лейтэнант бясконца паліць. Камэра ўвесь час спыняецца на гэтых цыгарках. Цяпер спрабую ўзгадаць іх марку і не магу: нейкая ўсходняя, у нас ня звыклая. «Біблас», ці што?

Фільм дакумэнтуе для нас дзьве сьмерці з 12-ці тысяч — менавіта столькі абаронцаў айчыны страціла Расея на той вайне.

Ёсьць дзясяткі адказаў на пытаньне, чым розьніцца Жлобін ад Вязьмы. Галоўны сёньня — у Жлобін не прыходзяць цынкавыя труны.

У Расеі, са словаў Ю.Хашчавацкага, паказаць такі фільм немагчыма. Шкада, што гэткае кіно не трансьлююць па БТ у перапынках між драмаю «Мусульманін». Бо, урэшце, такое мастацтва дапамагае не рабіць памылак у жыцьці.

Фільм пра нялюдзкі сьвет вайны, што бывае прыгожаю толькі ў тэленавінах, склеены з кавалкаў дзясяткаў розных стужак. Гэта каляж, зроблены чалавекам зь іншага сьвету без спагады да сваіх герояў-чачэнцаў, герояў-расейцаў.

У гэтым сэнсе можна сказаць, што заданьню Юры Хашчавацкі ня даў рады. Талстой спачуваў сваім сучасьнікам з аднаго і другога боку, хоць часам калюча іранізаваў над імі. Аўтар «Каўкаскіх палоньнікаў» палічыў за лепшае заставацца ад сваіх герояў на адлегласьці. А мо па-іншаму і немагчыма.

Барыс Тумар

Выбары ў акрузе з заапаркам

Па Ташкенцкай выбарчай акрузе №5 зарэгістраваныя чатыры кандыдаты ў дэпутаты Менгарсавету. Двое ад палітычных партыяў: выкладчык Гуманітарнага ліцэю Аляксей Янукевіч, сябра БНФ (вылучаны зборам подпісаў), і інжынэрка Галіна Суворава — ЛДПБ. Працоўныя калектывы Менскага аўтазаводу і камандна-інжынэрнага інстытуту МНС вылучылі сваіх супрацоўнікаў Аляксандра Ажгірэя (таксама зборам подпісаў) і Ўладзімера Вераб'ёва адпаведна.

Я нарадзіўся тут

З маладым і амбітным палітыкам Аляксеем Янукевічам я пазнаёміўся праз праваабаронцу Алеся Бяляцкага. Сп.Алесь адмовіўся ад інтэрвію «НН» праз недахоп часу (сам ён ідзе па Куйбышаўскай акрузе), але прапанаваў іншы варыянт: «Пагутарце лепей зь Янукевічам, во ў каго файная кампанія». Янукевіч адрэагаваў адразу. «Наша Ніва»? Без пытаньняў. Давайце праз дзьве гадзіны — на сядзібе БНФ».

На Варвашэні, 8 заўсёды ветліва сустракаюць кожнага. Што праўда, гарбату прапануюць абраным — на ўсіх ня хопіць. Севярынец шпарка ходзіць па пакоях і вітае за руку ўсіх, каго бачыць; Вячорка стрымана ківае галавой толькі знаёмым; туды-сюды сноўдае моладзь, абмяркоўваючы спартовыя навіны, — карацей, увечары тут жыцьцё віруе.

Галоўным козырам сваёй выбарчай кампаніі Янукевіч лічыць «вялікую колькасьць сяброў». Нават на ўлётках Янукевіча побач з банальным «Чыжоўка будзе лепшай» стаіць лёзунг-выслоўе «Я нарадзіўся тут і буду жыць тут». Аляксей і сапраўды нарадзіўся й жыве ў сваёй Ташкенцкай акрузе, на вуліцы Ўбарэвіча. Ніводзін зь ягоных канкурэнтаў гэтым пахваліцца ня можа. Тут жывуць усе Аляксеевы аднакашнікі, многія ўжо маюць сем'і. Мусіць, таму даволі хутка за яго былі сабраныя ажно 503 подпісы (для рэгістрацыі патрэбна 150). «У маёй камандзе многа дзяўчат — а яны агітаваць умеюць!»

Арыентуецца Янукевіч на выбарніка 25—50 гадоў, чалавека адукаванага і сямейнага, хоць у сваёй праграме намагаецца закрануць усіх. Яе асноўныя тэзы: грошы з гарадзкога бюджэту павінны выдаткоўвацца толькі на ўсеагульныя патрэбы, крамы раёну мусяць быць забясьпечаныя таварамі, вуліцы — добра асьветленыя, школы ды паліклінікі — дагледжаныя.

Упэўненасьць і мэтанакіраванасьць Аляксея даспадобы ягоным суседзям. Адна кабета зь ягонага дому сказала мне: «Ён хоць і з БНФ, але талковы».

Ведалі Янукевіча і падлеткі, якіх я сустрэў блізу СШ №43 (яе ў 1993 г. скончыў кандыдат). «Варта піхаць ва ўсе гэтыя саветы і палаты маладых ды сваіх, мо весялей будзе», — кажуць яны з гэтым тыповым няўменьнем паглядзець суразмоўцу ў вочы.

Трэці раз за родны МАЗ

Яшчэ ў часе тэлефоннае гутаркі Аляксандар Ажгірэй — намесьнік дырэктара па зьнешнеэканамічных сувязях і адначасова дырэктар па сумеснай дзейнасьці Менскага аўтазаводу — сказаў, што асабліва на месца ў гарсавеце не прэтэндуе і можа аддаць тое «крэсла» хоць бы й Вераб'ёву — адзінаму з супернікаў, якога ён ведае.



«Камітэт абароны Бацькаўшчыны «Вітаўт», блізкі да КХП-БНФ, у адной са сваіх улётак называе Аляксея Янукевіча «кадравым афіцэрам КДБ».

Прыняў Ажгірэй мяне ў сваім кабінеце. На пытаньне, колькі ў нас часу на размову, «бос» кінуў: чым меней, тым лепей. Пасьля доўгае дыскусіі пра «апазыцыйную» прэсу, нарэшце ўдалося задаць пытаньне наконт выбараў. Але ніякай інфармацыі спадар Аляксандар даваць не зьбіраўся: «Ліпавая вашая ніва, а Янукевіч не сасьпеў на дэпутата яшчэ». Вось і пагутарылі...

Ажгірэй балятуецца трэці раз, дагэтуль не шанцавала. Галоўнае ягонае апірышча — працаўнікі МАЗу, што жывуць у Ташкенцкай акрузе. Паляпшэньне іх дабрабыту сп.Аляксандар лічыць сваёй галоўнай мэтай. Козыры Ажгірэя — вялікі досьвед і, як ён кажа, «падрыхтаванасьць». Некалі сп.Аляксандар працаваў старшынём дзяржпляну ў Менгарвыканкаме, таму добра ведае эканамічную сыстэму гораду.

Ажгірэй — кандыдат старой фармацыі. Гэткі тыповы чыноўнік, які многае недагаворвае, на пытаньні адказвае двухсэнсоўна і няпэўна, але заўсёды ведае, што робіць і што з гэтага выйдзе. Праграму ды іншыя перадвыбарныя матэрыялы кандыдат паказаць адмовіўся, сказаўшы пры гэтым, што цяпер для яго галоўная праблема — «каб завод ня стаў».

Эканамічныя падважнікі

У камандна-інжынэрным інстытуце МНС рэжым строгі. Каб дайсьці да кабінэту начальніка, трэба мінуць дзяжурнага, прахадную ды камандзіра, які ўважліва разгледзіць твае дакумэнты. Але засьпець Уладзімера Вераб'ёва на месцы не ўдалося. Працоўны графік у яго вельмі шчыльны, да таго ж інстытут аглядала дэлегацыя з Польшчы. Па тэлефоне спадар Уладзімер сказаў: «Вы толькі не падумайце, што я пазьбягаю сустрэчы, сапраўды гэты і наступны тыдзень будуць вельмі напружанымі». Наўзамен Вераб'ёў прапанаваў нават выслаць па мяне машыну, каб давезла на Машынабудаўнікоў, 25, дзе месьціцца інстытут. Ехаць другі раз на ўскраіну Менску вялікага жаданьня не было, таму цягам 30 хвілінаў мы гутарылі па тэлефоне.

«Можаце напісаць, што я самы стары кандыдат», — жартаваў Вераб'ёў. Яму 58 гадоў — на год старэйшы за Ажгірэя. Сп.Уладзімер служыў на Ціхаакіянскім флёце, працаваў у Акадэміі навук, пасьля — у пажарніцкім падразьдзяленьні. Інстытут ачольвае зь першага дня ягонага існаваньня. Доўгія гады «начальніцтва» яго не сапсавалі — на тактоўнасьць не забываецца. Адно толькі спытаў, ці не зьбіраюся я выкарыстаць яго для «рэклямаваньня» Янукевіча. Электаратам сваім Вераб'ёў лічыць бюджэтнікаў — настаўнікаў, дактароў і пэнсіянэраў. Ён спадзяецца, што здолее наладзіць хоць адрасную дапамогу тым, каму яна неабходная. Не забываецца начальнік і на моладзь: «У інстытуце мы ўжо адкрылі колькі спартовых сэкцый, дзе займаюцца падлеткі». Неабыякавы яму і выгляд раёну: «Вы паглядзіце на гэтыя дамы: «хрушчоўкі» ператварыліся ў «хрушчобы», а як пафарбаваныя шматпавярховікі...» Вераб'ёў зьбіраецца кантраляваць рамонтныя работы ў сваёй акрузе. Ён «абыдзецца без палітыкі» і будзе выкарыстоўваць у агітацыі дый у магчымай дэпутацкай дзейнасьці эканамічныя рычагі.

Парадак ва ўсім

Знайсьці кандыдатку ад ЛДПБ Галіну Сувораву было найскладаней. У штабе партыі тэлефон маўчыць, а працуе спадарыня Галіна за межамі Менску — інжынэркай на досьледна-мэханічным заводзе «Агратэхмаш». Але пагутарыць усё ж атрымалася. Галоўным чынам кандыдатку непакояць праблемы беспрацоўя, бо сама з гэтым некалі сутыкнулася: «Маладыя ня могуць уладкавацца, бо патрэбны стаж, а дасьведчаныя людзі ўжо лічацца старымі».

Невыканальных абяцаньняў выбарцам даваць яна ня хоча: «Паглядзіце, якія капейкі атрымліваю будучая маці, што сыходзіць у дэкрэт. Пакуль я магу хіба паспачуваць ёй». Што ў Расеі, напрыклад, «будучыя маці» атрымліваюць яшчэ менш, чым у Беларусі, кандыдатка ня ведала.

Таксама выклікае абурэньне ў кандыдаткі масавая забудова тэрыторыі цэрквамі, хоць супраць рэлігіі яна нічога ня мае: «Ну што тут казаць, калі зносяць дзіцячую пляцоўку, а замест яе будуць чарговую царкву?»

Палітычны досьвед Суворава мае — працавала ў выбарчых камісіях. Таму разумее, што шанцы не ва ўсіх роўныя, — «перамагаюць тыя, у каго ёсьць грошы». На маю просьбу даслаць электроннай поштай агітацыйныя матэрыялы яна адказала, што на кампутар яшчэ не зарабіла.

Кандыдатка гаворыць, што арыентуецца на жанчынаў. Яе лёзунгі вельмі эмацыйныя: «Парадак ва ўсім! Чыноўнікі павінны адпрацоўваць свой час, дворнікі — месьці вуліцы, а заводы — працаваць! Калі гэтага ня будзе, то нехта павінен адказаць за гэта! І адкажа!»

Калі вярстаўся нумар, стала вядома, што Вераб'ёў зьняў сваю кандыдатуру. «Беспартыйнага» кандыдата ня стала, затое стала ясна, хто зь «беспартыйных» ідзе ад партыі ўлады.

Хто ж пераможа ў Чыжоўцы? Галоўны вораг усіх прэтэндэнтаў — нізкая актыўнасьць выбарцаў у гэтым адным з найбяднейшых раёнаў сталіцы. Папярэднія выбары тут адбываліся не заўсёды. Два кандыдаты ад палітычных партый — Янукевіч і Суворава — падзеляць галасы незадаволеных.

Квартплата расьце касьмічнымі тэмпамі. Каб зрабіць аналіз крыві, трэба выстаяць гадзінную чаргу ў паліклініцы. Каб зарэгістраваць свой бізнэс, прыходзіцца месяцамі хадзіць па кабінэтах. «Кішэнныя» дэпутаты папярэдніх скліканьняў абмяжоўваліся паслухмяным адабрэньнем рашэньняў улады і дробным «прабіваньнем» інтарэсаў сваёй «фірмы» — заводу ці канторы. Людзям ад іх не было ні почуту, ні толку. Ня дзіва, што выбарцы і ставяцца да мясцовых выбараў абыякава. Ня дзіва і што моладзь кандыдатам старой фармацыі не давярае.

Сяргей Будкін, Чыжоўка

Паспаборнічаць за 30 дэпутацкіх мандатаў у Аршанскі гарсавет вырашылі 97 кандыдатаў. 49 зь іх былі вылучаныя працоўнымі калектывамі, 28 — зборам подпісаў і 20 — мясцовымі арганізацыямі палітычных партый.

Кропля камень точыць

Дзіна Барычэўская — 1971 г.н., музычная кіраўнічка ў ясьлях-садку № 36, студэнтка-завочніца Беларускага дзяржаўнага ўнівэрсытэту культуры.

Канстанцін Анташкевіч — 1958 г.н., інжынэр-электронык на заводзе «Чырвоны змагар», сябра БСДП (НГ).

Сяргей Трафімаў — 1963 г.н., настаўнік Аршанскай дапаможнай школы, у 2000 г. прайграў выбары ў палату прадстаўнікоў. Цяпер спрабуе сілы зноў.

З розных падставаў гарадзкая камісія па выбарах адмовіла ў рэгістрацыі 6 прэтэндэнтам. У параўнаньні зь мінулымі выбарамі ў саветы сёлета назіраецца вялікая актыўнасьць партыйцаў. Больш за ўсіх кандыдатаў вылучыла БСДП (НГ) — 14. Сярод іх 5 — шляхам партыйнага вылучэньня, 2 — шляхам збору подпісаў, яшчэ 7 прадублявалі сваё вылучэньне і партыйным сьпісам, і зборам подпісаў. 8 кандыдатаў вылучыла мясцовая арганізацыя АГП, але зарэгістравалі толькі чатырох. Усе яны ішлі праз збор подпісаў. 3 кандыдаты мела ПКБ і 2 — ЛДПБ. У мінулыя выбары актыўнасьць гэтых партый у Воршы была большая.

Усе 49 кандыдатаў, вылучаных працоўнымі калектывамі, — гэта людзі ўлады. Сярод іх няма ніводнага партыйца, затое 8 прадастаўнікоў «Воршажыльфонду». І хто гэта вырашыў вылучаць камунальшчыкаў, здаўна нелюбімых народам? Ці зь іх выбарамі ў гарсавет зьявіцца ў кватэрах цяпло ўзімку і гарачая вада ўлетку? Сумнеўна. Астатнія вылучэнцы ад улады — начальнікі ўсіх узроўняў. Пасьля рэгістрацыі на кожную акругу прыпадала ў сярэднім па тры кандыдатуры. Толькі дзьве былі безальтэрнатыўныя (на мінулых выбарах — 10).

Здавалася, сёлетнія выбары ў Воршы павінны быць напружанымі й цікавымі. Але не пасьпела «Аршанская газета» надрукаваць сьпіс кандыдатаў, як у камісію пасыпаліся заявы ахвотных зьняць кандыдатуры. На гэты момант адмовіліся ад барацьбы 30 чалавек. Сярод іх і тыя, каго вылучылі працоўныя калектывы (часам бязь іх згоды і жаданьня), сябры партыяў. Праз жорсткі прэсынг з боку ўлады й адміністрацыі адмовіліся камуніст Сяргей Шаўроў, начальнік аддзелу на піўзаводзе, дырэктарка СШ №3 Галіна Дашко ды іншыя. Ужо на 11 лютага дзесяць акругаў сталі безальтэрнатыўнымі, у адзінаццаці засталося па два кандыдаты, у сямі — па тры і ў дзьвюх — па чатыры.

Але ў кандыдатах засталіся найбольш упартыя і дасьведчаныя ў палітычнай барацьбе людзі. Сярод іх — сябра БСДП (НГ) настаўнік Сяргей Трафімаў. Яшчэ напярэдадні выбарчай кампаніі ён заўважыў парушэньні, зробленыя гарвыканкамам падчас фарміраваньня выбарчых участкаў. Для разгляду яго скаргі ў Воршу прыяжджалі прадстаўнікі Цэнтравыбаркаму. Як незалежны кандыдат балятуецца ў гарсавет старшыня Аршанскай ТБМ Юры Нагорны — дырэктар СШ №22, сябра незарэгістраванай АСДП. Сур'ёзную канкурэнцыю яму складзе завуч суседняй школы. Цікава, што акругаў, дзе будуць канкураваць настаўнікі, па горадзе некалькі. Мо таму, што на настаўнікаў лягчэй за ўсё ціснуць?

Зь цяперашняга складу гарсавету «слугамі народу» пажадалі застацца ўсяго 12 дэпутатаў, праўда, некаторыя зь іх балятуюцца па іншых акругах. Гарсавет, хоць быў цалкам намэнклятурны, але не «кішэнны» для вэртыкалі. Ходзяць чуткі, што яна жадала б бачыць у крэсьле старшыні гарсавету больш падатлівага чалавека.

З выбарамі ў Аршанскі райсавет карціна больш зразумелая. З 37 акруг 28 безальтэрнатыўныя і толькі ў 9 зарэгістраваныя па 2 кандыдаты. Сярод іх — вылучэнцы ПКБ і БСДП (НГ). Але ёсьць безальтэрнатыўныя акругі, дзе зарэгістраваныя сябры ПКБ. Праўда, іхняя апазыцыйнасьць невялікая, бо адзін — старшыня сельсавету, другі — аграном. Пераважная большасьць кандыдатаў — старшыні сельсаветаў ды калгасаў, дырэктары дзяржпрадпрыемстваў ды навучальных устаноў.

Нейкая інтрыга можа быць толькі ў дзьвюх акругах. У 1-й Высокаўскай балятуецца кіраўнік Аршанскага прадстаўніцтва БХК Васіль Берасьнеў. А ў Барздоўскай — настаўнік Валеры Пячонкін, былы дырэктар Барздоўскай школы-саду (пайшоў з пасады летась), стваральнік найлепшага ў краіне школьнага музэю «Гісторыя роднай вёскі». Ён вылучаны зборам подпісаў. Яго канкурэнтам стаў цяперашні дырэктар школы, старшыня Аршанскай арганізацыі аўтанцаў Уладзімер Кузьмянкоў, якога вылучыў працоўны калектыў Аршанскай сельгасхімії. За дэпутацкі мандат будуць змагацца начальнік і падначалены. Але Пячонкін здымаць сваю кандыдатуру не зьбіраецца. І калі вынікі галасаваньня не сфальсыфікуюць, Пячонкін лёгка стане дэпутатам, бо яго тут добра ведае кожны выбарнік.

За 8 дэпутацкіх мандатаў Віцебскага аблсавету выказалі жаданьне пазмагацца 22 кандыдаты, большасьць зь іх таксама кіраўнікі. Сярод вылучаных адзін камуніст-калякінец і тры сацыял-дэмакраты. Зарэгістраваны і кіраўнік мясцовай суполкі БСДП (НГ), індывідуальны прадпрымальнік Аляксандар Сталяроў. Ён ідзе па акрузе, дзе балятуюцца намесьнік начальніка Віцебскага абласнога ўпраўленьня МНС Аляксандар Ліпатаў і дырэктарка школы-гімназіі №19 Натальля Кохава. Пікантнасьць сытуацыі ў тым, што ў гэтай школе МНС мае кадэцкія клясы.

З заклікам байкатаваць выбары зьвярнулася да аршанцаў суполка КХП—БНФ. Лідэры іншых дэмакратычных партый (у горадзе няма нізавых структур Партыі БНФ, як, дарэчы, і КПБ) плянуюць заклікаць людзей не хадзіць на тыя «безальтэрнатыўныя» выбарчыя ўчасткі.

Складам будучыя саветы мо і ня будуць надта розьніцца ад цяперашніх. Мо ніводны з апазыцыйных кандыдатаў ня стане дэпутатам. Але плён ад выбарчай кампаніі будзе. Людзі даведаюцца пра існаваньне ў горадзе суполак дэмакратычных партый, дый інфармацыя, якую панясуць незалежныя кандыдаты выбаршчыкам, будзе розьніцца ад той, якой «корміць» афіцыйная прапаганда.

Яўген Жарнасек, Ворша

Быў трактар ці не?

На 40 дэпутацкіх месцаў у Бялыніцкім райсавеце прэтэндуюць 42 кандыдаты. Альтэрнатыва ёсьць толькі ў дзьвюх акругах: Лебядзянкаўскай і Менскай. Кандыдат у дэпутаты па Лебядзянкаўскай акрузе, вэтэрынар калгасу імя Чкалава Валер Вусік зьвярнуўся ў абласную выбарчую камісію. Скардзіцца на ўціск з боку супрацоўнікаў Бялыніцкай ДАІ і раённай выбарчай камісіі. Нібыта чыноўнікі вымагаюць ад ягоных аднавяскоўцаў пацьвердзіць факт, што ў Вусіка ва ўласнасьці знаходзіцца трактар, набыты 13 гадоў таму ягоным братам. Канкурэнтам сп.Валера зьяўляецца начальнік аддзяленьня крымінальнай міліцыі мясцовага РАУС.

Базыль Ліцьвіновіч, Бялынічы

Выбары ў Барсавет



Алесь Грыцавец — 1970 г.н., кіраўнік тэрмагальванічнага ўчастку Баранавіцкага аўтаагрэгатнага заводу, сваяк лётчыка-героя Грыцаўца.

Выбары дэпутатаў у Берасьцейскі абласны савет у Баранавічах сёлета пройдуць як у савецкія часы. Усе сем акругаў бэзальтэрнатыўныя. Усе кандыдаты — вылучэнцы ўладаў. Усе яны спрабуюць таксама патрапіць у мясцовыя саветы.

На 36 месцаў у Баранавіцкі гарсавет балятуюцца 64 кандыдаты. Нягледзячы на такую вялікую колькасьць, у 18 акругах па адным кандыдаце. Усе яны — вылучэнцы ўладаў.

Сярэдні век кандыдатаў у мясцовыя саветы — 48 гадоў. Самаму маладому — 19 (беспартыйны навучэнец каледжу лёгкай прамысловасьці), найстарэйшаму — 77 гадоў (мэтадыст гарадзкога ўпраўленьня адукацыі, ідзе ад КПБ). Кіраўнікоў, намесьнікаў, камандзіраў часьцей — 16, настаўнікаў — 18 (зь іх 15 дырэктараў школаў, каледжаў, ВНУ), дактароў — 10 (тых, што займаюць кіроўныя пасады, — 8). Ідуць ва ўладу толькі 2 прадпрымальнікі. Таксама абіраюцца ваенкам гораду і цяперашні старшыня гарсавету Ўладзімер Стахноў (гэтыя — безальтэрнатыўна).

Партыі разам здолелі зарэгістраваць 19 чалавек: БНФ — 2, БСДП (НГ) — 7, АГП — 3, ПКБ — 3, КПБ — 4. «Ад АГП ў Баранавічах ішло 6 чалавек, зарэгістравана толькі 3. Улады адсеялі кіраўніцтва. Засталіся шараговыя сябры, маладыя людзі да 25 гадоў. Усе зарэгістраваныя займаюць шараговыя пасады на сваіх працах (мэханікі, доктар), што дае падставу спадзявацца на падтрымку простых выбарцаў», — кажа Алесь Хоміч, кандыдат ад лібэралаў.

Мясцовыя філіі дэмакратычных партый ня здолелі падзяліць акругі. Толькі выпадкова іх кандыдаты не сутыкнуліся. «Пападаньне» адбылося толькі аднойчы — па акрузе №7 ідуць Алесь Кісель ад АГП і старшыня баранавіцкай БСДП (НГ) Віктар Карлінскі. Гэта адно дадае шанцаў трэцяму суперніку, Аляксандру Разумаву, намесьніку дырэктара ЗАТ «Атлянт».

Віктар Карлінскі — 1955 г.н., старшыня ЖСК-38, старшыня баранавіцкай БСДП (НГ).

Усе партыйцы маюць у акругах канкурэнтаў. Найбольш прэтэндэнтаў на ўчастку №17 — 4 чалавекі. Менавіта там балятуецца старшыня баранавіцкай Рады БНФ Алесь Грыцавец. Але ён здавацца не зьбіраецца. «Хаджу ад дзьвярэй да дзьвярэй, — кажа Грыцавец. — Людзі злыя на ўладу — за рост квартплаты».

На пратэстныя настроі разьлічваюць усе апазыцыйныя кандыдаты.

Руслан Равяка, Баранавічы

Тарыфы для моцных нэрваў

У паштовай скрыні нешта ёсьць, заўважаеце вы. Не сьпяшайцеся радавацца. Цалкам магчыма, што паштар прынёс вам ня доўгачаканы ліст ад старога сябра, а рахунак за камунальныя паслугі. Калісьці тыя паведамленьні ніякіх эмоцыяў ня выклікалі. Цяпер хочацца перажагнацца, перш чым прачытаць лічбы на раздрукоўцы.

IREX-PROMEDIA

Мінулае буйное падвышэньне адбылося летась у канцы года, калі на 25% узьняліся тарыфы на ацяпленьне ды гарачую ваду, вырасьлі цэны на іншыя паслугі. Новага перагляду цэнаў доўга чакаць не давялося. 15 студзеня, з блаславеньня Міністэрства эканомікі, ацяпленьне і гарачая вада зноў падаражэлі на 15%.

Камунальнікі ня толькі падвышаюць цэны на свае паслугі, але й індэксуюць іх, каб ня страціць ад інфляцыі. Летась тыя індэксацыі склалі прыкладна 30%, што амаль адпавядае ўзроўню інфляцыі (34,8%).

Нават Міністэрства статыстыкі прызнае, што ў 2002 г. заробкі расьлі павольней за цэны. Сярэднямесячны налічаны заробак павялічыўся летась на 33,3% (са 173422 да 231223 рублёў), а цэны — на 34,8%. На тэмпы росту цэнаў паўплывала найперш падаражаньне камунальных паслугаў (ад 51,4% за карыстаньне радыёкропкай да 700% за ліфт). Калі летась сям'я з трох чалавек (двое дарослых, якія атрымліваюць сярэднестатыстычны заробак, маюць адно дзіця ды жывуць у стандартнай двухпакаёўцы) аддавала 8% свайго бюджэту на камунальныя паслугі, дык сёлета давядзецца выдаткоўваць ужо 12,5%.

Эканоміць на вадзе дый газе можна... паставіўшы лічыльнік. Пакуль яго няма, камунальнікі вылічваюць «сярэдняе арытмэтычнае» з усяе спажытае жыхарамі цэлага дому вады, часам дадаючы сюды яшчэ й страты ад аварыяў на водаправодзе. Зь лічыльнікам плаціш толькі за сябе.

З усіх спажыўцоў камунальных паслугаў у краіне прыкладна 10% іх не аплачваюць. Толькі ў Менску каля 70 тыс. неплацельнікаў. У сталіцы камунальныя службы пачынаюць адключаць ваду і сьвятло тым, хто завінаваціўся найбольш. Мяркуюць нават падаваць на неплацельнікаў у суд ды адсяляць іх у менш камфортнае і таньнейшае жытло. Летась у ліставадзе пінскія ўлады адсялілі сям'ю (маці і дваіх дарослых дзяцей) зь дзяржаўнай двухпакаёўкі па вуліцы Касьцюшкі ў аднапакаёвую кватэру без камунальных выгодаў. Небаракі завінаваціліся ўладам 193 тыс. рублёў. Спагнаць гэтыя грошы ўлады спрабавалі цэлы год: дасылалі папярэджаньні, адключалі гарачую, халодную ваду, электрычнасьць, ацяпленьне. Урэшце падалі ў суд.

Такі лёс чакае тысячы сем'яў, няздольных плаціць. Праз гэтыя драмы ўжо прайшлі Польшча і Літва. З адным адрозьненьнем: Беларусь жыве ва ўмовах рынкавага сацыялізму.

Алесь Кудрыцкі

У артыкуле выкарыстаная статыстыка Міністэрства статыстыкі і аналізу

Зьмяненьне цэнаў на камунальныя паслугі ў 2000—2002 г.

паслуга	павелічэньне адносна леташняга ўзроўню		
	2002	2001	2000
кватэрная плата	471%	38,5%	280%
карыстаньне ліфтам	700%	38,4%	190%
газ	219%	234%	210%
электрычнасьць	146%	33,3%	970%
ацяпленьне	145%	143%	730%
гарачая вада	145%	143%	730%
халодная вада й каналізацыя	57%	74,6%	180%
вываз сьмецьця	77,3%	94,4%	470%
утылізацыя сьмецьця	84,7%	95,1%	460%
карыстаньне радыёкропкай	51,4%	39%	75%

Пакрыцьцё сабекошту некаторых жыльлёва-камунальных паслугаў

	студзень—сьнежань 2002 г.	па стане на 15 студзеня 2003 г.
тэхабслугоўваньне	23,1%	32,8%
цяпло	30,6%	52,6%
халодная вада	31,3%	52,8%
каналізацыя	33,2%	55,9%
вываз сьмецьця	88,2%	97,1%
карыстаньне ліфтам	62%	96,1%
камунальныя паслугі цалкам	38,3% (зімовы пэрыяд), 29% (летні пэрыяд)	61,4% (зімовы пэрыяд), 55% (летні пэрыяд)

• МЭДЫІ •

Новая газэта ў Полацку

На мэдыйным рынку Полацку ды Наваполацку зьявілася новая газэта «Inform-банк». Галоўным рэдактарам — Аляксандар Козік (літаратар Алесь Аркуш).

Полацкі гарвыканкам вырашыў, што места мае дастатковую колькасьць грамадзка-палітычных выданьняў, таму заснавальнікам давялося зарэгістраваць газэту як рэклямна-інфармацыйную. Аднак рэдакцыя зьбіраецца стварыць канкурэнцыю «сур'ёзным» рэгіянальным выданьням. У Полацку і Наваполацку, паміж якімі пралягае хіба ўмоўная мяжа, жыве 200 тыс. чалавек. Насельніцтва ня беднае: працаўнікі «Нафтану» атрымліваюць па 200—300 даляраў у месяц. Ня дзіва, што рэклямных газэтаў у Полацку выходзіць ажно пяць. Самыя буйныя грамадзкія выданьні — дзяржаўныя «Полацкі весьнік» ды «Новая газета», а таксама незалежны «Хімік». Добра разьвітае кабэльнае тэлебачаньне. Амаль у кожнай кватэры ідзе па 20—30 каналаў. У тым ліку і мясцовыя кабэльныя тэлестанцыі: полацкія «Скіф», «Саміт» ды наваполацкія «Квант», «Вэктар». Нядаўна зьявілася мясцовая FM-станцыя, якая дае пакуль толькі рэкляму ды кароткія выпускі навінаў на частаце «Эўропы-Плюс». Ёсьць нават свой мэдыямагнат — прадпрымальнік Уладзімер Захараў, уладальнік гандлёвага дому «Стралец». Яму належыць узгаданая тэлекампанія «Квант» ды рэклямная газэта «Информ-плюс».

«Inform-банк» жадае прывабіць новага чытача — моладзь, якая вырасла за апошняе дзесяцігодзьдзе. Адна з рубрыкаў газэты — «Зазірні на мой сайт», дзе вядзецца гаворка пра інтэрнэт-рэсурсы, што маюць дачыненьне да Полаччыны. Іншыя сталыя тэмы — крымінальныя здарэньні ды культурніцкія навіны.

Наклад «Inform-банку» — 1000 асобнікаў. Рэкляму «Inform-банку» круцяць на мясцовых тэлестанцыях ды друкуюць у «Хіміку».

«Нашая газэта дзьвюхмоўная. Сёньня немагчыма раскруціць навастораную газэту, калі яна будзе цалкам беларускамоўнай, — лічыць А.Козік. — Таму «цьвіковыя» тэксты мы друкуем па-расейску». «Нецьвіковых» — беларускамоўных — матэрыялаў у №2 ад 5 лютага было толькі тры. Усе яны мелі звыклую культурніцка-літаратурную скіраванасьць. Пытаньні ж кватэрных крадзяжоў, жыльлёвага будаўніцтва, працаўладкаваньня студэнтаў асьвятляліся па-расейску. Такая вось раскрутка.

Алесь Кудрыцкі

ЭКАНАМІЧНАЯ ХРОНІКА

Гербавы збор

Летась берасьцейскія ўлады прапанавалі прыватным таксоўшчыкам упрыгожыць свае аўто налепкамі з гербам гораду. Цяпер гарвыканкам пастанавіў, што за выкарыстаньне гарадзкой сымболікі трэба плаціць. Да 15 лютага таксоўшчыкі мусілі перавесьці ў бюджэт Берасьця па 120 тыс. рублёў. Абураныя таксоўшчыкі пастанавілі грошы сабраць, аднак аддаць іх ня ўладам, а прытулку для бедных і хворых людзей. А потым паздымаць «кляйноды» з машынаў.

Ільготы — пайменна

Падрыхтаваны праект прэзыдэнцкага ўказу, які прадугледжвае адрасную форму сацыяльнай падтрымкі. Памер дзярждапамогі будзе вызначацца не прыналежнасьцю да групы насельніцтва, а сумай прыбыткаў чалавека. Улічваць будуць заробак, сацыяльныя выплаты ды ўласнасьць, якая можа прыносіць гаспадару грошы. Калі агульны прыбытак будзе меншы ці роўны 60% бюджэту пражыткова-га мінімуму, можна спадзявацца на дапамогу.

Конкурс таксоўшчыкаў

Гомельскія ўлады зладзілі конкурс для кіроўцаў прыватных мікрааўтобусаў, якія жадаюць працаваць на новым маршруце №32, што злучыць чыгуначны вакзал з Навабеліцкім раёнам. Цяпер у Гомелі 550 «маршрутак». На думку гарвыканкаму, гэтага дастаткова. Таму ліцэнзіі на пасажырскія перавозкі пастанавілі даць толькі 10 з 60 прэтэндэнтаў. Падчас адбору глядзелі, наколькі спраўны ды камфортны мікрааўтобус. Машыны, якія адпрацавалі на дарозе больш за 5—6 гадоў, конкурсу не прайшлі.

Станкі бяз мыту

Савет міністраў тэрмінам на 9 месяцаў устанавіў нулявую стаўку ўвазной мытнай пошліны на тэхналягічнае абсталяваньне. Мэта — дапамагчы вытворцам мадэрнізаваць прадпрыемствы. Гэтыя льготы асабліва прыдадуцца буйным заводам кшталту «Інтэгралу», якому трэба 50 млн. даляраў, каб паставіць новае абсталяваньне. «Інтэграл» разам зь Менскім вытворчым аб'яднаньнем вылічальнай тэхнікі ды Менскім заводам шасьцерняў — найбуйнейшыя з 35 прадпрыемстваў, якія сёлета будуць акцыяваныя.

Новы транспарт

Улады Менску набудуць сёлета 30 новых аўтобусаў, 50 тралейбусаў ды 4 трамваі агульным коштам 22 млрд. рублёў. Летась на новы транспарт горад выдаткаваў больш за 16 млрд. рублёў.

«МТС» хоча набыць «МТС»

Расейская кампанія «Мабільныя ТэлеСыстэмы» жадае набыць кантрольны пакет акцыяў беларуска-расейскага апэратара сотавай сувязі «МТС». Пакуль расейцы маюць 49% акцыяў, а беларускі бок (РУП «Міжгародняя сувязь») — 51%. Сёлета расейцы абяцаюць укласьці ў справу 60 млн. даляраў з 200 млн., якія мусяць інвэставаць цягам 10 гадоў.

Зьнялі Падгорнага

10 лютага пазбавілі пасады Генадзя Падгорнага, дырэктара Фонду дзяржмаёмасьці Міністэрства эканомікі. Матывацыя — «за аднаразовае грубае парушэньне працоўных абавязкаў». Мяркуюць, што яго зьнялі за няўдалы продаж беларускага пакету акцыяў «Слаўнафты».

«Лідэр» №3

Бізнэс-часопіс «Лідэр» прэзэнтаваў свой 3-і нумар. Артыкул «Чысьцільшчыкі офісаў» распавядае пра тое, як абараніцца ад аматараў чужое маёмасьці. «Шпіталь» для аўтамабіля» — інфармацыя для тых, хто жадае заснаваць уласную станцыю тэхабслугоўваньня. Матэрыял «Грошы з вады» распавядае пра вытворцаў безалькагольных напояў, а «Бяда ад розуму» — пра тое, дзе і колькі можа зарабіць кваліфікаваны спэцыяліст. У рубрыцы «Лідэр эпохі» — гісторыя посьпеху Антона Стульгінскага, топ-мэнэджэра, які «ўзьняў» Добрускую папяровую фабрыку. Як заўсёды, «Лідэр» прэзэнтуе клясычным правапісам старонку гаспадарскіх навінаў ад «НН».

АК

ТЫДЗЕНЬ НАШАГА ЖЫЦЬЦЯ

Мальцаў прафэсіяналізуе войска

Міністар абароны Леанід Мальцаў заявіў, што канчатковы пераход да прафэсійнай арміі можа адбыцца раней за 2006 г. Колькасьць вайскоўцаў пры гэтым плянуецца скараціць ад 80 тыс. да 50 тыс. Рэшта ж мужчынскага насельніцтва краіны мае праходзіць службу ў рэзэрве. Вайсковая падрыхтоўка будзе адбывацца «без адрыву ад вытворчасьці». У вызначаныя дні хлопцы, што ня трапілі на тэрміновую службу, пачнуць асвойваць вайсковыя спэцыяльнасьці. Цяпер кантрактнікаў у войску больш за палову.

Чым больш генэралаў, тым больш ваююць

У Беларускім войску ўсяго 23 генэралы. А вось у Расеі толькі з нагоды 23 лютага генэральскія званьні атрымаюць болей за 50 палкоўнікаў.

Пераход на эўра

Каля 700 тыс. эўра купляюць штодня беларусы. Рэсурсаў Нацбанку часам не стае, каб задаволіць попыт.

Мэр-папуліст

Чыноўнікі Магілёўскага гарвыканкаму будуць езьдзіць на працу грамадзкім транспартам, а не службовымі аўто. У кіроўцаў гарвыканкаму працоўны дзень цяпер пачынаецца ад 9-й гадзіны раніцы — на гадзіну пазьней, чым у начальнікаў. Так загадаў мэр гораду Віктар Шорыкаў (на здымку).

Міністар ставіць рэкорды працавітасьці

Міністэрства спорту і турызму пачало ўжо рыхтавацца да «Менскай лыжні — 2004». «Будуць расьпісаныя забегі па групах, па дыстанцыях, па судзейскай калегіі», — адрапартаваў міністар спорту Ю.Сівакоў. Бо «сэнс сьвята — паказаць, чаго ты дасягнуў на працягу году».

Расейскі клюб у Менску

Расейскі пасол у Беларусі Аляксандар Блахін заснаваў «Клюб дзелавых людзей» (закрытага тыпу). У яго запрошаныя кіраўнікі прадстаўніцтваў расейскіх кампаній у Беларусі. Засядаюць яны ў адным з элітных рэстаранаў.

Зьмены міжгародніх кодаў

Адменены скарочаны набор міжгародніх кодаў у межах абласьцей (8-2-код райцэнтру). Цяперака замест «двойкі» трэба набіраць поўны код вобласьці: Берасьце — 016, Віцебск — 021, Гомель — 023, Горадня — 015, Менск — 017, Магілёў — 022.

Увазе тых, хто недачувае

Зь 1 сакавіка навіны з сурдаперакладам на Першым канале будуць выходзіць а 12-й замест 15-й.

Падпольная студыя

Супрацоўнікі УБЭЗ, як мяркуюць, выкрылі ў памяшканьні Інстытуту праблемаў выкарыстаньня прыродных рэсурсаў і экалёгіі падпольную студыю тыражаваньня відэакасэтаў. Сканфіскавалі 214 відэамагнітафонаў, 5200 чыстых і 4030 запісаных касэтаў. Ідзе сьледзтва.

«НН»; радыё «Свабода», «Інтэрфакс», БелаПАН

IREX-PROMEDIA

У пяты раз за сваю гісторыю Беларускі балет ставіць спэктакль на музыку Люі Герольда «Дарэмныя перасьцярогі». Прэм'ера прызначаная на 28 лютага. Апошні раз гэты балет быў на менскай сцэне 25 гадоў таму.

● ШТО ПІШУЦЬ ●

Калі сіла — непазьбежнасьць

Казаць, што вайна — гэта не бяда, было б тым самым, што сьцьвярджаць, нібыта глыбокі разрэз хірургічным скальпэлем — карысны. Але ёсьць сытуацыі, калі апэрацыя — апошняе выйсьце. І адзінае.

Лічыць, што вырашыць канфлікт размовай горш, чым сілай, — таксама нелягічна. Калі ідуць на цябе з калом і ў цябе кол — яно, вядома, спачатку варта паразмаўляць. Ну а калі ўжо замахнуліся калом?

Хусэйн ужо неаднойчы біў па суседніх краінах, у яго ёсьць зброя масавага зьнішчэньня. І ЗША бяруць на сябе няўдзячную ролю хірурга, якому даводзіцца працаваць ва ўмовах, калі няма гарантыі, што анастэзія спрацуе ідэальна, дый яшчэ штурхаюць пад руку. На гэтым можна было б і скончыць адказ аўтару артыкулу «Вайна — гэта бяда» Сяргею Дубаўцу, які лічыць, што з дыктатарамі трэба не ваяваць, а размаўляць.

Мільённыя маршы міру ў мінулую суботу як быццам пацьвярджаюць слушнасьць ягонага меркаваньня. Пацыфісты ставяць пад сумнеў дапушчальнасьць сілавога ўмяшальніцтва ў асяродак, які жыве паводле сваіх законаў. Іншымі словамі, як піша Дубавец, ня толькі з дыктатарамі трэба размаўляць, але і з народам, які выбірае сабе дыктатараў. Пераканаць яго, каб больш не выбіраў дыктатараў. Надыдзе час — і народ дасьпее. Нешта, аднак, перашкаджае пагадзіцца з пацыфістамі.

«Кожны адказ на маё пытаньне пасол Іраку ў Менску пачынаў і канчаў словамі «Нам непатрэбная вайна, мы прагнем міру», — піша журналістка «Советской Белоруссии». Што гэта нагадвае з паўзабытага? Словы Леніна ў 1919 г., што Савецкай Расеі патрэбны мір. А ўявім сабе, што немцы ды брытанцы ўсё ж увайшлі ў Маскву і ліквідавалі бальшавіцкі ўрад. Няма сумневу, які прысуд чакаў бы Ільліча і ягоных «народных камісараў». Толькі ў выніку не было б працягу савецкай улады, не было б Курапатаў.

Размовы ніколі яшчэ не прымушалі тыранаў адмовіцца ад сваіх перакананьняў.

Для лідэраў апазыцыі ў Хусэйна запоўненыя басэйны з салянай кіслатой. А для простага народу, які, паводле Дубаўца, павінен дасьпець, гарантаваныя прадуктовыя пайкі, з захаваньнем усіх стандартаў калярыйнасьці паводле ААН. І ў адказ — стопрацэнтовая падтрымка на рэфэрэндумах.

Чым больш жорсткі рэжым — тым большы працэнт падтрымкі дыктатара. Шмат трэба крыві праліць, каб дамагчыся абсалютных лічбаў. Сталін далёка не адразу дасягнуў 99,8. Брэжнеў у гэтым сэнсе прыйшоў на «гатовенькае».

Леанід Ільліч як мала хто нарошчваў узбраеньне, але з усіх трыбунаў выступаў за мір. І якраз у брэжнеўскія гады Захад спавядаў у стаўленьні да савецкага рэжыму тактыку размоваў. Але потым Рэйган абвясьціў Савецкі Саюз імпэрыяй зла і распачаў праграму зоркавых войнаў, якая вышкамутала эканоміку СССР і стварыла перадумовы ягонага краху.

Заліты бэтонам катлаван на месцы вежаў нью-ёрскага гандлёвага цэнтру пазбаўляе ад ілюзіяў адносна магчымасьці замірыцца з тымі, хто дзеля зьнішчэньня заходняй цывілізацыі гатовы ахвяраваць сваім і чужым жыцьцём. Мо таму дзьве траціны амэрыканцаў падтрымліваюць вайну ў Іраку. Калі б плян «Аль-Кайды» зьнішчыць самалётным таранам Эйфэлеву вежу зьдзейсьніўся, сёньня ад францускага прэзыдэнта мы б чулі іншыя заявы. Польшча, Літва, Баўгарыя падтрымалі ЗША, бо, у адрозьненьне ад Францыі, добра памятаюць, што такое дыктатура.

І нарэшце — пра матыў, які, як піша Дубавец, «бліжэйшы нам»: «Учора Югаславія, сёньня Ірак, заўтра... Пасьлязаўтра — у Беларусі, дзе пануе апошні дыктатар Эўропы... Нас таксама можна захацець ашчасьлівіць...» Варта супакоіць Дубаўца: ніхто не зьбіраецца ўжываць сілу ў Менску. Ня будзе таго, што навыдумляў сабе ўдзельнік аднаго з інтэрнэт-форумаў: кшталту, дзьве брыгады спэцназу NATO нэўтралізуюць прапрэзыдэнцкія падразьдзяленьні, блякуюць Дразды і сілавыя міністэрствы, а прэзыдэнцкі будынак займае Івонка Сурвілла.

Ня трэба баяцца. Ніякай сілавой апэрацыі ня будзе. Вось менавіта ў дачыненьні да Беларусі Захад выбраў якраз тактыку размаўляньня. Дык згодны з Дубаўцом: працэс гэты доўгі. І калі так — хто забараняе нам тэарэтычна прыкінуць, як доўга мы будзем высьпяваць? Біблійны Майсей 40 гадоў вадзіў народ па пустэльні. Калі за пункт адліку ўзяць аднаўленьне Незалежнасьці — 1991 г., застаецца 28 гадоў.

Пры падзеле на пяць атрымоўваецца пяць дадатковых прэзыдэнцкіх тэрмінаў, нават з гакам.

Сяргей Навумчык, Прага

Вечарына Жук-Грышкевіча

У школе ў вёсцы Камарова на Мядзельшчыне адбыўся вечар, прысьвечаны 100-й гадавіне з народзінаў Вінцэнта Жук-Грышкевіча — старшыні Рады БНР у 1970—82 г. Дзе-так пазнаёмілі з жыцьцём гэтага ўраджэнца Будслава, а тыя прадэклямавалі прысьвечаныя земляку вершы. Сярод вучняў правялі віктарыну. За найлепшыя адказы яны атрымалі беларускія кніжкі ад краязнаўца Івана Драўніцкага.

Алесь Высоцкі, Мядзел

Галендры з-над Бугу

Я нядаўна напаткаў у Інтэрнэце два артыкулы пра лёс «галендраў» (перасяленцаў-лютэранаў з ваколіцаў Берасьця, якія жывуць у Сібіры). Зь першага дазнаешся, што яны нават у Сібіры дагэтуль размаўляюць на палескім дыялекце («украінска-беларускі дыялект»). Другі тэкст — гісторыя лютэранскай палескамоўнай парафіі з публікацыі 1902 г. Я скарыстаў паасобныя зьвесткі з гэтых артыкулаў (і пару фатаздымкаў, якія атрымаў з Польшчы) у новай рэдакцыі беларускай лютэранскай гісторыі на сайце http://lutheranica.at.tut.by/biblio/lut-hist-bl.htm. Магчыма, хтосьці пажадае напісаць пра тых «галендраў» падрабязна ці пашукаць іх па вёсках уздоўж Бугу на поўдзень ад Берасьця? Першы тэкст (пра Сібір): http://luther.ru/pages/church_history/printversion.php?issue=currentissue. Другі тэкст (кроніка парафіі): http://www.luteranie.pl/lublin/historia/neudorf-kronika.htm.

Мікола Пачкаеў, Кембрыдж

Як адмыць маркі

Беларуская пошта выпускае шмат цікавых паштэнакаў, якія маюць калекцыйнае значэньне з розных галін. Мне даспадобы замкі, сьвятыні і славутыя людзі, а таксама герб Пагоня і гербы княстваў, хаця ня ўсе ўлучаныя. Ёсьць добрая сэрыя спартоўцаў ды жывёльны сьвет. Я калекцыяную для свайго задавальненьня. Вось апошнім часам выпушчана сэрыя марак-кветак, якія не паддаюцца, каб іх можна было адмачыць ад клею. Рададэндрон (Rhodaendron), сон раскрыты (Pulsolitia patens), канюшына (Trifolium), скрыпень вузкалісты (Chamaenerion augustifulium), гарлачык вузкалісты (Nuphr luta), рамонак (Matracaria) — гэтая сэрыя ёсьць з клеем, які не адмываецца вадою, і іх няможна ўжываць у альбом. Чым тады мыць гэтыя маркі, каб яны не гублялі свайго колеру і выгляду? Можа, хто знае на гэта разьвязку. Доўга мачыць у вадзе — яны размакаюць, а клей не адмываецца. Толькі марка траціць колер і выгляд.

Чытаю Вашу газэту і люблю правапіс, які ёсьць клясычны і адпаведны беларускай мове.

Кастусь Верабей, Нью-Ёрк

Божая расá

Ці можна сабе ўявіць, каб прэзыдэнты Літвы ці Францыі хаця б у думках маглі сабе дазволіць словаблудзтва кшталту выказанага перад выкладчыкамі і студэнтамі Беларускага дзяржаўнага ўнівэрсытэту інфарматыкі і радыёэлектронікі Аляксандрам Лукашэнкам: «Я не стварыў горшых умоў для беларускай мовы, чым для расейскай. Толькі даў магчымасьць выбару. Мы ня можам аддаць расейскую мову Расеі, бо ўклалі ў яе разьвіцьцё душу. Гэта і наша мова... Калі вы хочаце размаўляць, пісаць па-беларуску — мы будзем толькі падтрымліваць».

Прэзыдэнт гаворыць пра заахвочваньне жаданьня размаўляць і пісаць па-беларуску. Але дзе на справе яго рэалізаваць? Нават у прэзыдыюме Нацыянальнай акадэміі навук вам настойліва параяць напісаць менавіта па-расейску паперу, накіраваную, прыкладам, ва ўрад. Напісанае па-беларуску ня будзе прынята нават у аддзяленьні гуманітарных навук.

«Роўныя магчымасьці» праяўляюцца паўсюль: у рэкляме і шматлікай іншай інфармацыйнай прадукцыі, у шыльдах, паказальніках, на тэлебачаньні. Зьвярніцеся да электроннай прававой базы: нават у самых «гуманітарных» міністэрствах адукацыі, культуры, інфармацыі мала хто «осквернит уста» гэтай вечнай папялушкай — «матчынай мовай».

Спэцыяльна зладжаныя мерапрыемствы, кшталту лекцый у студэнцкіх аўдыторыях кіраўніка дзяржавы, калі ўсё адфільтравана, вымыта, падфарбавана, калі высокага госьця павядуць загадзя падрыхтаванымі калідорамі ў загадзя прызначаныя для агляду памяшканьні, — не паказьнік усенароднага «адабрамсу». Толькі ці гэта калі цікавіла ўладу, якая жыве па прынцыпе вядомай народнай показкі пра «Божую расу ў вочы»?!

Якуб Міхалюк, Менск

Пабудзілі медзьвядзёў

У лясах Аршаншчыны і Дубровеншчыны павялічылася колькасьць дзікіх жывёлаў: дзікоў, ласёў, казуляў, зайцоў. А гэта значыць, ёсьць дзе разгуляцца ваўкам, якія прыйшлі з паляўнічых гаспадарак іншых раёнаў. Так, на лясной мяжы паміж Дуброўнам і Воршай быў знойдзены задраны ваўкамі лось. Цяпер мясцовыя паляўнічыя зьбіраюцца вызначыць месца знаходжаньня драпежнікаў, іх колькасьць ды пачаць адстрэл.

А нядаўна прыйшлі паляўнічыя ў лес, што ля вёскі Лужкі Аршанскага раёну, каб пастраляць лісіц ды зайцоў, ды стрэлямі пабудзілі мядзьведзяў. Тыя вылезьлі зь бярлогаў і давялі парушальнікаў спакою да стрэсу. Дарэчы, летась бачылі мядзьведзяў і ў іншых лясах Аршаншчыны.

Віктар Лютынскі, Ворша

21 лютага пятніца

БТ

6.00, 7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 15.00, 18.00, 23.00 Навіны.
6.15, 7.15 Добрай раніцы, Беларусь!
8.15 «Вялікі Мэрлін». Сэрыял (ЗША—Вялікабрытанія). 3-я сэрыя.
9.15, 17.05 «Па імені Барон». Сэрыял.
10.05 Сад мары.
10.30 «На скрыжаваньнях Эўропы».
11.15, 22.00 «Магія каханьня». Сэрыял.
12.20, 14.40 Добры дзень, Беларусь!
13.05 Драма «Аповесьць пра сапраўднага Чалавека».
15.20 «Самая кепская ведзьма». Сэрыял для дзяцей.
15.50 Пяць цудаў.
16.00 «Гэта клясна!» Сэрыял.
16.25 5х5.
18.20 «Вялікі Мэрлін». Сэрыял. 4-я сэрыя, заключная.
19.05 Камэдыя «Чалавек, які судзіўся з Богам».
20.40 Калыханка.
21.00 Панарама. Інфармацыйны канал.
21.45 Навіны рэгіёну.
22.45 Зона Ікс.
23.20 Драма «Зьвер, які выходзіць з мора».

СТВ

5.00, 0.50 Музычны канал.
5.30, 14.35 «ЗБЖ, ці...». Тэлесэрыял.
6.00, 15.50 «Паўэр рэйнджэрз, ці Магутныя рэйнджэры». Тэлесэрыял.
6.25, 15.25 «Джым Батан». Мультсэрыял.
6.50, 15.00 «Інспэктар Гаджэт». Мультсэрыял.
7.15, 17.55 «Меншчына. Людзі, падзеі, факты».
7.25, 13.30, 16.30, 19.30, 22.35 «24 гадзіны».
7.45, 20.05 «СТВ-спорт».
7.55 «Сьнеданьне зь Інай Афанасьевай».
8.00 «Менск і менчукі».
8.05, 22.55 «Тэхналёгія».
8.15 Кіно: мэлядрама «Шчасьлівыя выпадкі». ЗША, 2000.
10.10 «Гульнявы рэфлекс».
10.20 «Запрашаем паскардзіцца».
10.30 «Пад вуглом 23 з паловай». Дак. фільм.
11.00, 20.25 «Аўтапанарама».
11.15 «Тэатральныя гісторыі».
11.30 «Сага пра Фарсайтаў». Тэлесэрыял. Заключная сэрыя.
12.30 «Сямейныя страсьці». Ток-шоў.
13.45 «Спэцназ. Засада». Тэлесэрыял.
16.15 Мультфільм.
16.45 «Такая прафсія».
17.20 «Усё для цябе».
18.05 «Пакуль гарыць сьвечка».
18.35 «Спэцназ. Клінок». Тэлесэрыял.
19.50 «Навіны СНД».
20.15 «Добры вечар, маленькі...».
20.45 Кіно: камэдыя «Толькі ты». ЗША, 1994.
23.05 Кіно: баявік «Граміла» ў Эгіпце». Італія, 1979.

8 канал

17.30 Мультпарад.
17.45 Камэдыя «Таксі».
19.15 «Банка коміксаў».
19.40 Шматсэрыйны фільм «Батальёны просяць агню».
20.30 Тэлекрама.
20.40 Міжнародныя навіны з «Дойчэ Вэле».
20.45 «Вечарніца».
21.00 К-відэа «Топ-8».
21.10 Маст. фільм «Вернасьць».

Першы музычны канал

7.00 «Пад'ёмнік».
8.30, 16.00, 23.30, 0.15 MegaMix.
14.00 «V.I.P.онія».
22.00 «120/80».
22.30 «20-ка Першых».
0.00 «Заваёўнікі кантынэнтаў».

АНТ

8.00, 9.00, 18.00, 20.30, 23.40 «Нашы навіны».
8.05 Тэлеканал «Добрай раніцы».
9.05, 19.05 «Зямля каханьня, зямля надзеі». Сэрыял.
9.50 Шматсэрыйны фільм «Наступны» («Next-2»). 2-я сэрыя.
10.40 Чалавек і закон (з сурдаперакладам).
15.30 «Новы дзень». «З «Абловамвым» да людаедаў».
16.00 «Новы дзень». «Геніі і ліхадзеі».
16.25 «Батальёны просяць агню». 4-я сэрыя.
17.30 «Самі з вусамі».
18.10 «Вялікае мыцьцё».
20.00 Час.
21.00 «Поле цудаў».
22.05 «Мафія». Камэдыя. ЗША, 1998 г.
23.55 Трылер «Мора каханьня». ЗША.

РТР

8.35 Тэлефільм «Сямнаццаць імгненьняў вясны».
10.00, 19.00 Весткі.
10.20 У пошуках прыгод.
17.50 Аншлаг.
18.50 Весткі. Дзяжурная часьць.
19.30 Мясцовы час. Весткі — Масква.
19.50 Дабранач, дзеці!
19.55 Тэлесэрыял «Лэдзі Мэр».
20.55 Прэм'ера. Сольны канцэрт Аляксандра Разэнбаўма «Няўжо гэта было».

Культура

15.10 «Лёгкі жанр».
15.40 Некалькі эцюдаў пра расейскую мову.
16.00 «Парыскі часопіс». «Мадон».
16.30 «Небясьпечныя сьцежкі». Дак. сэрыял (Францыя).
17.30 Весткі.
17.40, 23.00 Навіны культуры.
17.55 Паўдзённыя сны.
18.25 «Тэрор у асобна ўзятым горадзе». «Сталыпін мусіць быць забіты».
18.55 Ток-шоў «Аркестравая яма».
19.35 «Стаптаныя чаравікі Бога». Маст. фільм.
21.25 «Лінія жыцьця».
22.20 Блеф-клюб.
23.25 «Хто там...».

НТВ

9.00 Сёньня раніцай.
9.20 Надвор'е на заўтра.
9.25 Дак. драма «Злачынства і пакараньне».
10.00, 1.00, 15.00, 16.00, 17.00 Сёньня.
10.05 «Кватэрнае пытаньне».
14.35 Ток-шоў «Прынцып даміно».
16.05 «Кодэкс гонару». Баявік.
17.15 Крымінал.
18.00 «Сёньня» з Тацянай Мітковай.
18.35 «Свабода слова».
19.55 «На сакрэтнай службе Яе Вялікасьці» (Вялікабрытанія).
22.40 «Усё адразу».
23.15 Кіно не для ўсіх. Камэдыя «Каханьне ў лугах» (Францыя).

Эўраспорт

9.45 Алімпійскі часопіс. Паўтор.
10.15 Дваябор'е. Чэмпіянат сьвету. Скачкі з трампліну К-95. Жывая трансьляцыя.
11.30 Біятлён. Кубак сьвету. Остэрсунд. Спрынт, мужчыны. Паўтор.
12.15 Лыжныя гонкі. Чэмпіянат сьвету. 15 км, клясычны ход. Мужчыны. Жывая трансьляцыя.
13.15 Санны спорт. Чэмпіянат сьвету. Сігулда. Двойкі. Жывая трансьляцыя.
14.30 Дваябор'е. Чэмпіянат сьвету. Скачкі з трампліну К-95. Паўтор.
15.00 Біятлён. Кубак сьвету. Остэрсунд. 20 км, мужчыны. Жывая трансьляцыя.
17.00 Дваябор'е. Чэмпіянат сьвету. Лыжная гонка. Жывая трансьляцыя.
19.00 Скачкі на лыжах з трампліну. Чэмпіянат сьвету. Кваліфікацыя. Жывая трансьляцыя.
21.00 Лёгкая атлетыка. Турнір у Бірмінгеме. Жывая трансьляцыя.
23.45 Гоначная сэрыя Карт. Прэвію сэзону.
0.15 Экстрэмальныя віды спорту. Часопіс. Паўтор.
1.15 Тэніс. Турнір WTA ў Дубаі. Паўфінал.

22 лютага субота

БТ

7.00, 12.00, 15.00, 18.00 Навіны.
7.15 «Бэльфэгор». Мультсэрыял.
7.40 Пяць цудаў.
7.50 «Не зявай!». Тэлеканал для дзяцей.
8.15 Існасьць. Духоўная праграма.
8.50 «Усё нармальна, мама!».
9.35 Экран індыйскага кіно. «Няскрадзеная нявеста». 1-я сэрыя.
11.00 Здароўе. Тэлечасопіс.
11.30 «Сьпявай, душа!». Фальклёрныя калектывы Менскай вобласьці.
12.20 Вясёлая сямейка.
12.45 Падарожжы дылетанта. «Ігнацічы. Уладзімер і Вільгельм Ельскія».
13.00 Сола для дэбютанта. Актор Сяргей Чакерас.
13.15 Плянэта АРТ.
13.40 Дак. сэрыял «Пары і дуэты-2».
14.05 Вэстэрн «Сьцежкай асуджаных» (ЗША). Заключная сэрыя.
15.20 «Піраты XXI стагодзьдзя». Відэафільм АТН.
15.40 КВК. Кубак Садружнасьці Эўралігі.
17.15 Самба. Міжнародны турнір на прызы Прэзыдэнта Рэспублікі Беларусі. Жывая трансьляцыя.
18.20 «Беларускі рэмэйк». Канцэрт найлепшых гуртоў.
19.05 Спартыўная драма «Кошт перамогі».
21.00 Панарама. Інфармацыйны канал.
21.25 Галоўнае пытаньне.
22.05 Крымінальная драма «Сварка» (Францыя).
0.15 Начны музычны этэр.

СТВ

5.30 Музычны канал.
6.30 «Дзікая плянэта»: «Сабачая таямніца» з цыклу «Сабачае жыцьцё». Дак. фільм.
7.30 «Дэніс-непаседа». Мультсэрыял.
8.00 «Флінт — дэтэктыў у часе». Мультсэрыял.
8.25 «Хіткліф». Мультсэрыял.
8.50 «Менск і менчукі».
9.00, 20.00 «СТВ-спорт».
9.10 «Сьнеданьне зь Інай Афанасьевай».
9.35 «Адпачывай».
9.45 «Сямейнае кіно з калекцыі «Hallmark»: «Краіна фэй». ЗША.
10.45, 20.10 Тэлесэрыял «Вялікі перапынак». 3-я сэрыя. СССР, 1972.
12.00 «Разам».
12.30 «Плянэта людзей».
12.45 «Філярманічны тыдзень».
12.50 «Рамонт».
13.05 Кіно: мэлядрама «Мачаха». СССР, 1973.
15.00 «Відавочца».
15.30 «Чыста па жыцьці». Камэдыйны сэрыял.
16.05 «Жыцьцё зь Люі». Мультсэрыял.
16.30 «Вуншпунш». Мультсэрыял.
17.00 «Запрашаем паскардзіцца».
17.10 «Аўтапанарама».
17.30 Кіно: «Жандар і іншаплянэцяне». Францыя, 1979.
19.30 «24 гадзіны».
19.45 «Навіны СНД».
21.15 Кіно: баявік «Моцны арэшак-3». ЗША, 1995.
23.20 «Рэактыўны бокс».
23.35 Кіно: фантастычная драма «Аваленён». Японія, 2001.

8 канал

15.00 Маст. фільм «Бег».
18.00, 21.00 Тэлекрама.
18.10 Праграма мультфільмаў.
18.45 Дак. фільм «Маршал Жукаў».
19.20 «Цуды праваслаўя».
19.40 Шматсэрыйны фільм «Батальёны просяць агню».
20.45 «Вечарніца».
21.10 Маст. фільм «Пра беднага гусара закіньце слова».

Першы музычны канал

8.00, 12.15, 17.00 MegaMix.
12.00 «Заваёўнікі кантынэнтаў».
16.00 Музыка.RU.

АНТ

8.00 Сэрыял «Твінісы».
8.20 Ералаш.
8.25 Грай, гармонік любы!
9.00 Слова пастыра.
9.15 Здароўе.
10.00, 14.00 Навіны (з субтытрамі).
10.10 «Смак».
10.30 Сьмехапанарама.
11.10 Вялікія бацькі.
11.35 «Падарожжы натураліста».
12.05 Крэмль-9. «Апэрацыя «Даліна».
12.45 Лыжны спорт. Чэмпіянат сьвету. Жанчыны. Камбінаваная гонка. Перадача з Італіі.
13.30 Дыснэй-клюб: «Баз і яго банда».
14.10 Вострасюжэтны фільм «За два крокі ад «Раю».
15.40 Дак. сэрыял «Спэцназ».
16.15 «Жывая прырода». Браты па крыві.
17.10 Канцэрт да Дня абаронцы Айчыны.
18.55 Тэлегульня «Хто хоча стаць мільянэрам?».
20.00 Час.
20.30 «Нашы навіны».
21.00 «Апошні герой-3».
22.05 Прэм'ера. Трылер «Прывід дому на ўзгорку».
0.00 Баявік «Праект «А».

РТР

9.25 «Сто да аднаго».
10.15 Сам сабе рэжысэр.
11.15 У пошуках прыгод.
12.10 Клюб сэнатараў.
13.00, 19.00 Весткі.
13.20 Дэтэктыў «Бяз права на памылку». 1974 г.
15.00 Камэдыя «Шчасьлівы выпадак» (ЗША). 1994 г.
17.00 Аншлаг.
18.00 Сьвяточны канцэрт да Дня абаронцаў Айчыны. Трансьляцыя зь Дзяржаўнага Крамлёўскага палацу.
19.25 Люстра.
19.50 «Сумленны дэтэктыў». Аўтарская праграма.
20.15 Сусьветнае кіно. Вострасюжэтны фільм «Уцякач» (ЗША). 1993 г.
22.50 Апошні сэанс. Прэм'ера. Маст. фільм «Какаін» (ЗША). 2001 г.

Культура

11.10 «Графаман».
11.35 Дзіцячы сэанс. «Няўлоўныя мсьціўцы». Маст. фільм.
12.50 «Акадэмія паліцэйскіх сабак». Дак. сэрыял.
13.20 «До мажор».
13.50 Да 125-годзьдзя з дня нараджэньня Казімера Малевіча. «Вялікі містыфікатар». Дак. фільм.
14.30 «Срэбранае стагодзьдзе пецярбурскай рэжысуры». У.Шэкспір. «Гамлет». Спэктакль тэатру «Фарсы».
17.35 Магія кіно.
18.15 «Рамантыка рамансу».
18.55 «Вяртаньне ў Брайдсхед». Тэлесэрыял. 9-я сэрыя.
19.50 «Сфэры».
20.30 «Вялікія раманы дваццатага стагодзьдзя».
21.00 Навіны культуры.
21.20 «Найвышэйшая праўда». Маст. фільм.
23.25 І.Дунаеўскі. Музыка кіно.

НТВ

9.00, 10.00, 11.00, 12.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00 Сёньня.
9.05 «Кулінарны паядынак»: «Сьнеданьне для сьмелых».
10.05 «Кватэрнае пытаньне».
11.05 «Абганяючы лявіну». «Прафэсія — рэпарцёр».
11.25 Служба выратаваньня.
12.05 Баявік «Кул-заваёўнік» (ЗША).
13.50 Смачныя гісторыі.
14.05 Свая гульня.
15.20 «Жаночы погляд».
16.05 «Шоў Алены Сьцепаненкі». Гумарыстычная праграма.
17.05 Сэрыял «Бунтоўная плянэта: вулканы».
18.30 Баявік «Спэцыяліст» (ЗША).
20.35 Баявік «Захоп у Паўночным моры».
22.30 Супэрбокс: Майк Тайсан супраць Бастара Дугласа.

Эўраспорт

9.30 Скачкі на лыжах з трампліну. Чэмпіянат сьвету. Кваліфікацыя. Паўтор.
10.30 Лыжныя гонкі. Чэмпіянат сьвету. Жывая трансьляцыя.
11.30 Горныя лыжы. Кубак сьвету. Хуткасны спуск. Жанчыны. Сьера-Нэвада. Жывая трансьляцыя.
13.00 Горныя лыжы. Кубак сьвету. Хуткасны спуск. Мужчыны. Гарміш. Жывая трансьляцыя.
14.30 Біятлён. Кубак сьвету. 20 км. Жанчыны. Остэрсунд. Жывая трансьляцыя.
16.15 Санны спорт. Чэмпіянат сьвету. Двойкі. Жанчыны. Сігулда. Жывая трансьляцыя.
18.00 Бабсьлей. Чэмпіянат сьвету. Чацьвёркі. Мужчыны. 2-я спроба. Лэйк Плэйсыд. Жывая трансьляцыя.
19.00 Скачкі на лыжах з трампліну. Чэмпіянат сьвету. К-120. Жывая трансьляцыя.
20.45, 22.30 Футзал. Чэмпіянат Эўропы. 1/2 фіналу. Італія. Жывая трансьляцыя.
22.00 Футзал. Італія.
0.15 Парусны спорт. Кубак Амэрыкі.
1.15 Тэніс. Турнір WTA ў Дубаі. Фінал.

23 лютага нядзеля

БТ

7.00, 12.00, 15.00 Навіны.
7.15 «Бэльфэгор». Мультсэрыял.
7.40 Пяць цудаў.
7.50 Мультыклюб.
8.30 Арсэнал.
9.05 «Сузор'е надзеі». Нацыянальны тэлевізійны конкурс юных талентаў.
9.35 Экран індыйскага кіно. «Няскрадзеная нявеста». 2-я сэрыя.
11.15 Сад мары.
11.45 Музэюм. «Гістарычны партрэт Вялікага Княства Літоўскага».
12.20 «Усё нармальна, мама!».
13.05 «Ваша лято».
13.45 «Ёсьць толькі міг...».
14.10 «Маршрут №...».
14.15 Вэстэрн «Вуліцы Ларэда». (ЗША). 1-я сэрыя.
15.20 Сэрыял «Барацьба за выжываньне».
16.15 Кліп-абойма.
16.55 Вайсковы дэтэктыў «Загад» («Беларусьфільм»).1-я і 2-я сэрыі.
19.20 Кінараман «Афіцэры».
21.00 Панарама: падзеі тыдня.
21.45 Тэлебаромэтар. Прагноз надвор'я.
22.05 Бокс. Баі наймайнейшых прафэсіяналаў сьвету. Майк Тайсан — Кліфард Эцьен. Трансьляцыя з ЗША.
23.00 Баявік «Буйны калібр» (Канада).

СТВ

5.30 Музычны канал.
6.30 «Дзікая плянэта»: «Усё пра сабак», «Выратавальнікі». Дак. фільмы.
7.30 «Дэніс-непаседа». Мультсэрыял.
8.00 «Флінт — дэтэктыў у часе». Мультсэрыял.
8.25 «Хіткліф». Мультсэрыял.
8.50 «Філярманічны тыдзень».
9.00 «СТВ-спорт».
9.10 «Партрэт у інтэр'еры».
9.25 «Аўтапанарама».
9.45 «Сямейнае кіно з калекцыі «Hallmark»: «Краіна фэй».
10.45, 20.10 Тэлесэрыял «Вялікі перапынак». 4 сэрыя. СССР, 1972.
12.00 «Сьнеданьне зь Інай Афанасьевай».
12.30 «Добры дзень, доктар!».
12.45 «Арт-экспрэс». Культурнае жыцьцё сталіцы.
13.00 Кіно: вайскова-прыгодніцкі фільм «Атрад спэцыяльнага прызначэньня». СССР, 1978.
14.20 «Табе, Беларусь, прысьвячаю...». Канцэрт Узорна-паказальнага аркестру Узброеных Сіл РБ.
15.05 «Відавочца».
15.35 «Вовачка-2». Камэдыйны сэрыял.
16.10 «Жыцьцё зь Люі». Мультсэрыял.
16.35 «Такая прафэсія».
17.00 «Залатая дзясятка беларускай опэры».
17.30 «Вар'яцкі сьвет». Дак. фільм.
18.20 «168 гадзін».
19.05 «Усё для цябе».
19.35 «Пакуль гарыць сьвечка».
21.15 Баявік «Плаваньне на самоце». СССР, 1985.
22.50 «Гульнявы рэфлекс».
23.00 «Навіны СНД».
23.15 «Апошні герой». Дак. фільм цыклу «Агульны дом».
23.30 Кіно: камэдыя «Добрага здароўя!». СССР, 1990.

8 канал

15.00 «У госьці да казкі».
16.30 «Эўропа сёньня».
17.00 Сэрыял «Горац».
17.45 Мультфільм «Рыкі-цікі-таві».
18.00 Маст. фільм «Пяць вечароў».
19.40 Шматсэрыйны фільм «Батальёны просяць агню».
20.45 «Вечарніца».
21.00 Тэлекрама.
21.10 Маст. фільм «Мумія».

Першы музычны канал

8.00, 12.45, 18.00 MegaMix.
12.00 «Пра Fashion».
17.00 Музыка.RU.

АНТ

8.00 Мультфільм.
8.30 Маст. фільм «Зорка».
10.00, 14.00 Навіны (з субтытрамі).
10.10 Армейскі магазын. Сьвяточны выпуск.
10.35 Прэм'ера. Прыгоды юных абаронцаў айчыны ў фільме «Валадар лужын».
12.10 «Новы дзень». Ударная сіла. «Зброя XXI стагодзьдзя».
12.35 «Радавы Еўдакімаў і яго сябры». Гумарыстычная праграма.
13.45 «Ігар Лучанок». Дак. фільм цыклу «Наш агульны дом».
14.10 Лірычная камэдыя «Сем нявест яфрэйтара Збруева».
15.50 Ток-шоў «Выбар».
16.30 Баявік «Чорная акула».
18.00 КВК.
20.30 «Контуры».
21.10 «Крывое люстра». Яўген Петрасян прадстаўляе.
23.30 Баявік «Праект «А»: Удар у адказ».

РТР

8.30 «Вікторыя». Фэстываль салдацкай песьні.
10.10 Маст. фільм «У зоне асаблівай увагі». 1977 г.
12.05 Прэм'ера. «Зброя Расеі. Паветраная кавалерыя». Дак. сэрыял.
13.00 Весткі.
13.20 Камэдыя «Максім Перапяліца». 1955 г.
15.15 Прэм'ера. «Аляксандар Марынеска. Атака стагодзьдзя». Дак. фільм.
16.10 Пакой сьмеху.
17.05 Маст. фільм «Белае сонца пустыні». 1969 г.
18.50 У «Гарадку».
19.00 Весткі тыдня.
20.10 Спэцыяльны карэспандэнт.
20.35 Прэм'ера. Канцэрт Алега Газманава «Панове афіцэры-2003».

Культура

11.10 Вуглы манежу.
11.40 Дзіцячы сэанс. Армэн Джыгарханян у маст. фільме «Новыя прыгоды няўлоўных».
13.00 «Акадэмія паліцэйскіх сабак». Дак. сэрыял.
13.30 Да Дня абаронцы Айчыны. «І гучней за трубы на поле гонару кліча да айчыны любоў!..». Кінаканцэрт.
13.55 «Калі мы вернемся дадому...» Дак. фільм.
14.50 Канцэрт Дзяржаўнага акадэмічнага ансамблю народнага танцу пад кіраўніцтвам Ігара Маісеева.
16.20 Кіно, якое было. «Рыгор Чухрай. Балада пра салдата».
17.00 «Балада пра салдата». Маст. фільм.
18.25 Сьмеханастальгія.
18.55 «Вяртаньне ў Брайдсхед». Тэлесэрыял. 10-я сэрыя.
19.50 Вечары ў тэатры «Школа сучаснай п'есы».
20.30 «Лёгкі жанр».
21.00 «Замкі жахаў». Дак. сэрыял.
21.25 «Культ кіно». «Макараў». Маст. фільм.
23.10 «Пад гітару».

НТВ

9.00, 10.00, 11.00, 12.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00 Сёньня.
9.05 Сэрыял «Бунтоўная плянэта».
10.05 «Расьліннае жыцьцё».
10.40 Вы будзеце сьмяяцца!
11.05 «Уплыў».
12.05 Прыгодніцкі фільм «Двайны абгон».
13.45 Смачныя гісторыі.
14.05 Свая гульня.
15.20 «Гісторыі паляўнічага на кракадзілаў».
15.45, 16.05 Ток-шоў «Прынцып даміно».
17.05 Баявік «Ход у адказ».
18.50 Баявік «Рашэньне аб ліквідацыі» (ЗША).
21.25 Вострасюжэтны фільм «Кантакт» (ЗША).

Эўраспорт

9.30, 12.30, 1.00 Скачкі на лыжах з трампліну. Чэмпіянат сьвету. К-120. Паўтор.
10.30 Лыжныя гонкі. Чэмпіянат сьвету. Жывая трансьляцыя.
11.30 Горныя лыжы. Кубак сьвету. Хуткасны спуск. Жанчыны. Сьера-Нэвада. Жывая трансьляцыя.
13.00 Горныя лыжы. Кубак сьвету. Супэргігант. Мужчыны. Гарміш. Жывая трансьляцыя.
14.00 Санны спорт. Чэмпіянат сьвету. Мужчыны. Сігулда. Жывая трансьляцыя.
15.00 Біятлён. Кубак сьвету. Гонка-перасьлед, мужчыны. Остэрсунд. Жывая трансьляцыя.
16.00 Біятлён. Кубак сьвету. Гонка-перасьлед, жанчыны. Остэрсунд. Жывая трансьляцыя.
17.00 Бабсьлей. Чэмпіянат сьвету. Чацьвёркі, мужчыны. 3-я спроба. Лэйк Плэйсыд.
18.00 Бабсьлей. Чэмпіянат сьвету. Чацьвёркі, мужчыны. 4-я спроба. Лэйк Плэйсыд. Жывая трансьляцыя.
19.00 Скачкі на лыжах з трампліну. Чэмпіянат сьвету. К-120. Жывая трансьляцыя.
20.45 Лёгкая атлетыка. Турнір у Лівіне.
22.15 Гоначная сэрыя Карт. Прэвію.
22.30 Гоначная сэрыя Карт. Чэмпіянат сьвету. Санкт-Пецярбург.
23.45 Гоначная сэрыя Наскар. Дэйтан.

«NRM» у Мазыры

22 лютага «NRM» пачынае прэзэнтаваць сваю новую праграму «Дом культуры» па гарадах Беларусі. Першы канцэрт — у Мазыры. Вольскага, Паўлава, Ляўкова, Дземідовіча, а мо нават і загадчыцу Ёцавіцкага ДК можна будзе пабачыць у мясцовым Палацы культуры а 19-й. Квіток каштуе 4000 руб.

ЗДЫМАК З САЙТУ ГУРТУ

праграма ТВ з 21 лютага да 2 сакавіка

24 лютага панядзелак

БТ

6.00, 7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 15.00, 18.00, 23.00 Навіны.
6.15, 7.15, 8.15 Добрай раніцы, Беларусь!
9.15, 17.00 «Па імені Барон». Сэрыял.
10.05 Плянэта АРТ.
10.30 Кліп-абойма.
11.10, 22.00 «Магія каханьня». Сэрыял.
12.20 Панарама: падзеі тыдня.
13.05 Тэлебаромэтар. Прагноз надвор'я.
13.20 Кінараман «Мой малодшы брат».
15.20 «Не зявай!».
15.45 «Сузор'е надзей». Нацыянальны тэлевізійны конкурс юных талентаў.
16.15 Мультыклюб.
18.20 «Беларусы Югры». Відэафільм АТН.
18.40 З дакладных крыніц.
18.50 Парлямэнцкі весьнік.
19.05 Прэм'ера. Дэтэктыў «Забі мяне пазьней». (ЗША—Канада).
20.40 Калыханка.
21.00 Панарама. Інфармацыйны канал.
21.45 Навіны рэгіёну.
22.45 Зона Ікс.
23.20 Начная размова.
0.20 Трылер «Чорны анёл-2» (Японія).

СТВ

5.00 Музычны канал.
5.30, 14.35 «ЗБЖ, ці...». Тэлесэрыял.
5.00, 15.50 «Паўэр рэйнджэрз, ці Магутныя рэйнджэры». Тэлесэрыял.
6.25, 15.25 «Джым Батан». Мультсэрыял.
6.50, 15.00 «Інспэктар Гаджэт». Мультсэрыял.
7.15 «168 гадзін».
8.00 «Менск і менчукі».
8.05, 22.50 «Тэхналёгія».
8.15 Кіно. Камэдыя «Прыгожая млынарка». Італія, 1955.
10.25, 23.00 «Гульнявы рэфлекс».
10.40 «Пад вуглом 23 з паловай». Дак. фільм.
11.15 «Рэактыўны бокс».
11.25 «Усё для сябе».
12.05 Кіно: камэдыя «Добрага здароўя!». СССР, 1990.
13.30, 16.30, 19.30, 22.30 «24 гадзіны».
13.45 «Сэрэдназ. Клінок». Тэлесэрыял.
16.15 Мультфільм.
16.45 «Вовачка-1». Сэрыял.
17.20 «У нас усе дома». Сэрыял.
17.55 «Меншчына. Людзі, падзеі, факты».
18.05 «Партрэт у інтэр'еры».
18.20 «Арт-экспрэс». Культурнае жыццё сталіцы.
18.35 «Кобра. Чорная кроў». Тэлесэрыял.
19.50 «Навіны СНД».
20.05 «СТВ-спорт».
20.25 «Добры вечар, маленькі...».
20.40 «Адпачывай».
20.50 Кіно: псыхалягічная драма «Афіцыянт!». Францыя, 1983.
23.10 «Накаўт». Навіны боксу.
23.35 Кіно: трылер «Шаша 666». ЗША, 2001.

8 канал

17.30 Мультпарад.
17.45 Маст. фільм «І цэлага сьвету мала».
19.30 Тэлекрама.
19.45 Нашы сучасьнікі. Уладзімер Брынцалаў.
20.40 Міжнародныя навіны з «Дойчэ Вэле».
20.45 «Вечарніца».
21.00 К-відэа «Топ-8».
21.10 Драма «Лізавета».

Першы музычны канал

7.00 «Пад'ёмнік».
8.30, 16.45. 22.10 MegaMix.
14.00 «ІнтэрАктыў».
16.00 «Пра Fashion».
22.00 «120/80».

АНТ

8.00, 9.00, 18.00, 20.30, 22.50 «Нашы навіны».
8.05 «Песьні Перамогі». Канцэрт.
9.05 «Контуры».
9.45 «Дачная паездка сяржанта Цыбулі». Ваенная камэдыя. СССР, 1979 г.
11.00 Дысней-клюб: «Цімон і Пумба».
15.25 «300 спартанцаў». Гістарычны баявік. ЗША,1962 г.
17.10 Чалавек і закон.
18.10 Жывая прырода. «Браты па крыві».
19.05 «Жарт за жартам».
19.35 «Давай за...» Канцэрт групы «Любэ».
21.00 Ток-шоў «Выбар».
21.45 «Апошні герой-3».
23.05 Цырымонія «Грэмі-2003».

РТР

8.35 Мясцовы час. Весткі — Масква. Тыдзень у горадзе.
9.15 Ранішняя размова зь Дзьмітрыем Кісялёвым.
9.45 «Гарадок».
17.00 Камэдыя «Ас» (Італія). 1981 г.
19.00 Весткі.
19.25 Сусьветнае кіно. Вострасюжэтны фільм «Няма куды бегчы» (ЗША). 1993 г.
21.20 Маст. фільм «Райскі яблычак». 1998 г.

Культура

17.35 «Выхад на біс». 40 гадоў творчай дзейнасьці Рамана Карцава.
18.30 «Вяртаньне ў Брайдсхед». Тэлесэрыял.
20.05 Ток-шоў «Школа зласлоўя».
21.00 «Тым часам».
21.40 «Простая гісторыя». Маст. фільм.
23.25 «Джазафрэнія».

НТВ

9.00, 10.00, 11.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00 Сёньня.
9.05 «Кулінарны паядынак»: «Францыя — Італія».
10.05 «Кватэрнае пытаньне».
14.35 «Гісторыя палаўнічага на краканзілаў».
15.20 «Жаночы погляд».
15.50 Ток-шоў «Прынцып даміно».
17.05 «Нацыянальная бясьпека: Аргунскі кацёл». Расьсьледаваньне НТВ.
18.30 Трылер «Сквіцы-3» (ЗША).
20.40 Фільм-катастрофа «Турбулентнасьць: цяжкі мэтал» (ЗША).
22.45 Сэрыял «Клан Сапрана». 17-я сэрыя (ЗША).

Эўраспорт

10.00, 17.00 Дваябор'е. Чэмпіянат сьвету. К-95, камандныя спаборніцтвы. Жывая трансьляцыя.
11.15, 14.30 Скачкі на лыжах з трамплыну. Чэмпіянат сьвету. К-120. Паўтор.
12.45 Лыжныя гонкі. Чэмпіянат сьвету. Эстафэта, жанчыны. Жывая трансьляцыя.
14.00 Валейбол.
16.00 Дваябор'е. Чэмпіянат сьвету. К-95, камандныя спаборніцтвы. Паўтор.
18.00 Лыжныя гонкі. Чэмпіянат сьвету. Эстафэта, жанчыны. Паўтор.
18.30, 23.00 Эўрагалы. Футбольны часопіс.
20.30 Футбол. Кубан Лібэртадэрас. Агляд матчаў.
21.30 Футзал. Чэмпіянат Эўропы. Фінал. Жывая трансьляцыя.
1.00 Дваябор'е. Чэмпіянат сьвету. Камандныя спаборніцтвы. Паўтор.

25 лютага аўторак

БТ

6.00, 7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 15.00, 18.00, 23.00 Навіны.
6.15, 7.15, 8.15 Добрай раніцы, Беларусь!
8.15 «Вялікі Мэрлін». Сэрыял. Заключная сэрыял.
9.15, 17.10 «Па імені Барон». Сэрыял.
10.05 Існасьць. Духоўная праграма.
10.30 Дак. сэрыял «Пары і дуэты-2».
10.55 Падарожжа дылетанта. «Ігнацічы. Уладзімер і Вільгельм Ельскія».
11.10, 22.00 «Магія каханьня». Сэрыял.
12.20, 14.40 Добры дзень, Беларусь!
13.05 Мэлядрама «Чалавек з бульвару Капуцынаў».
15.20 «Самая кепская ведзьма». Сэрыял для дзяцей (Вялікабрытанія).
15.45 Пяць цудаў.
15.55 «Гэта клясна!» Сэрыял.
16.25 5 х 5.
17.05 Кліп-абойма.
18.20 «Усё для мафіі». Сэрыял. 1-я сэрыя.
19.05 Трагікамэдыя «СВ. Спальны вагон».
20.40 Калыханка.
21.00 Панарама. Інфармацыйны канал.
21.45 Навіны рэгіёну.
22.45 Зона Ікс.
23.20 Начны этэр.
0.20 Баявік «Трапны стралок».

СТВ

5.00 Музычны канал.
5.30, 14.35 «ЗБЖ, ці...». Тэлесэрыял.
6.00, 15.50 «Паўэр рэйнджэрз, ці Магутныя рэйнджэры». Тэлесэрыял.
6.25, 15.25 «Джым Батан». Мультсэрыял.
6.50, 15.00 «Інспэктар Гаджэт». Мультсэрыял.
7.15, 17.55 «Меншчына. Людзі, падзеі, факты».
7.25, 13.30, 16.30, 19.30, 22.25 «24 гадзіны».
7.45, 20.05 «СТВ-спорт».
8.05, 22.45 «Тэхналёгія».
8.15 Кіно: драма «Афіцыянт!».
9.50 «Я тут жыву». Дак. фільм.
10.15 «Гульнявы рэфлекс».
10.25 «Пад вуглом 23 з паловай». Дак. фільм.
10.55 «Пакуль гарыць сьвечка».
11.25 «Прэм'ера на канале». Тэленавэла «Віно каханьня».
12.30 «Сямейныя страсьці». Ток-шоў.
13.45, 18.35 «Кобра. Чорная кроў». Тэлесэрыял.
16.15 Мультфільм.
16.45 «Чыста па жыцьці». Сэрыял.
17.20 «У нас усе дома». Сэрыял.
18.05 «Добры дзень, доктар!».
18.20 «Менск і менчукі».
18.25 «Тэма дня».
19.50 «Навіны СНД».
20.15 «Добры вечар, маленькі...».
20.30 «Закон і крымінал».
20.50 Кіно: трылер «Хэлп мі».
22.55 «Хто вы, Маціяс Руст?». Дак. фільм.
23.30 Кіно. Баявік «Замкнёнае кола». ЗША, 2001.

8 канал

17.30 Мультпарад.
17.45 Камэдыя «Дзікі, дзікі Вэст».
19.45 Сэрыял «Тагерт», «Пернікавы дамок».
20.30, 21.00 Тэлекрама.
20.40 Міжнародныя навіны з «Дойчэ Вэле».
20.45 «Вечарніца».
21.10 Драма «Тры сэзоны».

Першы музычны канал

7.00 «Пад'ёмнік».
8.30, 9.10, 17.00, 22.15 MegaMix.
9.00 «120/80».
14.00 «ІнтэрАктыў».
16.00 «20-ка Першых».
22.00 «Заваёўнікі кантынэнтаў».

АНТ

8.00, 9.00, 18.00, 20.30, 23.50 «Нашы навіны».
8.05 Тэлеканал «Добрай раніцы».
9.05 Камэдыйны баявік «Таемны агент Ройз».
10.45 «Саці».
11.10 Дысней-клюб: «Перапынак».
15.10 Маст. фільм «Легенда пра Тарзана, валадара малпаў».
17.15 Крэмль-9. «Снайпэры на вежах».
18.10 «Вялікае мыцьцё».
19.05 Чакай мяне.
20.00 Час.
21.00 «Хто хоча стаць мільянэрам?».
22.00 Баявік «Зона высадкі». ЗША, 1994 г.
0.05 «На футболе».
0.35 Баявік «Нястрымны».

РТР

9.35, 18.50 Весткі. Дзяжурная часьць.
10.00, 19.00 Весткі.
10.20 Сэрыял «Пуаро Агаты Крысьці. Абрабаваньне на мільён даляраў».
17.50 «Камісар Рэкс». Тэлесэрыял.
19.30 Мясцовы час. Весткі — Масква.
19.50 Дабранач, дзеці!
19.55 Сэрыял «Лэдзі Мэр».
20.55 Сэрыял «Кобра. Чорная кроў».
21.50 Ток-шоў «Весткі +».
22.20 Весткі — спорт.
22.30 Апошні сэанс. Вострасюжэтны фільм «Крутая васьмёрка» (ЗША). 1996 г.

Культура

15.10 «Куміры».
15.40 «До мажор».
16.05 «Трацьцякоўка — дар бясцэнны!» «Цікае жыцьцё».
16.35 «Гісторыя Зямлі». Дак. сэрыял. 1-я сэрыя.
17.30 Весткі.
17.40, 23.00 Навіны культуры.
17.55 «Палацавыя таямніцы». «Араніенбаўм Пятра III».
18.25 «Тэрор у асобна ўзятым горадзе». «Чырвоны тэрор, ці Вока Лібкнэхта, зуб за Люксэмбург».
18.55 «Партытуры не гараць».
19.20 «Знакамітыя арыі». Сцэна з опэры Р.Штраўса «Капрычыё».
19.30 «Дапамажыце Тэлеку».
19.50 «Танцы ў час Луназы». Маст. фільм.
21.25 «Што рабіць?».
22.20 «XX стагодзьдзе. Выбаранае». «Рыцар апэрэты».
23.25 «Начны палёт».

НТВ

9.00 Сёньня раніцай.
9.20 Надвор'е на заўтра.
9.25 Крымінал.
10.00, 11.00, 15.00, 16.00, 17.00 Сёньня.
10.05 «Расьліннае жыцьцё».
10.40 Вы будзеце сьмяяцца!
14.35 Ток-шоў «Прынцып даміно».
16.05 Сэрыял «Гангстэрскія войны: фальшываманэтчыкі».
17.20 Дак. драма «Злачынства і пакараньне».
18.00 «Сёньня» з Тацянай Мітковай.
18.40 Футбол. Ліга чэмпіёнаў. «Лякаматыў» — «Мілян» (Італія). Жывая трансьляцыя.
21.00 «Краіна і сьвет». Галоўныя падзеі дня.
21.40 Сэрыял «Сэкс у вялікім горадзе» (ЗША).
22.20 «Таямніцы сьледзтва». Дэтэктыў.

Эўраспорт

10.00 Валейбол. Паўтор.
10.30 Лыжныя гонкі. Чэмпіянат сьвету. Эстафэта, жанчыны. Паўтор.
11.00 Лыжныя гонкі. Чэмпіянат сьвету. Эстафэта, мужчыны. Жывая трансьляцыя.
12.45, 17.15 Эўрагалы. Футбольны часопіс. Паўтор.
14.15 Лёгкая атлетыка. Турнір Эўрапейскай сэрыі. Паўтор.
15.45 Лыжныя гонкі. Чэмпіянат сьвету. Эстафэта, мужчыны. Паўтор.
19.00 Трыял. Чэмпіянат сьвету. Вена.
20.00 Супэркрос. Чэмпіянат сьвету. Мінэапаліс.
21.00 Бокс.
22.00 Бокс. Баі цяжкавагавікоў.
0.15 Бокс. Паўтор.
1.15 Супэркрос. Чэмпіянат сьвету. Мінэапаліс. Паўтор.

26 лютага серада

БТ

6.00, 7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 15.00, 18.00, 23.00 Навіны.
6.15, 7.15 Добрай раніцы, Беларусь!
8.15, 18.20 «Усё для мафіі». Сэрыял.
9.15, 17.05 «Па імені Барон». Сэрыял.
10.05 «Сьлявай, душа!» Фальклёрныя калектывы Менскай вобласьці.
10.30 Здароўе. Тэлечасопіс.
10.55 Сола для дэбютанта. Актор Сяргей Чакерас.
11.10, 22.00 «Магія каханьня». Сэрыял.
12.20 Добры дзень, Беларусь!
13.05 Камэдыя «Сьцеражыся аўтамабіля».
14.40 «Масква — Менск».
15.20 «Самая кепская ведзьма». Сэрыял для дзяцей.
15.45 Пяць цудаў.
15.55 «Гэта клясна!». Сэрыял.
16.25 5 х 5.
17.00 Кліп-абойма.
19.05 Маст. фільм «Дзіця ў кустах».
20.40 Калыханка.
21.00 Панарама. Інфармацыйны канал.
21.45 Навіны рэгіёну.
22.45 Зона Ікс.
23.20 Начны этэр.
0.20 Драма «Абмен» (ЗША).

СТВ

5.00 Музычны канал.
5.30, 14.35 «ЗБЖ, ці...». Тэлесэрыял.
6.00, 15.50 «Паўэр рэйнджэрз, ці Магутныя рэйнджэры». Тэлесэрыял.
6.25, 15.25 «Джым Батан». Мультсэрыял.
6.50, 15.00 «Інспэктар Гаджэт». Мультсэрыял.
7.15, 17.55 «Меншчына. Людзі, падзеі, факты».
7.25 , 13.30, 16.30, 19.30, 22.30 «24 гадзіны».
7.45, 19.50 «СТВ-спорт».
7.55 «Сьнеданьне зь Інай Афанасьевай».
8.00 «Менск і менчукі».
8.05, 22.50 «Тэхналёгія».
8.15 Кіно: баявік «Зьніклыя грошы». ЗША, 2001.
10.25 «Пад вуглом 23 з паловай». Дак. фільм.
10.55, 20.30 «Аўтапанарама».
11.10 «Закон і крымінал».
11.25 «Віно каханьня».
12.30 «Сямейныя страсьці». Ток-шоў.
13.45, 18.35 «Кобра. Чорная кроў». Тэлесэрыял.
16.15 Мультфільм.
16.45 «Вовачка-2». Сэрыял.
17.20 «У нас усе дома». Сэрыял.
18.05 «Плянэта людзей».
18.20 «Апошні герой». Дак. фільм цыклу «Агульны дом».
19.50 «Навіны СНД».
20.15 «Добры вечар, маленькі...».
20.50 Кіно: баявік «Заступнік».
23.00 «Гульнявы рэфлекс».
23.10 «Не спыняйся». Дак. сэрыял.
0.00 «Ілюзіён». Мюзыкл «У горадзе». ЗША, 1949.

8 канал

17.30 Мультпарад.
17.45 Прыгодніцкі фільм «Мумія».
19.40 К-відэа «Топ-8».
19.45 Сэрыял «Тагерт», «Пернікавы дамок».
20.30 Тэлекрама.
20.40 Міжнародныя навіны з «Дойчэ Вэле».
20.45 «Вечарніца».
21.00 Эўропа сёньня.
21.30 Дэтэктыў «Шукальнікі прыгод».

Першы музычны канал

7.00 «Пад'ёмнік».
8.30, 16.00, 23.15 MegaMix.
14.00 «ІнтэрАктыў».
22.00 «120/80».
22.30 «Пра Fashion».

АНТ

8.00, 9.00, 18.00, 20.30, 23.05 «Нашы навіны».
8.05 Тэлеканал «Добрай раніцы».
9.05, 19.05 «Зямля каханьня, зямля надзеі». Сэрыял.
9.45 Камэдыя «Бірулька з сакрэтам».
11.00 Дысней-клюб: «Лойд у космасе».
16.00 «Новы дзень». «Геніі і ліхадзеі».
16.30 Камэдыя «Жаніх з таго сьвету».
17.30 «Куміры».
18.10 «Вялікае мыцьцё».
20.00 Час.
21.00 «Расейская рулетка».
22.00 Шматсэрыйны фільм «Наступны» («Next-2»).
23.20 «Таямніцы стагодзьдзя». «Апошні вязень Шпандаў».
0.00 Баявік «Нястрымны».

РТР

8.40, 20.55 Сэрыял «Кобра. Чорная кроў».
9.40, 18.50 Весткі. Дзяжурная часьць.
10.00, 19.00 Весткі.
10.20 Сэрыял «Пуаро Агаты Крысьці. Сон».
17.50 «Камісар Рэкс». Тэлесэрыял.
19.30 Мясцовы час. Весткі — Масква.
19.50 Дабранач, дзеці!
19.55 Сэрыял «Лэдзі Мэр».
21.50 Ток-шоў «Весткі +».
22.20 Весткі — спорт.
22.30 Апошні сэанс. Дэтэктыў «Алмазы шаха». 1992 г.

Культура

15.10 Магія кіно.
15.50 Сьпявае Дзьмітры Хварастоўскі.
16.05 «Арт-панарама».
16.35 «Гісторыя Зямлі». Дак. сэрыял. 2-я сэрыя.
17.30 Весткі.
17.40, 23.00 Навіны культуры.
17.55 «Айчына і лёсы».
18.25 «Тэрор у асобна ўзятым горадзе». «Бязьмежжа».
18.55 «Збор выканаўняў». Ф.Шапэн. 12 эцюдаў.
19.30 «Дапамажыце Тэлеку».
19.40 Упершыню на экране. «Нас зьнясе вецер». Маст. фільм.
21.40 «Апокрыф».
22.20 «Астравы».
23.25 «Начны палёт».

НТВ

9.00 Сёньня раніцай.
9.20 Надвор'е на заўтра.
9.25 «Вочная стаўка».
10.00, 11.00, 15.00, 16.00, 17.00 Сёньня.
10.05 «Кулінарны паядынак».
14.35 Ток-шоў «Прынцып даміно».
16.05 Сэрыял «Гангстэрскія войны: паляваньне на сланую».
17.20 Шчырае прызнаньне.
18.00 «Сёньня» з Тацянай Мітковай.
18.35 Сэрыял «Таямніцы сьледзтва». 13-я сэрыя.
19.45 Сэрыял «Бандыцкі Пецярбург. Адвакат». 1-я сэрыя.
21.00 «Краіна і сьвет». Галоўныя падзеі дня.
21.35 Футбол. Ліга чэмпіёнаў. «Інтэр» (Італія) — «Барсэлёна» (Гішпанія). Жывая трансьляцыя.

Эўраспорт

10.00 Эўрагалы. Футбольны часопіс. Паўтор.
11.30 Алімпійскі часопіс. Паўтор.
12.00 Снаўборд. Кубак сьвету. Марыбор.
12.30 Фрыстайл. Кубак сьвету.
13.00 Футбол. Кубак Лібэртадэрас. Агляд матчаў.
14.00 Футбол. Легенды чэмпіянатаў Эўропы. Італія. Паўтор.
15.00 Вэлятрэк. Кубак сьвету. Масква.
16.00 Лыжныя гонкі. Чэмпіянат сьвету. Спрынт. Жывая трансьляцыя.
20.00 Лёгкая атлетыка. Найлепшыя моманты турніраў Эўрапейскай сэрыі.
21.45 Гольф. Нісан Оўпэн.
22.45 Конны спорт. Канкур.
0.00 Прыгоды. Сэрыял рэйдаў. Кірквуд.
0.30 Лыжныя гонкі. Чэмпіянат сьвету. Спрынт. Паўтор.

27 лютага чацьвер

БТ

6.00, 7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 15.00, 18.00, 23.00 Навіны.
6.15, 7.15 Добрай раніцы, Беларусь!
8.15, 18.20 «Усё для мафіі». Сэрыял (Германія). 2-я сэрыя.
9.15, 17.05 «Па імені Барон». Сэрыял.
10.05 «Ёсьць толькі міг...».
10.30 Дак. сэрыял «Рынкі сьвету».
10.55 Музэюм. «Гістарычны партрэт Вялікага Княства Літоўскага».
11.10, 22.00 «Магія каханьня». Сэрыял.
12.20, 14.45 Добры дзень, Беларусь!
13.05 Прыгодніцкі фільм «Казка падарожжаў».
15.20 «Самая кепская ведзьма». Сэрыял для дзяцей.
15.45 Пяць цудаў.
15.55 «Гэта клясна!» Сэрыял.
16.25 5 х 5.
17.00 Кліп-абойма.
19.05 Баявік «Рэйнджэр з атамнай зоны» («Беларусьфільм»).
20.40 Калыханка.
21.00 Панарама. Інфармацыйны канал.
21.45 Навіны рэгіёну.
22.45 Зона Ікс.
23.20 Начны этэр.
0.20 Трылер «А трэцяй гадзіне ночы» (ЗША).

СТВ

5.00 Музычны канал.
5.30, 14.35 «ЗБЖ, ці...». Тэлесэрыял.
6.00, 15.55 «Паўэр рэйнджэрз, ці Магутныя рэйнджэры». Тэлесэрыял.
6.25, 15.25 «Джым Батан». Мультсэрыял.
6.50, 15.00 «Інспэктар Гаджэт». Мультсэрыял.
7.15, 17.55 «Меншчына. Людзі, падзеі, факты».
7.25, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30 «24 гадзіны».
7.45, 20.05 «СТВ-спорт».
7.55 «Тэма дня».
8.05, 22.50 «Тэхналёгія».
8.15 Кіно: баявік «Заступнік».
9.55 «Мастак Шчамялёў». Відэафільм.
10.20, 23.00 «Гульнявы рэфлекс».
10.30 «Пад вуглом 23 з паловай». Дак. фільм.
11.00 «Партрэт у інтэр'еры».
11.15 «Фільм, фільм, фільм».
11.30 «Віно каханьня».
12.30 «Сямейныя страсьці». Ток-шоў.
13.45, 18.35 «Кобра. Чорная кроў». Тэлесэрыял.
16.20 Мультфільм.
16.50 «Дружная сямейка». Сэрыял.
18.05 «Тэатральныя гісторыі».
18.20 «Рамонт».
19.50 «Навіны СНД».
20.15 «Добры вечар, маленькі...».
20.30 «Фільм, фільм, фільм».
20.50 Кіно: баявік «Банда хакераў». ЗША, 1999.
23.10 «Залатая дзясятка беларускай опэры». «Царская нявеста».
23.40 Кіно: баявік «Крайняя перасьцярога». ЗША, 1987.

8 канал

17.30 Мультпарад.
17.45 Драма «Адчайны».
19.40 Тэлекрама.
19.45 Сэрыял «Тагерт», «Пернікавы дамок».
20.40 Міжнародныя навіны з «Дойчэ Вэле».
20.45 «Вечарніца».
21.00 К-відэа «Топ-8».
21.10 Маст. фільм «Ледзяны шторм».

Першы музычны канал

7.00 «Пад'ёмнік».
8.30, 9.10, 16.00, 22.30 MegaMix.
9.00 «120/80».
14.00 «ІнтэрАктыў».
22.00 «Поцемкі».

АНТ

8.00, 9.00, 18.00, 20.30, 23.05 «Нашы навіны».
8.05 Тэлеканал «Добрай раніцы».
9.05, 19.05 «Зямля каханьня, зямля надзеі». Сэрыял.
10.50, 22.00 Шматсэрыйны фільм «Наступны» («Next-2»).
10.45 «Новы дзень». «Расейскі экстрым».
11.10 Дысней-клюб: «Чорны плашч».
16.00 «Новы дзень». «Тэорыя неймавернасьці».
16.30 Драма «Гаспадар імпэрыі».
17.30 Сьмехапанарама.
18.10 «Вялікае мыцьцё».
20.00 Час.
21.00 «Слабае зьвяно».
23.20 «Па найме». Трылер. Канада.

РТР

8.40, 20.55 Сэрыял «Кобра. Чорная кроў».
9.40, 18.50 Весткі. Дзяжурная часьць.
10.00, 19.00 Весткі.
10.20 Сэрыял «Пуаро Агаты Крысьці. Здарэньне ў моры».
17.50 «Камісар Рэкс». Тэлесэрыял.
19.30 Мясцовы час. Весткі — Масква.
19.50 Дабранач, дзеці!
19.55 Сэрыял «Лэдзі Мэр».
21.50 Ток-шоў «Весткі +».
22.20 Весткі — спорт.
22.30 Кінакадэмія. Прэм'ера. «Шум мора». Гішпанія, 2001 г.

Культура

15.10 «Графаман».
15.40 Культура за межамі.
16.05 «Пецярбург. Час і месца».
16.35 «Справа Артура Макарава». Дак. фільм.
17.30 Весткі.
17.40, 23.00 Навіны культуры.
17.55 «Хто мы?» «Расея на Каўказе».
18.25 «Тэрор у асобна ўзятым горадзе». «Лета Юдава».
18.55 Білет у Вялікі.
19.30 «Дапамажыце Тэлеку».
19.50 «Па галоўнай вуліцы з аркестрам». Маст. фільм.
21.25 «Культурная рэвалюцыя».
22.20 «Эпізоды».
23.25 «Начны палёт».

НТВ

9.00 Сёньня раніцай.
9.20 Надвор'е на заўтра.
9.25 Шчырае прызнаньне.
10.00, 11.00, 15.00, 16.00, 17.00 Сёньня.
10.05 «Кватэрнае пытаньне».
14.35 Ток-шоў «Прынцып даміно».
16.05, 19.45 «Бандыцкі Пецярбург». Сэрыял.
17.20 «Вочная стаўка».
18.00 «Сёньня» з Тацянай Мітковай.
18.35, 22.20 Сэрыял «Таямніцы сьледзтва».
21.00 «Краіна і сьвет». Галоўныя падзеі дня.
21.40 Сэрыял «Сэкс у вялікім горадзе» (ЗША).

Эўраспорт

10.00 Гольф. Нісан Оўпэн. Паўтор.
11.00 Фрыстайл. Кубак сьвету. Паўтор.
11.30 Снаўборд. Кубак сьвету. Марыбор. Паўтор.
12.00 Вэлятрэк. Кубак сьвету. Масква. Паўтор.
13.00 Лыжныя гонкі. Чэмпіянат сьвету. Спрынт. Паўтор.
15.00 Тэніс. Турнір АТР. Дубаі. 4-ы дзень. Жывая трансьляцыя.
18.30 Футзал. Італія. Агляд.
19.00 Скачкі на лыжах з трамплыну. Чэмпіянат сьвету. Кваліфікацыя. Жывая трансьляцыя.
21.00 Футбол. Кубак Лібэртадарэс. Агляд матчаў. Паўтор.
22.00 Футбол. Кубак Лібэртадарэс. Дзень 4-ы.
0.15 Футбол. Кубак УЭФА. Агляд матчаў.
1.45 Ралі. Турцыя.

Па просьбах чытачоў з правінцыі мы будзем друкаваць праграму не “зь пятніцы да чацьвярга”, а “з пятніцы да нядзелі”.

28 лютага пятніца

● БТ

6.00, 7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 15.00, 18.00, 23.00 Навіны.
6.15, 7.15 Добрай раніцы, Беларусь!
8.15, 18.20 «Усё для мафіі». Сэрыял. Заключная сэрыя.
9.15 «Па імені Барон». Сэрыял. Заключная сэрыя.
10.00 Сад мары.
10.30 «Беларускі рэмэйк». Канцэрт найлепшых гуртоў.
11.15, 22.00 «Магія каханьня». Сэрыял.
12.20, 14.45 Добры дзень, Беларусь!
13.05 Маст. фільм «Мой сябар Іван Лапшын».
15.20 «Самая кепская ведзьма». Сэрыял для дзяцей.
15.45 Пяць цудаў.
15.55 «Гэта клясна!» Сэрыял.
16.25 5 х 5.
17.05 Прыгодніцкі фільм «Загадка містэра Джозэфа» (Італія).
19.00 Прэмія «Оскар». Камэдыя Л.Бунюэля «Сьціплае абаяньне буржуазіі» (Францыя).
20.40 Калыханка.
21.00 Панарама. Інфармацыйны канал.
21.45 Навіны рэгіёну.
22.45 Зона Ікс.
23.20 Прэмія «Оскар». Гістарычная драма «Танцы з ваўкамі». (ЗША).

● СТВ

5.00 Музычны канал.
5.30, 14.35 «ЗБЖ, ці...». Тэлесэрыял.
6.00, 15.55 «Паўэр рэйнджэрз, ці Магутныя рэйнджэры». Тэлесэрыял.
6.25, 15.25 «Джым Батан». Мультсэрыял.
6.50, 15.00 «Інспэктар Гаджэт». Мультсэрыял.
7.15, 17.55 «Меншчына. Людзі, падзеі, факты».
7.25, 13.30, 16.30, 19.30, 22.55 «24 гадзіны».
7.45, 20.05 «СТВ-спорт».
7.55 «Сьнеданьне зь Інай Афанасьевай».
8.00 «Менск і менчукі».
8.05, 23.15 «Тэхналёгія».
8.15 Кіно: камэдыя «Прышэльцы-2. Калідоры часу». Францыя, 1998.
10.10 «Гульнявы рэфлекс».
10.20 «Запрашаем паскардзіцца».
10.30 «Пад вуглом 23 з паловай». Дак. фільм.
11.00, 20.30 «Ааўтапанарама».
11.15 «Тэатральныя гісторыі».
11.30 «Віно каханьня».
12.30 «Сямейныя страсьці». Ток-шоў.
13.45 «Кобра. Чорная кроў». Тэлесэрыял.
16.45 Мультфільм.
16.55 «Мэдыкі». Сэрыял.
18.05 «Пакуль гарыць сьвечка».
18.35 «Я верш свой песьні прысьвяціў...». Творчы вечар Мікалая Траццякова.
19.50 «Навіны СНД».
20.15 «Добры вечар, маленькі...».
20.50 Кіно: камэдыя «Сэкс-місія». Польшча, 1983.
23.25 «Рэактыўны бокс».
23.40 Кіно. Баявік «Забойца, які плача». ЗША, 1995.

● 8 канал

17.30 Мультпарад.
17.45 Трылер «Небясьпечныя сувязі».
19.40, 20.30 Тэлекрама.
19.45 «Банка коміксаў», «Палацавая рапсодыя».
20.40 Міжнародныя навіны з «Дойчэ Вэле».
20.45 «Вечарніца».
21.00 К-відэа «Топ-8».
21.10 Трылер «Воўк».

● Першы музычны канал

7.00 «Пад'ёмнік».
8.30, 16.00, 22.10, 0.15 MegaMix.
14.00 «V.I.P.онія».
22.00 «120/80».
0.00 «Заваёўнікі кантынэнтаў».

● АНТ

8.00, 9.00, 18.00, 20.30, 23.50 «Нашы навіны».
8.05 Тэлеканал «Добрай раніцы».
9.05, 19.05 «Зямля каханьня, зямля надзеі». Сэрыял.
9.50 Шматсэрыйны фільм «Наступны» («Next-2»).
10.45 Чалавек і закон (з сурдаперакладам).
11.25 Сэрыял «Твінісы».
16.00 «Новы дзень». «Крылы».
16.30 Крымінальная драма «Гаспадар імпэрыі».
17.30 «Самі з вусамі».
18.10 «Вялікае мыцьцё».
20.00 Час.
21.00 «Поле цудаў».
22.05 Юбілейны канцэрт А.Укупніка «Няўжо пяцьдзясят?!».
0.05 Трылер «Апошні танец».

● РТР

8.40 Сэрыял «Кобра. Чорная кроў».
9.40, 18.50 Весткі. Дзяжурная часьць.
10.00, 19.00 Весткі.
10.20 У пошуках прыгод.
17.50 Аншляг.
19.30 Мясцовы час. Весткі — Масква.
19.50 Дабранач, дзеці!
19.55 Леў Лешчанка. «Найлепшыя песьні».
22.30 Апошні сэанс. Вострасюжэтны фільм «Віртуознасьць» (ЗША). 1995 г.

● Культура

15.10 «Лёгкі жанр».
15.40 «Галасы народных інструмэнтаў». Балалайка.
16.05 «Са столі».
16.35 Дак. экран. «Чалавек у кадры».
17.15 «Гербы Расеі». Герб Разані.
17.30 Весткі.
17.40, 23.00 Навіны культуры.
17.55 Паўдзённыя сны.
18.25 «Дом вокнамі ў поле». Тэлеспэктакль.
18.55 Ток-шоў «Аркестравая яма».
19.35 «Дапамажыце Тэлеку».
19.45 «Чалавек, які плакаў». Маст. фільм.
21.25 «Лінія жыцьця».
22.20 Блеф-клюб.
23.25 «Хто там...».

● НТВ

9.00 Сёньня раніцай.
9.20 Надвор'е на заўтра.
9.25 Дак. драма «Злачынства і пакараньне».
10.00, 11.00, 15.00, 16.00, 17.00 Сёньня.
10.05 «Нацыянальная бясьпека: Аргунскі кацёл».
14.35 Ток-шоў «Прынцып даміно».
16.05 «Бандыцкі Пецярбург». Сэрыял.
17.20 Крымінал.
18.00 «Сёньня» з Тацянай Мітковай.
18.35 «Свабода слова».
19.55 Баявік «Брыльянты застаюцца назаўсёды».
22.30 «Усё адразу!».

● Эўраспорт

9.30 Ралі. Турцыя. Паўтор.
10.00 Лыжное дваябор'е. Чэмпіянат сьвету. К-120. Жывая трансьляцыя.
11.15, 18.30 Скачкі на лыжах з трампліну. Чэмпіянат сьвету. Кваліфікацыя. Паўтор.
11.45 Лыжныя гонкі. Чэмпіянат сьвету. 30 км, жанчыны. Жывая трансьляцыя.
14.45 Лыжное дваябор'е. Чэмпіянат сьвету. Спрынт. Жывая трансьляцыя.
15.30 Футбол. Кубак УЭФА. Агляд матчаў. Паўтор.
17.00 Тэніс. Турнір АТР. Дубаі. 1/4 фіналу. Жывая трансьляцыя.
19.00 Скачкі на лыжах з трампліну. Чэмпіянат сьвету. К-90. Жывая трансьляцыя.
20.45 Футбол. Кубак УЭФА. 4-е кола, матч у адказ.
21.45 Супэркрос. Чэмпіянат сьвету. Атланта.
22.45 Скачкі на лыжах з трампліну. Чэмпіянат сьвету. К-90. Паўтор.
0.15 Сумо. Басё. Паўтор.
1.15 Ралі. Турцыя.
1.45 Футзал. Італія. Агляд. Паўтор.

1 сакавіка субота

● БТ

7.00, 12.00, 15.00, 18.00 Навіны.
7.15 «Бэльфэгор». Мультсэрыял.
7.40 Пяць цудаў.
7.50 «Не зявай!».
8.20 Існасьць.
8.50 «Усё нармальна, мама!».
9.35 Экран індыйскага кіно. «Тры браты». 1-я сэрыя.
11.00 Здароўе.
11.30 «Сьпявай, душа!».
12.20 Вясёлая сямейка.
12.45 Падарожжа дылетанта. «Ракаў. Паўночныя Афіны».
13.00 Сола для дэбютанта. Драматург Андрэй Карэлін.
13.10 Плянэта АРТ.
13.40 Дак. сэрыял «Пары і дуэты-2».
14.05 «Маршрут №...».
14.10 Вэстэрн «Вуліцы Ларэда» (ЗША).
15.20 «Беларусы Югры». Відэафільм АНТ.
15.40 Кухня КВК.
15.50 Сэрыял «Лі Эванс. І што цяпер?».
16.20 Сямейная мэлядрама «Дзяўчынка і воўк».
18.20 «На скрыжаваньнях Эўропы». Нацыянальны тэлефэстываль песьні.
18.45 Мэлядрама «Легенда Багера Ванса» (ЗША).
21.00 Панарама. Інфармацыйны канал.
21.25 Галоўнае пытаньне.
22.05 Драма «Пад покрывам нябёс».
0.20 Начны музычны этэр.

● СТВ

5.30 Музычны канал.
6.30 «Дзікая плянэта». «Язык сабак» з цыклу «Сабачае жыцьцё». Дак. фільм.
7.30 «Дэніс-непаседа». Мультсэрыял.
8.00 «Флінт — дэтэктыў у часе». Мультсэрыял.
8.25 «Хіткліф». Мультсэрыял.
8.50 «Менск і менчукі».
9.00, 20.00 «СТВ-спорт».
9.10 «Сьнеданьне зь Інай Афанасьевай».
9.35 «Адпачывай».
9.45 «Сямейнае кіно з калекцыі «Hallmark». «Краіна фэй».
10.45, 20.10 Кіно: музычная камэдыя «Труфальдзіна з Бэргама», 1-я сэрыя.
12.00 «Разам».
12.30 «Плянэта людзей».
12.45 «Філярманічны тыдзень».
12.50 «Рамонт».
13.05 Кіно: дэтэктыў «Сышчык пецярбурскай паліцыі».
14.55 «Аблічча часу». Да 70-годзьдзя інстытуту «Белпраект».
15.25 «Чыста па жыцьці». Сэрыял.
16.00 «Жыцьцё зь Люі». Мультсэрыял.
16.25 «Вуншпунш». Мультсэрыял.
16.55 «Запрашаем паскардзіцца».
17.05 «Аўтапанарама».
17.25 Кіно: камэдыя «Жандар з Сэн-Трапэ».
19.30 «24 гадзіны».
19.45 «Навіны СНД».
21.20 Кіно: вострасюжэтны фільм «Гоншчык». ЗША, 201.
23.20 Кіно: трылер «Відок». Францыя, 2001.

● 8 канал

15.00 Драма «Зялёная міля».
17.55, 21.00 Тэлекрама.
18.00 Мультфільм «Канёк-Гарбунок».
19.15 Крымінальная камэдыя «Рыскія канікулы».
20.45 «Вечарніца».
21.10 Трылер «Матрыца».

● Першы музычны канал

8.00, 12.15 Рухач.
10.00 «Пад'ёмнік».
12.00 «Заваёўнікі кантынэнтаў».
13.00 «20-ка першых».
14.00 «ІнтэрАктыў».
16.00 Музыка.RU.
17.00 «120/80».
17.10, 21.45 УльтраМікс.
21.00 «Пра Fashion».
22.30 Past perfect. Музыка рэтра.
23.30 «Поцемкі».
0.00 MegaMix.

● АНТ

8.00 Сэрыял «Твінісы».
8.20 Ералаш.
8.25 Грай, гармонік любы!
9.00 Слова пастыра.
9.15 Здароўе.
10.00, 14.00 Навіны (з субтытрамі).
10.10 Смак.
10.30 Сьмехапанарама.
11.10 «Падарожжы натураліста».
11.40 «Новы дзень». «Новыя цуды сьвету». Храм Сьвятой сям'і.
12.05 «Новы дзень». «Сканэр».
12.35 «Крэмль-9». «Васіль Сталін. Узьлёт».
13.30 Ералаш.
13.35 Дыснэй-клюб: «Баз і яго каманда».
14.10 «Каб памяталі...».
14.45 Разумніцы й разумнікі.
15.15 Жывая прырода. «Браты па крыві».
16.10 Жарт за жартам.
16.50 Прыгодніцкі фільм «Буч Кесыдзі і Сандэнз Кід».
18.55 «Хто хоча стаць мільянэрам?».
20.00 Час.
20.30 «Нашы навіны».
21.00 «Апошні герой-3».
22.05 Вялікая прэм'ера. Баявік «Двайны пралік».
0.00 Трылер «Псыхоз».

● РТР

8.45 Ранішняя пошта.
9.25 «Сто да аднаго».
10.15 Сам сабе рэжысэр.
11.15 У пошуках прыгод.
12.10 Клюб сэнатараў.
13.00, 19.00 Весткі.
13.20 Камэдыя «Каралева бэнзакалёнкі». 1963 г.
14.50 Кінагісторыі Глеба Скараходава.
15.00 Прэм'ера. Камэдыя «Плян «Б» (ЗША). 2001 г.
17.00 Мая сям'я.
18.00 Аншляг.
19.25 Люстра.
19.50 «Сумленны дэтэктыў».
20.15 «Сьмяяцца дазваляецца!» Гумарыстычны канцэрт.
21.25 Сусьветнае кіно. Вострасюжэтны фільм «Майстэрства вайны» (ЗША). 2000 г.

● Культура

11.10 ГЭГ.
11.25 «Графаман».
11.55 Дзіцячы сэанс. «Казка падарожжаў». Маст. фільм.
13.40 «До мажор».
14.10 Да 80-годзьдзя Тэатру імя Масавету. «Далей — цішыня». Тэлевэрсія спэктаклю.
16.50 Магія кіно.
17.20 «У вашым доме».
18.00 «Дваранскае гняздо». Маст. фільм.
19.50 «Сфэры».
20.30 «Вялікія раманы дваццатага стагодзьдзя».
21.00 Навіны культуры.
21.20 «Дзяўчына тваёй мары». Маст. фільм.
23.20 «І даўжэй за век...».

● НТВ

9.00, 10.00, 11.00, 12.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00 Сёньня.
9.05 «Кулінарны паядынак».
10.05 «Кватэрнае пытаньне».
11.05 «Прафэсія — рэпарцёр».
11.25 Служба выратаваньня.
12.05 Дэтэктыў «Іпадром».
13.50 Смачныя гісторыі.
14.05 Свая гульня.
15.20 «Жаночы погляд».
16.05 «Шоў Алены Сьцепаненкі».
17.05 Сэрыял «Бунтоўная плянэта: ураган».
18.00 «Сёньня» з Кірылам Пазднякоўым.
18.30 Прэм'ера. Баявік «Нястрымны».
20.05 Баявік «Цяжкая мішэнь» (ЗША).
22.00 Супэрбокс. Оскар Дэ Ла Хоя супраць Оба Кара.

● Эўраспорт

9.30 Прыгоды. Сэрыя рэйдаў. Кірквуд. Паўтор.
10.00 Ралі. Турцыя. Паўтор.
10.30 Лыжныя гонкі. Чэмпіянат сьвету. 50 км, мужчыны. Жывая трансьляцыя.
13.30 Горныя лыжы. Чэмпіянат сьвету. Гіганцкі слалам, мужчыны.
14.30 Скачкі на лыжах з трампліну. Чэмпіянат сьвету. К-90. Паўтор.
15.30 Вэляспорт. Хэт Волк.
18.30 Лыжныя гонкі. Чэмпіянат сьвету. 50 км, мужчыны. Паўтор.
19.00 Супэркрос. Чэмпіянат сьвету. Атланта. Паўтор.
20.00 Трыял на матацыклах. Чэмпіянат сьвету. Пэсара.
21.00 Тэніс. WTA Скотсдэйл. Паўфінал. Жывая трансьляцыя.
23.00 Экстрэмальныя віды спорту.
1.15 Ралі. Турцыя.
1.45 Тэніс. АТР. Дубаі. Паўфінал.

2 сакавіка нядзеля

● БТ

7.00, 12.00, 15.00 Навіны.
7.15 «Бэльфэгор». Мультсэрыял.
7.40 Пяць цудаў.
7.50 Мультыклюб.
8.30 Арсэнал.
9.05 «Сузор'е надзей». Нацыянальны тэлевізійны конкурс юных талентаў.
9.30 Экран індыйскага кіно. «Тры браты». 2-я сэрыя.
11.20 Сад мары.
11.45 Наша спадчына. «Сядзібы Беларусі часоў барока і раньняга клясыцызму».
12.20 «Усё нармальна, мама!».
13.00 «Ваша лято».
13.40 «Сьвятло далёкай зоркі. Яўгенія Янішчыц».
14.05 «Маршрут №...».
14.10 Вэстэрн «Вуліцы Ларэда» (ЗША).
15.20 «Рынкі сьвету». Дак. сэрыял.
15.45 Сэрыял «Барацьба за выжываньне».
16.35 Кліп-абойма.
17.15 Драма «Сьцяпан Сяргеевіч» («Беларусьфільм»). 1-я і 2-я сэрыі.
19.35 Камэдыя «Вялікія канікулы» (Італія — Францыя).
21.00 Панарама: падзеі тыдня.
21.45 Тэлебаромэтар. Прагноз надвор'я.
22.05 Бокс. Баі наймацнейшых прафэсіяналаў сьвету. Джон Руіз — Рой Джонз-малодшы. Трансьляцыя з ЗША.
22.55 Драма «Эліза» (ЗША).

● СТВ

5.30 Музычны канал.
6.30 «Дзікая плянэта». «Усё пра сабак», «Выратавальнікі». Дак. фільмы.
7.30 «Дэніс-непаседа». Мультсэрыял.
8.00 «Флінт — дэтэктыў у часе». Мультсэрыял.
8.25 «Хіткліф». Мультсэрыял.
8.50 «Філярманічны тыдзень».
9.00 «СТВ-спорт».
9.10 «Партрэт у інтэр'еры».
9.25 «Аўтапанарама».
9.45 «Сямейнае кіно з калекцыі «Hallmark». «Краіна фэй».
10.50, 20.10 Кіно: камэдыя «Труфальдзіна з Бэргама», 2-я сэрыя.
12.00 «Сьнеданьне зь Інай Афанасьевай».
12.30 «Добры дзень, доктар!».
12.45 «Арт-экспрэс». Культурнае жыцьцё сталіцы.
13.05 Кіно. Дэтэктыў «Кантрабанда». СССР, 1974.
15.00 «Відавочца».
15.30 «Вовачка-2». Сэрыял.
16.05 «Жыцьцё зь Люі». Мультсэрыял.
16.30 «Вуншпунш». Мультсэрыял.
17.00 «Навіны сусьветнай шоў-індустрыі».
17.30 «Вар'яцкі сьвет». Дак. фільм.
18.20 «168 гадзін».
19.05 «Усё для сябе».
19.35 «Пакуль гарыць сьвечка».
21.20 Кіно. Мэлядрама «Вішнёвыя ночы».
22.55 «Гульнявы рэфлекс».
23.05 «Навіны СНД».
23.20 «Рамонак». Дак. фільм цыклу «Агульны дом».
23.35 Кіно. Драма «Непрыкаяны». Фінляндыя, 2000.

● 8 канал

15.00 «У госьці да казкі».
16.30 «Эўропа сёньня».
17.00 Сэрыял «Горац».
17.45 Маст. фільм «Праклён талісмана».
19.15 Маст. фільм «Злодзей».
20.45 «Вечарніца».
21.00 Тэлекрама.
21.10 Маст. фільм «Джэймз Бонд — агент 007».

● Першы музычны канал

8.00 Рухач.
12.00 Музыка.RU.
13.00, 23.00 MegaMix.
17.00 УльтраМікс.
22.00 Past perfect. Музыка рэтра.

● АНТ

8.00 Сэрыял «Твінісы».
8.25 Ералаш.
8.35 Служу Расеі!
9.00 Дыснэй-клюб: «Цімон і Пумба».
9.20 «У сьвеце жывёл».
10.00, 14.00 Навіны (з субтытрамі).
10.10 «Падарожныя нататкі».
10.30 Пакуль усе дома.
11.20 Дог-шоў.
12.05 «Клюб падарожнікаў».
12.45 «Крэмль-9». «Васіль Сталін. Падзеньне».
13.30 Дыснэй-клюб: «Качыныя гісторыі».
14.10 «Валадар смаку».
15.05 Ток-шоў «Выбар».
15.45 КВК-2003.
18.10 Вялікая прэм'ера. Баявік «К-19» (2002 год).
20.30 «Контуры».
21.10 Камэдыя «Кевін з поўначы».
23.00 Часы.
0.05 Рэальная музыка.

● РТР

9.15 Ранішняя размова зь Дзьмітрыем Кісялёвым.
9.45 У «Гарадку». «Справаздача за люты».
10.15 Парад камэдый. «Зімовая акадэмія» (ЗША). 1996 г.
12.10 Парлямэнцкая гадзіна.
13.00 Весткі.
13.20 Вакол сьвету.
14.15 Дыялёгі пра жывёл.
15.20 Сьвет на мяжы.
15.55 Пакой сьмеху.
16.50 Маст. фільм «Фантом» (ЗША). 1997 г.
18.50 У «Гарадку».
19.00 Весткі тыдня.
20.10 Спэцыяльны карэспандэнт.
20.35 Сусьветнае кіно. Маст. фільм «Чорны сабака» (ЗША). 1998 г.
22.25 Апошні сэанс. Прэм'ера. Маст. фільм «Пункт прызначэньня» (ЗША). 2000 г.

● Культура

11.15 90 гадоў з дня нараджэньня Георгія Флёрава. «Сакрэтныя фізыкі».
11.45 Прагулкі па Брадвэі.
12.15 Дзіцячы сэанс. «Канёк-Гарбунок». Мультфільм.
13.25 Мой цырк.
13.55 Чорныя дзіркі. Белыя плямы.
14.50 «Час музыкі».
15.20 «Шэдэўры сусьветнага музычнага тэатру». В.Моцарт. «Чароўная флейта». Фільм-опэра.
18.25 «Жыў-быў сабака». Мультфільм.
18.35 Ізноў пласьцінка пяе.
19.05 «Пасьляслоўе». Маст. фільм.
20.40 «Дом актора». «Госьці дарагія...»
21.20 «Замкі жахаў». Дак. сэрыял.
21.45 «Культ кіно». «Зьмей». Маст. фільм.
23.15 Джэм-5.

● НТВ

9.00, 10.00, 11.00, 12.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00 Сёньня.
9.05 Сэрыял «Бунтоўная плянэта».
10.05 «Расьліннае жыцьцё».
10.40 Вы будзеце сьмяяцца!
11.05 Праграма «Ўплыў».
12.05 Камэдыя «Войска выратаваньня».
13.50 Смачныя гісторыі.
14.05 Свая гульня.
15.20 «Гісторыя паляўнічага на кракадзілаў».
15.45 Ток-шоў «Прынцып даміно».
17.05 Найноўшая гісторыя. «Сталін: сьмерць правадыра».
18.00 «Сёньня» з Кірылам Пазднякоўым.
18.30 Блякбастэр «Водны сьвет» (ЗША).
21.00 Драма «Дзень каханьня».
22.55 Сэрыял «Клан Сапрана». 18-я сэрыя (ЗША).
23.50 Часопіс Лігі чэмпіёнаў.

● Эўраспорт

10.00 Ралі. Турцыя. Паўтор.
10.30 Скачкі на лыжах з трампліну. Чэмпіянат сьвету. К-90. Паўтор.
12.00 Горныя лыжы. Кубак сьвету, слалам, мужчыны.
13.00,16.30 Супэрбайк. Чэмпіянат сьвету. Гішпанія.
14.00 Супэрспорт. Чэмпіянат сьвету. Гішпанія. Жывая трансьляцыя.
15.00 Супэркрос. Чэмпіянат сьвету. Атланта. Паўтор.
16.00, 0.45 Супэрбайк. Чэмпіянат сьвету. Гішпанія. Паўтор.
17.30 Тэніс. WTA Скотсдэйл. Паўфінал.
19.00 Тэніс. АТР. Дубаі. Фінал.
21.00 Аўтагонкі сэрыі Наскар. Ракінгем.
22.00 Бокс. Паўтор.
23.00 Тэніс. WTA Скотсдэйл. Фінал. Жывая трансьляцыя.
1.15 Ралі. Турцыя.

Наша Ніва

Нагадваем, што падпіскаю газэта абыходзіцца таньней.
Падпісны індэкс **63125**.
Цана падпіскі на месяц — **2043** рублі.
На шапік «Белсаюздруку» — усяго **1360** рублёў. Падпіску прымаюць ва ўсіх аддзяленьнях пошты, у шапіках «Белсаюздруку».
Дык падпісвайся!

Працяг са старонкі 1.

Сьвятары супраць храмаў

На пачатку 90-х, калі «культавыя будынкі» толькі пачалі вяртаць Царкве, скандалы вакол рэстаўрацыі набылі лявінападобны характар. Новапрызначаныя «бацюшкі» абураліся «неправаслаўнай» архітэктурай беларускіх храмаў і патрабавалі насадзіць на іх вялізныя купалы-цыбуліны ў псэўдарасейскім стылі. Бяз гэтага, маўляў, няма праваслаўнага храму.

Каб уратаваць ад звыродлівых «цыбулінаў» помнік беларускага барока — Сьвята-Духаву царкву Куцеінскага манастыра ў Воршы, спатрэбіліся намаганьні дзеячоў культуры. Тамтэйшы сьвятар вывеў вернікаў на галадоўку насупраць гарвыканкаму, патрабуючы: хай рэстаўратары ставяць цыбуліны! Толькі ліст да мітрапаліта Філарэта, падпісаны Адамам Мальдзісам, Міколам Купавам ды іншымі, дапамог неяк суцішыць «мяцежнага бацюшку».

Дэпартамэнт: усё ня так кепска

Васіль Абламскі, дырэктар Дэпартамэнту па ахове гісторыка-культурнай спадчыны і рэстаўрацыі пры Міністэрстве культуры, лічыць, што праблемы кшталту аршанскае ўзьнікаюць у адзінкавых выпадках. «Гаворка йдзе пра адметныя культавыя аб'екты, занесеныя ў Дзяржаўны сьпіс гісторыка-культурных каштоўнасьцяў, — іх у нас 414. На гэтыя падкантрольныя Царкве ці Касьцёлу будынкі распаўсюджваюцца патрабаваньні па ахове гісторыка-культурнай спадчыны», — тлумачыць чыноўнік.

Гэта значыць, будынкі знаходзяцца пад наглядам дзяржавы. І тая, каб зьберагчы помнік архітэктуры ў аўтэнтычным выглядзе, змушае гаспадара падпісаць ахоўнае «абавязацельства». Праўда, як кажа намесьнік дырэктара Дэпартамэнту Васіль Чэрнік, цяпер такія дамовы ёсьць толькі з паловай прыходаў. Гэта не спрыяе зьбераж эньню храмаў. «Па несьвядомасьці кожнаму сьвятару хочацца ўпарадкаваць храм неяк па-чалавечы: тут падфарбаваць, там прыбудаваць, зрабіць хрысьцільню, памяняць крыжы... Тады мы даём прадпісаньне, спыняем працы ці рэкамэндуем іншыя», — кажа В.Абламскі. Колькасьць такіх «прадпісаньняў» зьмяншаецца. У 2002 г. было выпісана толькі адно. У 1999-м і 2000-м — па 3 прадпісаньні. Да прыкладу, у Полацкім Спаса-Эўфрасіньнеўскім манастыры пачыналі будаўніцтва без узгадненьня з Дэпартамэнтам. Або ў Будслаўскім касьцёле ўзяліся былі самавольна рэстаўраваць жывапіс. А камбінат грамадзкага харчаваньня ў Валожыне, што месьціцца ў будынку былой ешывы, не дагледзеў каналізацыі. Прадпісаньне атрымлівала таксама Сьвята-Ільлінская царква ў вёсцы Ільля Вялейскага раёну. Грамада ўзялася саматугам перарабляць фасад. Вось, паводле словаў чыноўнікаў, і амаль усе парушэньні за тры гады.

Чаго ня бачыць Дэпартамэнт

Аднак Уладзімер Трацэўскі, прафэсар катэдры тэорыі і гісторыі архітэктуры архітэктурнага факультэту Беларускага нацыянальнага тэхнічнага ўнівэрсытэту, з гэтым катэгарычна ня згодны. Ён штолета выяжджае з студэнтамі на практыку і бачыў безьліч зьнявечаных храмаў. «Як толькі культавая ўстанова пераходзіць у рукі нейкага гаспадара — той ужо ні з кім ня лічыцца», — кажа прафэсар.

Напрыклад, у Жодзішках ксёндз вырашыў, што яму трэба дадатковае памяшканьне пры касьцёле. Прабіў сьцяну і паставіў сваю прыбудову. У вёсцы Райца Карэліцкага раёну касьцёл цяпер выкарыстоўваецца як праваслаўная царква. Бацюшка на свой капыл перарабляе яго як хоча. Там ужо нават ня можа ісьці гаворка пра рэстаўрацыю. А аб'ект быў арыгінальны: на самым версе стаяла скульптурная выява Божае Маці. Касьцёл у Варончы (таксама Карэліччына) людзі сваімі сіламі пачалі рамантаваць. Гзымсы й пілястры атрымаліся не на адным узроўні. Будаўнікі ведалі, як рабіць кожную асобную дэталь, але не маглі ахапіць цэлага.

Ёсьць і станоўчыя прыклады рэстаўрацыі. У.Трацэўскі назваў менскую катэдру: «Але яе аднаўлялі палякі і нашых спэцыялістаў блізка не падпускалі». Або Мікалаеўская царква 1669 г. у Магілёве: «Там быў цудоўны іканастас XVIII ст. Калі царкву разабралі, дык іканастас валяўся гадоў трыццаць у розных майстэрнях: у Менску, Магілёве. Цяпер царкву адрэстаўравалі, прафэсійна аднавілі. Відаць, іканастасу таксама дадуць рады...»

В.Чэрнік таксама згадаў прыклады плённага супрацоўніцтва дзяржавы й царквы: «Ня маем ніякіх прэтэнзіяў да работ, якія праводзяцца ў Сьвята-Ўсьпенскай царкве (вёска Косіна Лагойскага раёну). Настаяцель, айцец Георгі, заўсёды з намі раіцца. Альбо гарадзенскі Фарны касьцёл Францішка-Ксавэрыя. Там хацелі зрабіць уваход у будынак збоку. Ён некалі там быў, трэ было проста аднавіць. Яны зьвярнуліся да нас, мы зрабілі комплексныя навуковыя дасьледаваньні, пацьвердзілі, што там быў уваход, — калі ласка, зрабілі».

Умантавалі абраз

Але гэткая царкоўна-чыноўніцкая ідылія не заўжды йдзе на карысьць.

АНАТОЛЬ КЛЯШЧУК

На мінулым тыдні «цыбуліна» зьявілася над праваслаўным саборам у Слоніме, які быў адбудаваны на месцы зьнішчанага ў 1960-я г. савецкай уладай.

Самы яскравы прыклад — праваслаўны Сьвята-Духаў сабор у Менску, «упрыгожаны» вялізным псэўдабізантыйскім пано. Гэткая звыродлівая безгустоўнасьць на фасадзе барочнага храму відаць здалёк. Зьяўленьне абраза сваім часам выклікала скандал. Намесьніца старшыні Таварыства аховы помнікаў Галіна Саўчанка рашуча пратэставала на паседжаньні экспэртнай рады Мінкульту, і мітрапаліт Філарэт дэманстрацыйна перастаў вітацца зь ёй. В.Абламскі проста патлумачыў чыноўніцкі дазвол разьмясьціць пано: «Там ёсьць ніша, якая раней была аконным праёмам. І няма вялікай супярэчнасьці, што там умантаваны абраз, ён не ўплывае на архітэктурныя асаблівасьці сабору».

У.Трацэўскі ўпэўнены ў адваротным: «Аніяк не спалучаецца гэтае пано з храмам. Яно адасабляе вежы. Такое знарочыстае напластаваньне непрафэсійнае і неэтычнае!» І пано — яшчэ ня самая сьмелая ідэя Экзархату, скіраваная на «праваславізацыю» храму. Як сьведчыць В.Абламскі, «уладыка Філарэт неаднаразова пытаў у нас дазволу паставіць на сабор купалы. А мы кажам: там іх не было. І на сёньняшні дзень ён пагаджаецца з нашымі аргумэнтамі».

Паводле халмагорскіх узораў

Адзін з архітэктараў — спэцыялістаў у галіне рэстаўрацыі гэтак апісвае сытуацыю з аховай помнікаў: «Ад 1992 г. існавалі два дзяржаўныя камітэты пры Савеце міністраў — па ахове гісторыка-культурнай спадчыны і па рэстаўрацыі. Яны спаборнічалі міжсобку, і ад гэтага справа толькі выйгравала. Пры канцы 90-х камітэты панізілі ў статусе і зьвялі ў адзін дэпартамэнт. Калі раней яны былі фактычна на ўзроўні самастойных асобных міністэрстваў, дык цяпер гэта адзін з аддзелаў Мінкульту. Адпаведна паменшаў і іхны ўплыў».

Прадстаўнікі Дэпартамэнту на месцах — у абласьцях, раённых гарадах — гэта штатныя работнікі тамтэйшых аддзелаў культуры. Яны падпарадкоўваюцца мясцовай уладзе, залежаць ад яе. Іх дзеяньні прасьцей кантраляваць.

Многія барбарскія перабудовы, паўторымся, спрычыненыя неабазнанасьцю сьвятароў. «Калі праваслаўнага сьвятара вучаць у Расеі, ён успрымае тамтэйшы ўзор за канон. І ня ведае, што існуюць яшчэ 15 праваслаўных цэркваў з сваімі традыцыямі, у тым ліку і архітэктурнымі, — кажа наш экспэрт-архітэктар. — Ён прыяжджае сюды і бачыць, што тут усё не адпавядае ягонаму ўяўленьню. Зь сьвятарамі трэба весьці ў гэтым кірунку працу: тлумачыць ім гісторыка-культурную каштоўнасьць будынкаў, выдаваць інструкцыі наконт зьберажэньня нашай архітэктурнай спадчыны».

У.Трацэўскі зазначае, што сёньня многія праваслаўныя новабудоўлі ў Беларусі бяруць за канон цэрквы расейскае Поўначы XV ст., абсалютна не характэрныя для Беларусі. У часе кожнага такога рамонту зьнішчаюцца аўтэнтычныя формы. Мы наўмысьля зьбядняем сябе, прыніжаем продкаў тым, што заміж складанага гзымсу робім просты, зьбіваем гірлянды і іншы дэкор. Мы самі здаёмся менш таленавітымі, а наш культурны ўзровень — ніжэйшым.

Аркадзь Шанскі

АНАТОЛЬ КЛЯШЧУК

Сьвята-Духаў сабор у Менску быў «упрыгожаны» вялізным псэўдабізантыйскім пано, зьяўленьне якога выклікала скандал.

Колькасьць храмаў, занесеных у Дзяржаўны сьпіс гісторыка-культурных каштоўнасьцяў

Вобласьць	Цэрквы	Касьцёлы	Сынагогі	Кірхі	Мячэты
Берасьцейская	143	16	3	—	—
Віцебская	64	25	—	1	—
Гарадзенская	32	37	4	—	1
Гомельская	17	5	—	—	—
Магілёўская	11	5	3	—	—
Менская	20	26	—	—	1

• ЮБІЛЕЙ КАРАЛЕЎСТВА БЕЛАРУСІ •

Гісторыкі супраць літаратараў

Гісторыя — гэта навука пра тое, якой будзе нашая мінуўшчына. Гэтым досьціпам можна было ахарактарызаваць чарговае паседжаньне аргкамітэту па сьвяткаваньні 750-годзьдзя з часу каранацыі Міндоўга.

Аргкамітэт працуе інтэнсіўна. Кожнае пытаньне разьбіраецца дэталёва. Асноўнай тэмай апошняй гутаркі стала сымболіка Міндоўгавых часоў. Пытаньне не «акадэмічнае», а «ўжытковае». Бо аргкамітэт лічыць неабходным выдаць адмысловую капэрту і паштовую марку да ўгодкаў каранацыі, а таксама юбілейную манэту. Што трэба чаканіць на манэце: «Пагоню», «Калюмны» ці які іншы герб? Пасьля дыскусіі з удзелам гісторыкаў Георгія Штыхава ды Юрася Бохана было вырашана спыніцца на варыянце шасьціканцовага крыжа. Тут, маўляў, і Еўфрасіньнеўскі крыж, і тарча вершніка на «Пагоні». Дый наагул, крыж — знак унівэрсальны.

Найбольшая праблема ўзьнікла падчас абмеркаваньня адозвы, якую мае выдаць аргкамітэт, каб паінфармаваць суграмадзянаў пра значнасьць Міндоўгавай асобы. «Як грамадзянін я дзьвюма рукамі за гэты тэкст, — патлумачыў Ю.Бохан, — але як гісторык маю да яго шэраг прэтэнзіяў і падпісацца не магу». Скепсыс і Ю.Бохана, і Г.Штыхава выклікалі асобныя даты і цьверджаньні адозвы. Паводле словаў навукоўцаў, сёньня беларуская гістарычная навука далёка адышла ад канцэпцыі Міколы Ермаловіча. «І Г.Сагановіч, і А.Краўцэвіч, і В.Насевіч — людзі, якія займаюцца вывучэньнем гэтага пэрыяду, сёньня зусім іначай глядзяць на паўставаньне ВКЛ», — зазначыў Ю.Бохан. У прыватнасьці, ёсьць сумневы наконт таго, ці быў Наваградак сталіцай ВКЛ. «Там была каранацыя. Але ж гэта не абавязкова азначае, што Наваградак быў сталіцай», — цьвердзіць гісторык. Сумнеўна выглядае і незалежнасьць Наваградзкага княства ў даміндоўгавы часы (ёсьць сьведчаньні, што Наваградак быў перададзены Міндоўгу на васальных правох галіцка-валынскім князем), патрабуюць удакладненьня летапісныя даты.

Словы гісторыкаў выклікалі выбух абурэньня ў намесьніка старшыні аргкамітэту Міколы Купавы і аўтара адозвы Зьдзіслава Сіцькі: «Вы зараз так дагаворыцеся, што ў нас нічога і не было!» Бярыце, маўляў, прыклад зь Літвы: там уся гісторыя перакручаная, але яны адстойваюць сваю пазыцыю. «Гісторыя — гэта навука, яна мае дачыненьне з фактамі, а не з эмоцыямі», — адказаў Ю.Бохан.


АНАТОЛЬ КІРШЧУК

Георгі Штыхаў падтрымаў Юрася Бохана: «Подзьвіг М.Ермаловіча быў у тым, што ён прабіў таталітарны мур і адкрыў нам дарогу. Але не забывайце, што паводле адукацыі ён быў усё ж філёлягам...»

Ці перамогуць гісторыкі (і іхныя факты) літаратараў (і іхныя эмоцыі) у юбілейных сьвяткаваньнях і масавай сьвядомасьці? Пакуль перавага на баку прыгожага пісьменства. На карысьць літаратараў працуюць опэра А.Бандарэнкі і В.Іпатавай, рамаины Л.Дайнекі і Г.Далідовіча, кнігі М.Ермаловіча. На баку гісторыкаў пакуль толькі «Нарыс гісторыі» Г.Сагановіча. Новы погляд, пост'ермаловіцкая беларуская гісторыя яшчэ не паказала свайго аблічча шырокай публіцы.

Адам Воршыч

• ДЗЕ ВАРТА БЫЦЬ •

Апошні шанец «Госьціцы»

АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

23 лютага ў Доме вэтэранаў адбудзецца канцэрт фальклёрнага тэатру «Госьціцы». Ён можа быць апошнім.

На пачатку 90-х «Госьціцу» часта можна было бачыць і на канцэртных сцэнах, і на тэлеэкране. Было зьнята больш за 20 фільмаў рознай працягласьці — ад 2 да 30 хвілінаў. А пасьля — як адрэзала. За апошнія гадоў 5—6, адзначае кіраўнічка «Госьціцы» Л.Сімаковіч, ніводзін рэжысэр не здымаў нумароў, пастаўленых калектывам: «Нам проста не даюць здымачных дзён і магчымасьці. У нас багата гатовага матэрыялу, толькі стаў камэры і фільмуй! Я колькі разоў запрашала рэжысэраў — не прыходзяць і не глядзяць. Іх не цікавіць гэта! А начальства мне кажа: ніводнай работы ня зьнята, а навошта вы нам тады патрэбныя?»

Прычына такой няўвагі не ў саміх рэжысэрах. «Госьціца» недаспадобы кіраўніцтву Белдзяржтэлерадыёкампаніі. Цяжкасьцяў у працы, якія мае Л.Сімаковіч і ейныя гадаванцы, ня ведае ніводзін калектыў БДТРК — ані сымфанічны аркестар, ані акадэмічны хор, ані інструмэнтальны ансамбль. «Кожны канцэрт трэба ўзгадняць, транспарт на паездкі не выдзяляецца, касьцюмы ня шыюцца ўжо 10 гадоў. Нават па горадзе перавезьці касьцюмы, інструмэнты з пляцоўкі на пляцоўку — вельмі складана. Аркестар БДТРК увесь час выяжджае на нейкія гастролі, а ў нас адсочваецца кожны канцэрт. Хочаш зарабіць на касьцюмы — дык яшчэ невядома, ці дазволяць», — канстатуе Л.Сімаковіч.

Далейшы лёс калектыву мае два варыянты. Першы — «Госьціца» здолее стварыць свой тэатар, кшталту «Зьнічу» Галіны Дзягілевай. Толькі на гэта трэба фундатар, згодны ўкладаць грошы ў «нетыповае» мастацтва. Іншы варыянт кіраўніцтва БДТРК агучвае ўжо гадоў 5—6: музычныя калектывы пры тэлерадыёкампаніі ня трэба. «З чыста эканамічнага пункту гледжаньня можна было б пагадзіцца. Ёсьць жа Мінкульт, які мусіць займацца гэтымі калектывамі. Але, на маё суб'ектыўнае меркаваньне, такім патэнцыялам не раскідаюцца», — упэўнена кажа кіраўнічка «Госьціцы». І ціха дадае: «Дзяржава ўвесь час гаворыць пра сваю беднасьць. Нібыта гэта падстава для гонару».

Зьнікнуць фальклёрны тэатар можа вельмі проста. Як і ўсе супрацоўнікі БДТРК, Л.Сімаковіч працуе на кантрактнай аснове. Улетку ў яе скончыцца тэрмін кантракту, а кіраўніцтва кампаніі мае права не працягваць яго.

Адзіным паратункам для сябе і для калектыву спадарыня Ларыса бачыць будучы канцэрт. «Мы ёсьць, нам ёсьць што паказаць. Я спадзяюся, што пасьля гэтага канцэрту зьявіцца патрэба ладзіць такія выступы прынамсі раз на месяц. Бо тое, што прапануе «Госьціца», на сёньня ні да чога не падобна, такога ня можа прапанаваць ніхто», — кажа яна.

Аркадзь Шанскі

Канцэрт адбудзецца 23 лютага а 19-й у Доме вэтэранаў (вул. Янкі Купалы, 21). Пра гісторыю фальклёрнага тэатру «Госьціца» і ягонай кіраўніцы Ларысы Сімаковіч «НН» пісала ў 2001 г. (№10 за 5 сакавіка).

• АСЯРОДЗЬДЗЕ •

Помнікі — гэта мы

Раней скульптуры людзей у Менску ставіліся высока, на пастамэнты — недасяжна для рук. Ускідай галаву ўверх і глядзі, як на неба, як на багоў якіх... Яны і былі калісьці амаль «багамі», тыя былыя правіцелі й гаспадары. Героі, зь якіх жыцьцё рабілі мы.

Але неяк спакваля, паціху — разам з усімі гарадамі Эўропы — Менск засяляўся скульптурамі і на ніжэйшых «паверхах» гарадзкой прасторы. Дзяўчаты, якія пускаюць вянкі па вадзе ў Купалаўскім сквэры; дзяўчына з кнігаю на каленях ля кнігарні «Маладосьць»; скульптурныя групы «Поры году» на праспэкце Машэрава, — дзеці, дзяўчаты, дзецюкі, для якіх усё дзіўнае, па-за правіламі — натуральнае. Ім можна быць нязвыкла нізкімі, амаль на ўзроўні вачэй. А то й расьці проста зь зямлі: з травы ці белае гурбы сьнегу.

А аднойчы ў натоўпе ля Міхайлаўскага сквэру, што ля вузла менскіх вакзалаў, спыніўся дзіўны мінак. Высокі, худы, бранзаваскуры, нерухома застылы ў экстравагантнай позе: «Цыгарэткай пачастуеце?..»

Неўзабаве на адмысловай лаве таго ж сквэру зьявілася танканогая вабная спадарыня. «Мянчанка» — зусім як Пашкевічанка. Спачатку было шмат ахвотных сфатаграфавацца побач з бронзавай спадарыньнай на глыбокай, як зямное каханьне, той лаве.

У хуткім часе да гэтых дзьвюх скульптар дадаў бронзавую фігурку басаногае дзяўчынкі з парасонам, дзіравым і вясёлым, як нетутэйшы сыр на сьвяточным стале. Людзі далікатна абыходзяць яе, каб не штурхнуць малое...

Прозьвішча скульптара — сымбалічнае: Жбанаў. Быццам гліняны збан, зь якога выходзяць гэтыя мэталёвыя людзі. «Калісьці, — усьміхаюся я, гледзячы ў твар Мінаку, — Бог стварыў нас, мяккіх і цёплых людзей, зь першароднае гліны; а цяпер адзін з нас, «гліняных», стварыў мэталёвых вас...» (Я ведаю сумную гісторыю, пра якую далікатна маўчыць Мінак, але памятаю й іншую — здаецца, больш аптымістычную: «Усё праміне...» Адно шкада , што ў пярсьцёнка часу ўсяго толькі два бакі!)

З тае пары ў Менску ўзьнікаюць то ў адным, то ў другім месцы мэталёвыя людзі. Проста між намі. На зямлі ці на шэрай бэтоннай плітцы. Унівэрсытэцкі дворык засялілі... Неяк бачыла ў часопісе сымпатычны (сымптаматычны!) фатаздымак: рэктар унівэрсытэту між бронзавымі Будным і Цяпінскім як роўны сядзіць.

А ля ўваходу ў Камароўскі рынак — Жанчына зь семкамі, старадаўні Фатограф і Дама ля фантану... Як жывыя! Побач заўсёды поўна бясстрашных дзяцей і сталых людзей з усьмешлівымі тварамі. Тых, што вучылі даўней у школе на памяць вершы пра гераічных жалезных людзей і цьвікі...

Помнікі сярод нас. Помнікі — гэта мы.

Людка Сільнова

● ДЫСКАГРАФІЯ ●

«Песьні». Розныя выканаўцы. Выдавец вядомы: Адам Глёбус. (р) 2003.

Адам Глёбус сьпявае ня сам — не дачакаецеся. На дыску сабраныя песьні, напісаныя на ягоныя словы. Аналізаваць музычны матэрыял няма вялікай патрэбы: у большасьці гэта рэчы вядомыя. Бондаўская «На станцыі Койданава» (у альбом трапіў пазьнейшы варыянт, з саксафонным сола), «Чарга» (...па хлеб, у выкананьні Касі Камоцкай), ейныя ж «Котка», «Сон у трамваі». Песьнь «Новага Неба» на дыску аж восем, яны з альбомаў розных гадоў. Можна прасачыць увесь творчы шлях гурту — ад чыстай паветрана-кропельнай гітары Лявона Шырына да Славы Кораня зь яго цяжкой артылерыяй.

«Сябры» напісалі на словы Глёбуса вальс. Пад іхную «Вішню» можна танчыць, падпяваючы ў такт «гары яно гарам, такое каханьне!» Сядзець і слухаць ня так весела — песьня доўгая. Хоць і душэўная.

«Ядлаўцовы лес» — самы эстрадны ў добрым сэнсе слова. Самы лірычны. Файна запісаны. Стылёва вытрыманы. «Песьняры» — што тут дадаць. Па гэтай песьні заўважна, як багата ад іх узяў Данчык.

Досыць новы, у параўнаньні з іншымі твор — «Сіні апэльсын» гурту «Гарацкія». Верш гэты дэклямаваўся ў часе спэктаклю «Вольнае сцэны» «Чорны квадрат» і ў тым варыянце падабаўся мне болей. У песьні ёсьць фолькавыя і джазавыя ўстаўкі, модныя ды-джэйскія скрэтчы, але дзе за ўсім гэтым шукаць саміх «Гарацкіх»? «Песьняроў» ці «U2» зь першых акордаў пазнаеш, а тут — невыразна неяк, незапамінальна.

Але пры чым тут, разабраўшыся, аўтар словаў? На слабы ж тэкст песьні ў прынцыпе не напішаш, ён не зачэпіць за душу. Так што да паэта няма ніякіх прэтэнзіяў. А вось да выдаўца — ёсьць. На дыску не пазначныя ні аўтары музыкі, ні аранжыроўшчыкі, увогуле ніякіх імёнаў апроч «Адам Глёбус». Нібыта й не было суаўтарства з канкрэтнымі людзьмі. Толькі з брэндамі — «Песьняры», «Сябры» і г.д. Што яшчэ больш дадае вагі вышэйзгаданаму імю, але моцна зьмяншае вартасьць дыску — падарунку паэта самому сабе.

Янка Супрон

«БПзЛ(б)». «4.8». Выдавец не Адам Глёбус, (р) 2002.

Новы, сьвежы голас сінявокай Беларусі. Група, відаць, мусіла называцца «6.12», але не атрымалася: на ўкладышы пазначана, што бубнач на запіс не зьявіўся. У выніку два разы па 2.4 складаюць Дзяніс Лісейчыкаў (гітара, вакал) і Алесь Дуко (гітара, гармонік). Назва ж тлумачыцца так: «Блюз Пачынаецца зь Літары Б». Стыль — блюз і ўсё, што ляжыць побач. Мова — добрая. Беларуская.

Касэту гэтую разглядаць як гатовы да продажу і зьбіраньня на тым грошай прадукт нельга. Да таго ж, на вокладцы маецца папярэджаньне: «Не для продажу ў Сеньненскім і Кармянскім раёнах». Гэтыя вядомыя культурныя цэнтры былі выкрасьленыя з тае прычыны, што ў блюзавай тэме «Мястэчкі Эўропы» сьпяваецца: «Ёсьць у Эўропе мястэчка Карма, там нават гаўна не даюць задарма». А ў Сяньне вышэйзгаданага дабра на ўсіх не хапае — паводле тэксту. Які ж культурны загадчык райсавету такое дазволіць прадаваць на ўласнай тэрыторыі?



Сама касэта, нягледзячы на якасны ўкладыш, уяўляе сабой кляcычнае дэма з пункту гледжаньня якасьці запісу і выкананьня. Музыканты «4.8» пакуль не разыграныя, вучыцца ім яшчэ і вучыцца, хоць аснова маецца вельмі здаровая. Голас у Дзяніса добры, але урокаў зь пяць вакалу ў прафэсійнага пэдагога ўзяць не пашкодзіць. Што ж да рэпэртуару, дык такія творы, як «Нацюрморт», «Акадэмія-Павук», «Чарнільны блюз», «Генэрал Езавітаў», пры ўмове больш майстэрскага акампанэмэнту (і ў прысутнасьці бубнача; басіст таксама не перашкодзіць) могуць быць сьмела ўключаныя ў кантэкст (прабачце за слова!) беларускай песеннай рэчаіснасьці.

«Нацюрморт» — выдатны прыклад таго, як музыкі-пачаткоўцы падсьвядома праходзяць этапы перайманьня таго, што ўжо было і чаго, магчыма, яны нават ня ведаюць. Бо калі ў вас ёсьць жаданьне даведацца, як мог бы гучаць раньні «Аквариум» пабеларуску, — лепшага прыкладу ня знойдзеш.

Што ж, калі «4.8» навучыліся вымаўляць ня толькі «а», але ўжо і «б», спыняцца на гэтым шляху ня трэба. Вельмі спадзяюся, што пра гэтых безумоўна таленавітых хлопцаў мы яшчэ пачуем.

СЛуХА(ч)

Пэрно зайграў п'есу Карызны

Жэром Дзюкро, Уладзімер Перлін і Жэром Пэрно

Увечары 13 лютага ў касьцёле на Залатой Горцы было шматлюдна. І зусім не таму, што менчукі напярэдадні дня сьв.Валянціна навыпередкі беглі памаліцца Богу і папрасіць у яго сапраўднага каханьня. Публіка сабралася паслухаць ігру віялянчэліста Жэрома Пэрно і яго сталага акампаніятара, піяніста Жэрома Дзюкро.

Абодва, нягледзячы на маладосьць (Пэрно нядаўна споўнілася 30, Дзюкро — 28), ужо зь дзясятак разоў канцэртавалі ў Менску. Яны ўпершыню выступілі ў беларускай сталіцы яшчэ ў 1996 г. і з таго часу нязьменна былі галоўнымі дзейнымі асобамі «Беларуска-французскіх музычных сустрэчаў».

Апрача канцэртаў французы абавязкова даюць майстар-клясы і ладзяць дабрачынныя акцыі на карысьць таленавітых беларускіх дзяцей. Так, у ліпені 2000 г. Жэром Пэрно ад імя французскіх музыкаў падараваў цудоўную віялянчэль Уладзімеру Сінькевічу, ляўрэату міжнародных конкурсаў.

Гэтым разам Жэром Пэрно знайшоў час, каб паслухаць ігру дзесяцігадовага Яна Карызны і трынаццацігадовай Насты Карызны — вучняў Гімназіі-каледжу пры Беларускай акадэміі музыкі. І брат, і сястра (унукі паэта Ўладзімера Карызны) пасьпелі зьвярнуць на сябе ўвагу айчынных і замежных спэцыялістаў. Ян — цудоўны віялянчэліст. Наста — ня толькі таленавітая скрыпачка, але й кампазытарка. Выступаючы перад пэдагогамі ды навучэнцамі Гімназіі-каледжу, Пэрно выканаў ейную віялянчэльную п'есу.

Жэром Пэрно грае з душой, але без надрыву. У ягоным граньні ўдала спалучаецца віртуознасьць і прыгожы, цёплы тон, імпульсіўнасьць і бездакорны густ, імправізацыйная свабода і тонкае разуменьне намераў аўтара. Чаго яму часам не хапае, дык гэта чысьціні інтанацыі, асабліва ў верхнім рэгістры. Калі б ня гэта, Пэрно з пэўнасьцю мог бы прэтэндаваць на пачэснае месца ў сусьветнай гіерархіі віялянчэльных талентаў. Асабліва прыгожа ён сыграў на Залатой Горцы санату Зьмітра Шастаковіча — пекны і трагічны твор, напісаны перад вайной, у кульмінацыйны момант сталінскіх рэпрэсіяў. Пэрно адшукаў у ім новыя фарбы. Прыкладам, сталася раптам відавочна, што Шастаковіч, як многія беларусы, захапляўся музыкай Вэрдзі.

Гэткае глыбокае пранікненьне ў музыку было б немагчыма, калі б не акампаніятарскі талент Жэрома Дзюкро. Віялянчэліст і піяніст гралі як адзін чалавек. Асабліва гэта адчувалася ў выкананьні двух танга аргентынца Альфрэда П'яцолы зь іхным вычварным, мудрагелістым рытмам. Пасьля гэтых танга заля выбухнула амаль стадыённымі вопескамі — з тупатам, крыкам і сьвістам. Людзі на хвіліну забыліся, што яны ў храме.

Юлія Андрэева

60 хвілінаў джазу

У аўторак 11 лютага а 21-й на хвалях радыёканалу «Культура» адбылася першая перадача з аўтарскага цыклу Марыны Ціхаміравай і Міхаіла Шайка «Парадоксы джазу».

Нарадзілася яна дзякуючы шчасьліваму зьбегу абставінаў. Ціхамірава і Шайко выпадкова апынуліся побач у адным зь менскіх клюбаў. На сцэне грала джазавая каманда. Шайко захоплена камэнтаваў. Паслухаўшы, Ціхамірава запыталася: «Ці здолееш ты весьці штотыднёвую перадачу пра джаз на радыё?»

Міхаіл Шайко — інжынэр-электроншчык, аматар і калекцыянэр джазу. Гэтай музыкай ён захапіўся ў 1970 г., калі пазнаёміўся з Уладзімерам Рабіновічам, які жыве цяпер у Нью-Ёрку, зарабляючы на жыцьцё тыражаваньнем расейскай і беларускай музыкі для жыхароў Брукліну. Тады, у Менску, Рабіновіч адным зь першых набыў стэрэафанічную радыёлу «Сымфонія» і калекцыю кружэлак з навінкамі заходняе музыкі. Іх прывозілі сябры — чарнаскурыя замежныя студэнты. Сваімі скарбамі Рабіновіч шчодра дзяліўся з знаёмымі, якіх у яго было — палова Менску. У ягонай кватэры можна было ня толькі паслухаць музыку, але й нешта перапісаць, атрымаць каштоўную даведку.

У Рабіновічавай хаце Шайко пазнаёміўся з шэдэўрамі джаз-року — кампазыцыямі гуртоў «Чыкага», «Кроў, пот і сьлёзы», «Каласэўм». Ад іх быў толькі крок да «чыстага» джазу, які захапіў Шайка раз і назаўжды.

Ня дзіва, што цяпер ён з гэткай свабодаю разважае пра джаз у жывым этэры, камэнтуючы скарбы з сваёй калекцыі. Першая перадача адбывалася ў форме імправізацыі, таму не абышлося без памылак. Так, Шайко казаў, што першыя фаналрафічныя запісы джазу былі зробленыя ў 1924 г. Аднак рэгтаймы Скота Джопліна былі запісаныя яшчэ ў пачатку 1900-х, а камэрцыйныя запісы новаарлеанскага джаз-бэнду «Tiger Rag» зьявіліся ў 1918-м.

Але гэта дробныя недакладнасьці. Галоўнае, што на Беларускім радыё цяперака існуе перадача пра джаз. Як сьцьвярджае Міхаіл Шайко, у яго распрацаваны матэрыял для 20—30 гадзінных этэраў, а рэсурсаў ягонай калекцыі хопіць на некалькі гадоў.

Ю.А.



Міхаіл Шайко ня толькі інжынэр-электроншчык, але і калекцыянэр джазу.

Па навуку — цераз Гімалаі

Цераз мяжу таемнымі сьцежкамі пераводзіць іх дарослы праваднік. Мінуць кардон нялёгка. Нават ня дзеля аховы, а з прычыны цяжкіх прыродных умоваў Гімалаяў. Некаторыя з 8—9-гадовых тыбэтцаў не вытрымліваюць гэтага падарожжа і

паміраюць, іншыя калечацца.

Хто дайшоў — трапляе ў «Тыбэцкую дзіцячую вёску», размешчаную ў Дгарамсале. Там маленькія тыбэтцы вучацца і жывуць у дзіцячых камунах пад наглядам выхавальнікаў.

Гэты асяродак існуе ўжо колькі дзясяткаў гадоў. Паўстаў ён пасьля масавых уцёкаў тыбэтцаў ад кітайскіх акупантаў у 1959 г., калі многія дзеці згубілі бацькоў. Каб даць ім жытло й адукацыю, з дапамогай розных міжнародных арганізацыяў былі створаны дзіцячы прытулак і школа.

Сёньня ў Індыі дванаццаць установаў такога кшталту. Там займаюцца больш за 11 тыс. вучняў. Спачатку гэта былі дзеці ўцекачоў альбо сіроты, але цяпер «з таго боку» йдуць і йдуць дзеткі па навуку.

Улады КНР амаль не дапускаюць тыбэцкай мовы ў школах Тыбэту.

Тыбэтцы, не зважаючы на сьмяротную небясьпеку, пасылаюць дзяцей у Індыю, каб тыя вучыліся на роднай мове

Пра вывучэньне яго гісторыі ці рэлігіі няма й гаворкі. У падручніках ёсьць толькі Мао, «кітайская Радзіма» і «збавеньне Тыбэту ад фэадалізму й адсталасьці». Да таго ж тыбэтцам трэба плаціць за вучобу больш, чым праўдзівым кітайцам.

Жывучы ж у індыйскім Дгарамсале, дзеці ня толькі вучацца па-свойму, але й атрымліваюць адпаведнае выхаваньне. Яно павінна зрабіць іх паўнавартаснымі чальцамі грамадзтва, дапамагчы ўсьвядоміць сябе тыбэтцамі. Многія вучні тыбэцкіх школаў пасьля паступаюць у індыйскія ўнівэрсытэты, робяцца спэцыялістамі, каб, як сказаў Далай Лама, «задаволіць патрэбы тыбэцкага выгнаньніцкага грамадзтва і быць гатовымі, калі надыдзе час, вярнуцца на Бацькаўшчыну».

Той, хто вучыўся ў Індыі, моцна рызыкуе, трапляючы ў акупаваны кітайцамі Тыбэт. Звычайна арыштоўваюць адразу, ледзьве зьявішся ў родным паселішчы. Уратавацца можна, толькі жывучы між чужымі, дзе ніхто ня ведае, што ты вучыўся ў тыбэцкай школе. Таму бальшыня выгнаньніцкае моладзі застаецца жыць і працаваць у Індыі, чакаючы лепшых часоў.

Штогод больш за тысячу дзяцей выпраўляюцца ў небясьпечнае падарожжа па навуку.

Сяргей Радштэйн

З ПОЛЬШЧЫ

Украінцам — бясплатныя візы

1 ліпеня гэтага году Польшча, выконваючы абавязак перад Эўразьвязам, увядзе візавы рэжым для грамадзянаў Беларусі, Украіны і Расеі. Менск таксама ўвядзе візы для грамадзянаў Польшчы. Украіна ж заявіла, што ня будзе патрабаваць візаў ад палякаў і спадзяецца, што Варшава таксама зробіць захады, каб польскія візы былі даступнымі для ўкраінцаў.

Аляксандар Квасьнеўскі, пасьля сустрэчы зь Леанідам Кучмам, заявіў, што Варшава ня можа цалкам адмовіцца ад увядзеньня візавага рэжыму для ўкраінцаў, бо гэта парушала б умовы шэнгенскага пагадненьня, якім карыстаюцца краіны Эўразьвязу ў справах супольнай мяжы. Аднак Польшча будзе выдаваць візы ўкраінскім грамадзянам бясплатна. Беларусы такіх ільготаў, на жаль, мець ня будуць.

«Оскарам» не завабіш

Ажно сем намінацыяў на прэмію амэрыканскай кінаакадэміі атрымаў сёлета фільм Рамана Паланскага «Піяніст», у якім распавядаецца пра лёс музыкі-габрэя, які ў часе другой сусьветнай вайны жыў у варшаўскім гета. Але па «Оскары» ня будзе каму ехаць: пракуратура Лос-Анжэласу паведаміла, што рэжысэр будзе арыштаваны за сэксуальныя стасункі з 13-гадовай. Паланскага зьвінавацілі ў гэтым яшчэ ў 1977 г., і больш ён у ЗША не зьяўляўся. Жыве сабе ў Парыжы.

А прадусар фільму Леў Рывін, які жыве ў Варшаве, цяпер у цэнтры найвялікшага ў гісторыі Польшы карупцыйнага скандалу. Ён падазраецца ў спробе выцягнуць зь фірмы «Агора» — выдаўца польскага штодзённіка «Gazeta Wyborcza» — 17,5 млн. даляраў хабару. Пракуратура адабрала ў Рывіна пашпарт.

Беларусы: аварыя і зьнікненьне

На тым тыдні два беларусы трапілі ў паведамленьні польскіх інфармацыйных агенцтваў. Адзін наш суайчыньнік у нецьвярозым стане «ўехаў» у цягнік на адным з чыгуначных пераездаў Беласточчыны. Ад машыны нічога не засталося, а ў яго толькі пара драпінаў. Іншаму пашчасьціла менш. Ён плыў на пароме са Швэцыі ў Гданьск і некуды з парому зьнік. Паліцыя кажа, што выпаў у мора. Пасьля працяглых пошукаў па маршруце парому ратаўнікі нікога не знайшлі.

Вока за мяса

На тым тыдні, у часе сутыкненьняў з паліцыяй паблізу Калішу, страціў вока адзін фэрмэр. Ужо трэці тыдзень польскія фэрмэры блякуюць дарогі. Яны патрабуюць, каб дзяржава наладзіла «інтэрвэнцыйны скуп» сьвінога мяса, бо на рынку яго зашмат і яно абясцэнілася. Дзяржава згодная і прапанавала амаль 80 цэнтаў за кілё, але фэрмэры патрабуюць болей.

Аляксей Дзікавіцкі, Варшава

З ЛІТВЫ

Жамойты — ня нацыя

Жамойты афіцыйна ня могуць лічыцца за асобную нацыю, як, да прыкладу, літоўцы, французы або швэды. Гэткую пастанову прыняў на мінулым тыдні Сэйм Літвы ў адказ на скаргу дэпутата Эгідыюса Скарбалюса і юрыста Арвідаса Нарвідаса. Перапіс 2001 г. зафіксаваў, што ў Літве жывуць прадстаўнікі 115 нацыянальнасьцяў. Аднак Дэпартамэнт статыстыкі не падаў ніякіх зьвестак пра жамойтаў (жыхароў паўночна-заходняй Літвы), тады як Скарбалюс і Нарвідас запісаліся менавіта гэтак. Бараніць сваю праўду яны гатовыя нават у судзе па правох чалавека ў Страсбургу.

«Нёман-інфарм»

Літоўскае грамадзянства для Амінат Саіевай

Расейскае Міністэрства замежных справаў апошнім часам пэрыядычна патрабуе ад Вільні спыніць дзейнасьць чачэнскіх арганізацыяў у Літве. Толькі за апошнія паўтара тыдня літоўскага пасла выклікалі ў МЗС РФ двойчы. Што так злуе расейцаў?

Сьпярша высьветлілася, што літоўская інтэрнэт-кампанія «Microlink» разьмясьціла на сваім сэрвэры сайт «Каўказ-цэнтру», які, паводле сьцьверджаньняў Масквы, прапагандуе тэрарызм. Аднак ні Дэпартамэнт бясьпекі, ні іншыя дзяржаўныя інстытуцыі Літвы гэтак ня лічаць.

Нагода для другой «занепакоенай» ноты — наданьне літоўскага грамадзянства Амінат Саіевай, намесьніцы кіраўніка чачэнскага інфармацыйнага цэнтру ў Вільні. Адпаведны ўказ Валдас Адамкус падпісаў 11 лютага. Падстава — ейны ўнёсак у падтрыманьне літоўска-чачэнскіх стасункаў.

Амінат Саіева нарадзілася ў 1949 г. у Казахстане, а ў Літве жыве ўжо амаль дзесяць гадоў. Яна называе сябе прадстаўніцай незалежнай Чачэніі ў Літве, хоць і ня мае афіцыйных паўнамоцтваў. У Вільні Саіева ўжо колькі гадоў ачольвае Чачэнскі інфармацыйны цэнтар, фармальным кіраўніком якога зьяўляецца былы дэпутат Сэйму Альгірдас Андрукайціс. «Інфармацыйнымі цэнтрамі» звычайна называюцца замежныя прадстаўніцтвы непрызнаных дзяржаваў.

Згаданымі фактамі літоўска-чачэнскія стасункі не абмяжоўваюцца. У Віленскім унівэрсытэце за дзяржаўны кошт вучыцца паўтара дзясятка чачэнскіх студэнтаў. Дый літоўскія вайскоўцы вывучаюць чачэнскі ваенны досьвед. Пра гэта сьведчыць нядаўна выдадзеная кніга палкоўніка Стасіса Князіса пра тактыку чачэнскіх партызанаў.

Сяргей Богдан



IREX-PROMEDIA

Новыя трагедыі ў вялікіх гарадах

Паводле адных зьвестак, мэтро ў паўднёвакарэйскім горадзе Тэгу падпаліў псыхічна неўраўнаважаны чалавек, незадаволены тым, як яго лячылі ў клініцы ўсходняе мэдыцыны. Паводле іншых, трагедыя здарылася выпадкова: юнак пстрыкаў запальнічкай, а яго штурхнулі. Ахвяраў — больш за 120 чалавек. У Чыкага падчас панікі ў начным клюбе загінулі больш за 20 наведнікаў. Усчалася яна пасьля таго, як хтосьці распырскаў пасярод натоўпу сьлезацечны газ. Няміга ў 1999-м забрала 53 юныя жыцьці. Усе гэтыя здарэньні — нашыя ахвяры жыцьцю ў тлуме вялікіх гарадоў.

Параза «Адзінай Расеі»

Пуцінская «Адзіная Расея» прайграла губэрнатарскія выбары ў Магадане. З прычыны нізкага ўзроўню жыцьця папулярнасьць урадавае партыі абвалілася да найніжэйшага з 1999 г. узроўню.

Ахвяры ў Балівіі

Ня менш за 30 чалавек загінула ў Балівіі. Верныя ўраду войскі патапілі ў крыві бунт сялянаў і паліцэйскіх, якія пратэставалі супраць павышэньня падаткаў і забароны на вырошчваньне кокі. Прэзыдэнт Лясада абапіраецца на падтрымку ЗША і МВФ. Апазыцыя хоча, каб ён сышоў з пасады. Пасьля тыдня крывавых сутыкненьняў урад падаў у адстаўку. Прэзыдэнт пакуль трымаецца.

Цэрквы на капішчах

Язычніцкая Старажытнаруская інглістычная царква патрабуе ад РПЦ перадачы ёй Крыжаўзьвіжанскае царквы ў Екацярынбургу і зямлі, на якой тая стаіць. Паганцы абгрунтоўваюць гэта тым, што храм збудавалі на месцы старадаўняга капішча Сварога. Інглістычная царква зарэгістраваная ў Расеі з 1996 г. Ейныя вернікі моляцца старажытнаславянскім багам — Перуну, Ярылу, Сварогу і г.д. РПЦ лічыць яе дэструктыўнай сэктай.

С.Т.

Кіраўнік ураду Інгерманляндыі, дараднік ваенна-дыпляматычнага прадстаўніка БНР у Фінляндыі і расейскі тэрарыст. Гэта ўсё пра аднаго чалавека — Георгія Эльвэнгрэна, які ў 1920 годзе ў сваёй прысязе абяцаў «шчыра і сумленна працаваць дзеля адраджэньня і ўзмацаваньня Беларускай Дзяржаўнасьці».

Бэрлін, красавік 1922. Генуэская канфэрэнцыя была апошняй надзеяй. Там эўрапейскія лідэры меліся абмеркаваць эканамічныя і палітычныя праблемы, якія заставаліся нявырашанымі пасьля заканчэньня вайны. Старшыня Рады Народных Міністраў БНР Вацлаў Ластоўскі і міністар замежных справаў Аляксандар Цьвікевіч ехалі на канфэрэнцыю ў складзе літоўскай дэлегацыі. Першым прыпынкам па дарозе ў Геную быў Бэрлін.

Дыпляматы і тэрарысты

Цягнік прыйшоў на «Schlesischer Bahnhof» з спазьненьнем. Як неўзабаве выявілася — бэрлінская паліцыя рабіла надзвычайныя захады бясьпекі ў сувязі з прыездам савецкай дэлегацыі, якая мелася на некалькі дзён спыніцца ў Бэрліне для правядзеньня кансультацыяў зь немцамі. Выходзячы з вакзальнага будынку, Ластоўскі азірнуў падарожны натоўп і нечакана пабачыў знаёмы твар.

Чарнявы чалавек з запалымі шчокамі, сустрэўшы позірк прэм'ера, імгненна зьнік.

Ластоўскі, аднак, як ні сіліўся, так і ня мог прыгадаць — хто ж гэта быў? І толькі праз два тыдні ў Генуі сам сабою знайшоўся адказ. Пераглядаючы газэты, сакратар літоўскай дэлегацыі Ляонас Бістрас пабачыў паведамленьне, што ў Генуі была арыштаваная група расейскіх тэрарыстаў, якія рыхтавалі замах на кіраўніка савецкай дэлегацыі Георгія Чычэрына. Сярод іх быў і Георгі Эльвэнгрэн, былы дараднік ваенна-дыпляматычнага прадстаўніка БНР у Фінляндыі. Той самы, які трапіўся Ластоўскаму на бэрлінскім вакзале.

Тэрарысты рыхтавалі замах на бальшавіцкіх дыпляматаў яшчэ ў Бэрліне — ад падкупленага афіцэра паліцыі Эльвэнгрэн даведаўся пра дакладны маршрут іх руху. Аднак у вырашальны момант першы кілер пакінуў сваё месца — зайшоў на момант у прыбіральню. Дублёр мог страляць, але чамусьці не наважыўся. Давялося ехаць за дэлегацыяй у Геную. 13 красавіка, праз тры дні пасьля адкрыцьця канфэрэнцыі, італьянская паліцыя арыштавала замахоўцаў. Дзякуючы заступніцтву Мусаліні, яны былі вызваленыя і высланыя ў Францыю.

Беларуская кар'ера Георгія або Юр'я Эльвэнгрэна пачалася ў чэрвені 1920 г. Васіль Захарка, які ў Рэвэлі вёў з эстонскім урадам перамовы аб прызнаньні БНР, знайшоў сабе памочнікаў у асобе генэрала Алега Васількоўскага і палкоўніка Георгія Эльвэнгрэна. Захарка параіў ураду прызначыць Васількоўскага дыпляматычным прадстаўніком у Фінляндыі, а Эльвэнгрэна — ягоным дараднікам.

«Людзі гэтыя шчыра вялі нашую працу на інтэрнацыянальнай тутака мове расійскай і францускай і няхай прадаўжаюць яе», — пісаў Захарка ў лісьце да Ластоўскага ў Коўна. Як у Фінляндыі, гэтак і ў Эстоніі ў генэрала з палкоўнікам было шмат знаёмых, якія, паводле Захаркі, маглі б прынесьці беларускай справе шмат карысьці. Эльвэнгрэна ён атэставаў як «надта здольнага чалавека, добра знаёмага з нацыянальнымі рухамі народаў», і дадаў, што «ён — беларус Менскай губэрні». Падобнае ўражаньне зрабілі абодва афіцэры і на Янку Чарапука — «людзі, відаць, выдатныя дзяржаўнікі і на першы погляд шчыра адданыя нашай справе».

Дзеля большай пэўнасьці перад залічэньнем на службу новыя беларускія дыпляматы склалі пісьмова ўрачыстую прысягу: «Даю гэтую падпіску, а разам з гэтым гонарам і сумленьнем маім сьведчу, што буду шчыра і сумленна працаваць дзеля адраджэньня і ўзмацаваньня Беларускай Дзяржаўнасьці, буду ўсюды, ні сіл ні жыцьця сваіх не шкадуючы, бараніць Незалежнасьці і Непадзельнасьці Беларускай Народнай Рэспублікі; ускладзеныя на мяне службовыя абавязкі спаўняць буду пільна і акуратна, а службовыя і дзяржаўныя сакрэты буду захоўваць».

* * *

Запрашаючы на службу Эльвэнгрэна, кіраўніцтва БНР і не здагадвалася, з кім мае справу. Хто ж быў гэты «добра знаёмы з нацыянальнымі рухамі народаў» чалавек? Нарадзіўся ён у 1889-м у Пецярбурскай (а зусім ня ў Менскай) губэрні ў сям'і палкоўніка Фінляндзкай гвардыі. Скончыўшы кадэцкі корпус і кавалерыйскую вучэльню, ён у 1910 г. паступае ў званьні карнэта ў прэстыжны полк гэтак званых «сініх кірасіраў», расквартараваны ў Гатчыне. Малады й спрытны карнэт, паводле ўспамінаў паплечнікаў, неўзабаве становіцца кумірам усіх гатчынскіх гімназістак.

З пачаткам вайны Эльвэнгрэн адзначыўся незвычайнай адвагай, заслужыўшы Георгіеўскі крыж. Падчас бурлівых падзеяў 1917 г., ужо ротмістар, ён нечакана ўсплывае то ў адным, то ў другім месцы, пакуль не трапляе ў Сімферопаль, дзе камандуе крымска-татарскімі аддзеламі ў баях з бальшавікамі. Баі гэтыя працягваюцца ўсяго некалькі дзён, пасьля чаго Крым пераходзіць у рукі чырвоных.

Пасьля гэтага кароткага эпізоду Эльвэнгрэн зьяўляецца ў Фінляндыі. У сакавіку 1918-га яму даручаецца камандаваньне 1-м Карэльскім палком, які на баку белых сілаў бярэ ўдзел у фінскай грамадзянскай вайне. Неўзабаве полк — у сьціплай колькасьці 630 чалавек — у выніку глыбокага рэйду ў тыл ворага разьбівае ўтрая мацнейшыя сілы чырвоных каля мястэчка Раўту (цяпер Саснова), забясьпечыўшы фінскаму беламу войску кантроль на Карэльскім перашыйку. Гэты бліскучы манэўр, пасьля якога Эльвэнгрэна пачалі называць героем Раўту, адбыўся 25 сакавіка 1918 г.

Пасьля заканчэньня фінскай Вызвольнай вайны Эльвэнгрэн займае пасаду памежнага камэнданта ў Віпуры (Выбаргу), жэніцца і жыве спакойным жыцьцём, пакуль не надараецца новая прыгода. У чэрвені 1919 г. яго наведвае дэлегацыя сялянскіх паўстанцаў з Паўночнай Інгерманляндыі. Жыхары гэтага краю — на поўнач ад Петраграду — не пажадалі далей цярпець бальшавіцкую харчразьвёрстку і гвалтоўную мабілізацыю ды пастанавілі распачаць збройнае змаганьне. Зьяўленьне сялянскіх дэлегатаў было для нашага героя цалкам нечаканым. Як ён прызнаецца пазьней, пра Інгерманляндыю і інгерманляндцаў ён дагэтуль нічога ня чуў і вельмі туманна ўяўляў сабе, хто яны і чаго дамагаюцца. Аднак на прапанову ўзначаліць збройныя сілы паўстанцаў згадзіўся бязь лішніх ваганьняў.

Прыняўшы камандаваньне, Эльвэнгрэн аддае загад аб наступе. На некалькі дзён паўстанцы займаюць усю памежную паласу, аднак надыходзіць бальшавіцкае падмацаваньне і пад кантролем паўстанцаў застаецца толькі пяць вёсак. На сходзе ў Раўту Эльвэнгрэн абіраецца старшынём Часовай Камісіі Паўночнай Інгерманляндыі — кіраўніком ураду. Новая дзяржава мае свой герб, гімн і сьцяг — сіні крыж з чырвонай аблямоўкай на жоўтым фоне. Урад засноўвае ўзнагароду — Крыж Белай Сьцяны, выпускае паштовыя маркі, выдае газэту. Дзейнічаюць суды, пошта і водны флёт (параплаў, шхуна і два чаўны).

У красавіку 1920 г. адбываюцца мірныя перамовы Фінляндыі з бальшавіцкай Расеяй. Памежная зона дэмілітарызуецца, і незалежная, хоць нікім і не прызнаная, Паўночная Інгерманляндыя перастае існаваць. Георгі — або па-фінску Юр'ё — Эльвэнгрэн, урачыста атрымаўшы Крыж Белай Сьцяны, разьвітваецца з кіраўнічай пасадай і выходзіць на новы жыцьцёвы паварот.

На даручэньне кіраўніка фінскай выведкі Бэртэля Озаліня Эльвэнгрэн выяжджае ў Варшаву, дзе наладжвае кантакт з Барысам Савінкавым і становіцца ягоным прадстаўніком у Фінляндыі. Расейскі палітычны камітэт Савінкава рыхтаваў супольны збройны выступ памежных краінаў супраць бальшавікоў. Эльвэнгрэн — на той час ужо палкоўнік — разам з сваім паплечнікам генэралам Васількоўскім займаецца вярбоўкай афіцэраў, якія жадаюць ваяваць у Расеі. Падчас гэтай акцыі яны і сустракаюцца ў Рэвэлі з Васілём Захаркам. Праз нейкі тыдзень пасьля гэтай першай сустрэчы Георгі-Юры-Юр'ё Эльвэнгрэн становіцца грамадзянінам Беларускай Народнай Рэспублікі.

* * *

Беларуская служба палкоўніка Эльвэнгрэна працягнулася нядоўга. Праз нейкі час непазьбежна выявіліся ягоныя сувязі з Расейскім палітычным камітэтам Савінкава ды з бацькам Булак-Балаховічам — гэткія кантакты былі расцэненыя ўрадам Ластоўскага як не зусім дарэчныя для беларускага дыплямата. У сакавіку 1921 г. Эльвэнгрэна звальняюць з пасады дараднікa дыпляматычнага прадстаўніка ў Фінляндыі.

Далейшы авантурны лёс «знаўцы нацыянальных рухаў» склаўся драматычна. Пасьля некалькіх гадоў працы ў падпольна-тэрарыстычных структурах Савінкава (прыгадаем падзеі ў Генуі), пасьля няўдачы ў падрыхтоўцы антыбальшавіцкага партызанскага руху ў Беларусі, Украіне і Заходняй Расеі, Георгі Эльвэнгрэн наважваецца на сваю апошнюю місію. У 1925-м ён нелегальна прыяжджае ў Расею для разгортваньня падпольнай працы. Праз нейкі час яго арыштоўваюць пад Цьвер'ю і 9 чэрвеня 1927 г. асуджаюць на расстрэл. За яго спрабуе заступіцца фінскі пасол у Маскве, але намесьнік наркама замежных справаў Ліцьвінаў гэтае заступніцтва адпрэчвае: рэч у тым, што Эльвэнгрэн прыехаў у СССР з румынскім пашпартам і на фінскае грамадзянства не спасылаўся.

І апошні беларускі штрых у гэтай гісторыі. Маці нашага героя звалася Адэлаіда-Марыя Шчавінская, і прычынай таго, што падчас прыёму на дыпляматычную службу Георгі Эльвэнгрэн назваўся «беларусам Менскай губэрні», якраз і магло быць яе беларускае паходжаньне.

Сяргей Шупа, радыё «Свабода»

ВІТАНЬНІ

Кацю і Сашу віншуем з Днём народзінаў! Усё будзе добра, і дзень прыйдзе новы. Яны

Honar i sumleńnie HDAU (i prosta charošyja chłopcy) vinšujuć Pileckaha Aleksandra z narodzinami. Hladzi na śviet viesialej!

Vinšujem Pileckaha Aleksandra z Dniom narodzinaŭ! Zdaroŭja, ščaścia, šmat siabroŭ! P. i S.

Цімоха Акудовіча віншую з 20-м Днём народзінаў. Хутка, мабыць, буду люляць сваіх пляменьнікаў. Ніка-Чукча

Тату і маму віншую з Народзінамі Цімоха. 11 лютага — forever! Нічка-сястрычка

Каця! Віншую цябе з Днём народзінаў! Посьпехаў, зьдзяйсьненьня мараў і здароўя. Паўлюк

Валер'я Патапенку ўся сям'я віншуе з Днём нараджэньня. Зычым усяго, што неабходна для поўнага шчасьця, ды яшчэ трохі.

Але Канапельцы, Валеру Богдану ды інш. лепшым жыхарам Ваўкавыску — шчырыя павітаньні! Адзін гамяльчук

КАНТАКТЫ

Запрашаем школьнікаў у этнаграфічна-краязнаўчы гурток. Даведкі праз тэлефон: 260-25-73 (любы час)

Прыношу шчырыя прабачэньні спадару Прасаловічу за амаральныя паводзіны ў інтэрнэце. Siaržuk

У мяне ёсьць падстава быць Вамі нездаволеным з Магілёва, а/с 10. Валера

Шукаю прыхільнікаў тэатру «Вольная сцэна» (РТБД) для сумеснага захапленьня існасьцю жыцьця і сапраўдным мастацтвам. Людміла Асіпенка

olsa.by.ru — аднаўлена гасьцёўня гурту «Стары Ольса»

Сп. Янка Запруднік, зь цікавасьцю прачытаў кнігу «Дванаццатка», 2002. Мару зьехаць. З павагай, Аляксей

Таму, хто цікавіцца. Нарымонт <Narimantas (ад літ. norėti «хацець» і manta «собсказьць»). Параўн. суч. бел.-літ. імёны й прозьвішчы (паводле Менскай тэлефоннае кнігі): Вісмант, Сармант, Жыгімонт (Зыгмантовіч <Zigmantas), Скірма/унт, Ямант, Эйсмант, Дымант ды інш. Карыбут (Корбут) <Kar(i)butas (karas «вайна» й buti «быць», па-славянску — Воіслаў, Воін). Параўн. інш. прозьвішчы й імёны гэтага тыпу: Албут, Борбут, Гайбут, Гімбут, Жэбут, Масібут, Нарбут, Пачобут, Роўбут, Сьвірбут, Сябут, Скробут, Цябут, Цьвірбут, Шыбут, Шубут ды інш.

Беларуская партыя свабоды ў Менску: кожны аўторак ля помніка Янку Купалу а 18-й. Пэйдж.: 211-00-00, аб.83602

Віцяблянка (29/160/55) з в/а, бяз шк/зв пазнаёмліцца з мужчынам бяз шк/зв для стварэньня беларускамоўнай сям'і. А/с 13, 210032, Віцебск

Пазнаёмлюся з жанчынай 28—38 год, каб разам любіць Беларусь і кахаць адзін аднаго. Т.: (8-213) 41-3-91

Пазнаёмлюся з матэрыяльна забясьпечанай, але адукаванай асобай. 200073, а/с 29

КВАТЭРА

Прадаюцца 3-пак. кватэры; у Менску і ў Радашкавічах. Вельмі танна. Т.: 215-31-90

Тэрмінова здыму 1-пакаёвую кватэру ў любым раёне для сябе. Т.: (8-0297) 50-84-19

КНІГІ, МУЗЫКА

У Наваполацку магчыма набыць беларускія кнігі, аўдыёкасэты, CD. E-mail: davedki@tut.by

«Arche» «Нашы дзеткі», іншыя беларускія выданьні і выданьні фонду «Arche» для гаразденцаў таньней. dzima7@tut.by

Выйшла кніга «Зьмены беларускага правапісу ў Савецкай Беларусі. Зб. дакумэнтаў». Дзеля набыцьця дашліце 1500 р.+вялікую канэрту з маркаю па Беларусі на адрас: вул.Беларуская, 14—2, 220030, Менск

Зянон Пазьняк. Новае стагодзьдзе. Збор артыкулаў. Т.: (8-0296) 02-16-18

ПРАЦА

Шукаю сталую працу. Зьміцер, 21 год. Т.: 505-46-59

Хлопец, I курс МДВРК, шукае любога падзаробку ў 2-й палове дня. Адказны, спраўны. Т.: 207-00-00, аб.20672

Шукаю працу. Магчымы пераезд. Т.: 254-77-59 (Аляксей)

Для тых, хто едзе на працу ў ЗША. Дапамагу з працаўладкаваньнем. Ienin@tut.by. Павал

Працу журналіста, адміністратара, вартаўніка, выхавацеля шукаю. Т.: 254-77-59 (Аляксей)

Рыхтую абітурыентаў для паступленьня ў мастацкую вучэльню. Т.: 283-56-46, 206-33-17

СТУДЭНЦКІ БІЛЕТ

Студэнцкі білет №004136 БАТУ на імя Ляшковіча А. лічыць несапраўдным

НОВЫЯ КНІГІ, ДАСЛАНЫЯ Ў РЭДАКЦЫЮ

Валахановіч А. Графы фон Гутэн Чапскія на Беларусі. — Менск, 2003. — 85 с.: іл.

Прадстаўнікі роду фон Гутэн Чапскіх, ад XVIII ст. стала жывучы ў Беларусі, істотна ўплывалі на нашую гісторыю й культуру. Гэтая кніга — першае манаграфічнае дасьледаваньне, прысьвечанае славутаму шляхецкаму роду. Тут зьмешчаныя радаводныя зьвесткі, фактычны й ілюстрацыйны матэрыял, датычны дзейнасьці найбольш выбітных асобаў з роду Чапскіх. Манаграфія распавядае таксама пра гісторыю й сучасны стан маёнтку Чапскіх у Станькаве. У якасьці дадатку друкуюцца легенды пра род фон Гутэн Чапскіх. Знайсьці выданьне можна ў «Акадэмкнізе», цана — блізу 3200 рублёў. Наклад — 110 асобнікаў.

Маракоў Л. Рэпрэсаваныя літаратары, навукоўцы, работнікі асьветы, грамадзкія і культурныя дзеячы Беларусі. 1794—1991 гг.: Энцыкл. даведнік: У 3 т. Т.1. Абрамовіч — Кушаль. — Менск: Athenaeum, 2002. — 480 с.

Многія з тых, чые прозьвішчы сабраныя ў даведніку, маглі б заняць пачэснае месца ў гісторыі ня толькі нацыянальнай, але й сусьветнай культуры. Гэтае выданьне дазваляе ацаніць маштабы вынішчэньня беларускай інтэлектуальнай эліты. Даведнік сьведчыць, што рэпрэсіўная машына працавала пры ўсіх уладах — царскай, польскай, фашыстоўскай. Сапраўднага свайго разгону яна дасягнула пры саветах, калі «барацьба з клясавым ды ідэйным ворагам» ператварылася ў нацыянальны генацыд.

Прадмова акрэсьлівае гісторыю рэпрэсіяў у Беларусі, вызначае асноўныя іх «хвалі». На кожную названую ў даведніку пэрсаналію — а толькі літаратараў у савецкія часы было арыштавана болей за 500 — падаюцца кароткія гісторыка-біяграфічныя зьвесткі.

Зуёнак С. Сонца ў кроплі расы: Экалягічныя назіраньні й замалёўкі з дакумэнтальнымі фатасьведчаньнямі аўтара / Маст. А.Макаўцоў. — Менск: Беларусь, 2002. — 120 с.: іл.

Гэты багаты на фатаздымкі «палявы дзёньнік» распавядае пра зьвяроў ды птушак, што насяляюць тэрыторыю Беларусі. Кніга створаная зь любоўю да прыроды й прасякнутая клопатам пра лёс усяго жывога. Прыдбаць выданьне можна ў «Сьветачы», «Цэнтральнай кнігарні», «Падпісных выданьнях», «Акадэмкнізе». Цана — блізу 3500 рублёў.

Іпатава В. Альгердава дзіда: Раманы. — Менск: Беллітфонд, 2002. — 608 с.

Гістарычная трылёгія Вольгі Іпатавай складаецца з трох раманаў — «Залатая жрыца Ашвінаў», «Вяшчун Гедыміна» ды «Альгердава дзіда». Падзеі твораў разгортваюцца ў XIII—XIV ст. — надзвычай значны для гісторыі Беларусі пэрыяд, мала асьветлены ў нашай мастацкай літаратуры. Аўтарка па-свойму асэнсоўвае лёсы славутых пачынальнікаў Вялікага Княства — Міндоўга, Гедыміна ды Альгерда. Кнігу адкрывае прадмова Ўладзімера Конана. Кніга выйшла ў сэрыі «Беларускі гістарычны раман». Каштуе каля 5500 рублёў.

Шышыгіна-Патоцкая К. Нясьвіж і Радзівілы. — 2-е выд. — Менск: Полымя, 2002. — 240 с.

Нясьвіж — своеасаблівая культурная сталіца Вялікага Княства, «маленькі Парыж», рэзыдэнцыя некаранаваных каралёў Рэчы Паспалітай Радзівілаў. Гісторыя гораду ахутаная мноствам таямніцаў. Адчуць непаўторны дух старажытнага Нясьвіжу, бліжэй пазнаёміцца з жыцьцём ягоных знакамітых, а часам і дзіўнаватых уладароў, даведацца пра Радзівілаўскія скарбы й Чорную Панну дазваляе праца Клаўдзіі Шышыгінай-Патоцкай. Гэтая надзвычай зьмястоўная кніга вытрымлівае ўжо другое выданьне. Прыдбаць яе можна ў большасьці менскіх кнігарняў.

Евроремонт для Беларуси: Беседы с Графом Александром Прушинским. — Таронта—Варшава: AGA, Б.г. — 76 с.: іл.

Гутаркі з вылучэнцам на кандыдата ў прэзыдэнты 1994 г. графам Аляксандрам Прушынскім дазваляюць шматбакова ацаніць асобу й палітычна-сацыяльныя перакананьні гэтага чалавека. Прысьвяціўшы сваю кнігу ўсім, хто працуе на карысьць Беларусі, граф Прушынскі прапанаваў уласны шлях рэфармаваньня краіны — своеасаблівы эўрарамонт, які дазволіць ператварыць Беларусь у «эўрапейскі Ганконг».

Протько Т. Становление советской тоталитарной системы в Беларуси (1917—1941 гг.). — Менск: Тэзэй, 2002. — 688 с.

Манаграфічнае дасьледаваньне Таціяны Процькі, унікальнае па аб'ёме й адборы матэрыялаў, раскрывае фэномэн савецкага таталітарызму на прыкладзе беларускай гісторыі. Функцыянаваньне аднапартыйнай сыстэмы й карных органаў, дзяржаўнае кіраваньне эканомікай, моцны грамадзкі прэсінг (пад сьціплым назовам «ідэйна-палітычнае выхаваньне»), скасаваньне сацыяльных і асабістых свабодаў, у тым ліку права на нацыянальнае самавызначэньне — гэтыя ды іншыя праявы таталітарнага ладу разглядае аўтарка, прыцягнуўшы багаты фактычны матэрыял. Праца напісаная па-расейску. Да таго ж прыдбаць яе змогуць далёка ня ўсе: цана выданьня ў «Акадэмкнізе» — болей за 27000 рублёў. Наклад — 3000 ас.

Тацяна Вабішчэвіч

ДЗЕ ВАРТА БЫЦЬ

Памяці Мулявіна

21 лютага ў КЗ «Менск» будзе канцэрт, прысьвечаны памяці Ўладзімера Мулявіна. Людзі, зь якімі Маэстра працаваў доўгія гады, — Леанід Барткевіч, Алег Казловіч, Ігар Пеня і іншыя — выйдуць на сцэну. Але арганізатары папярэджваюць: «Беларускіх песьняроў» ня будзе. Квіток — 3—15 тыс. Пачатак у 19.00.

«Народны альбом» — «Файно!»

28 лютага ў Менск завітаюць украінскія рок-зоркі — **«Воплі Відаплясава»**. Музыкі будуць прэзэнтаваць свой новы альбом пад назвай «Файна!» — шосты за 15-гадовую гісторыю. Альбом «ВВ» «Музика» быў колісь прызнаны найлепшым рок-альбомам у Расеі. Лідэр гурту Алег Скрыпка — гонар Украіны, хоць і нарадзіўся ён у Таджыкістане. Аднойчы Скрыпка выканаў гімн Украіны на 100-тысячным стадыёне ў Кіеве перад гульнёй футбольнай зборнай краіны. Канцэрт адбудзецца ў КЗ «Менск» а 19-й. Квіток будзе каштаваць 15—35 тыс. руб.

У той самы дзень у Купалаўскім тэатры (вул. Энгельса,7) мусіць быць аншляг — удзельнікі самага пасьпяховага супольнага праекту **«Народны альбом»** ізноў зьбіраюцца разам. Вольскі, Вайцюшкевіч, Камоцкая, Круглова, Памідораў і шмат хто яшчэ будуць сьпяваць і весяліцца, сьвяткуючы пяцігодзьдзе з часу выданьня «Альбому». Міхал Анемпадыстаў кажа, што зьбяруцца ўсе, апроч Ірыны Курапаткінай (сьпявала «Сьнежань, студзень і люты»), якая, на жаль, з ЗША адмыслова на канцэрт прыехаць ня здолее. Квіток можна набыць за 6—12 тыс. руб. Пачатак імпрэзы ў 20.00. Так што можна пасьпець паслухаць і «Воплі Відаплясава».

Блюз у саркафагу

1 сакавіка ў Палацы рэспублікі загучыць блюз. Тут свой дэбютны альбом «Diggin' it» будзе прэзэнтаваць дуэт **«Svet & Al»**. Хлопцы граюць клясычны блюз. У імпрэзе таксама возьмуць удзел гітарысты **Ільля Шэўчык** («Mojo Blues»), бубнач «Крамы» **Андрэй «Філ» Філатаў**, а таксама джаз-бэнд, што складаецца з студэнтаў Менскай музычнай вучэльні. Узорны блюз можна будзе паслухаць у Малой залі Палацу Рэспублікі а 19-й.

Адроджаны сьвет

Тры фотамастакі — Эдвард Сэрота зь Вены ды менчукі Міхал Баразна й Анатоль Кляшчук запрашаюць на сумесную выставу «Адроджаны сьвет», прысьвечаную габрэйскаму жыцьцю ў Цэнтральнай і Ўсходняй Эўропе з 1985 г. Ад 18 лютага да 9 сакавіка яе можна будзе пабачыць у Менску, у Музэі сучаснага выяўленчага мастацтва (пр.Скарыны, 47), 12 сакавіка — 7 красавіка ў Полацку ў Музэі беларускага кнігадрукаваньня (вул.Леніна, 22), 10—30 красавіка ў Магілёўскім абласным мастацкім музэі імя П.Масьленнікава (вул. Міронава, 33), 7—27 траўня ў гомельскай мастацкай галерэі імя Г.Вашчанкі (вул. Карповіча, 4), 29 траўня — 22 чэрвеня ў выстаўнай залі Бабруйскай гарадзкой арганізацыі Саюзу мастакоў (вул.Сацыялістычная, 100).

Сяргей Будкін



«Воплі Відаплясава» — легенда ўкраінскага року

О TEMPORA

З рубрыкі «Афіша» газэты «Літаратура і мастацтва»:

«Не забыліся, які сёньня дзень?.. Калі расійская поп-зорка Леанід Агуцін, некалькі гадоў таму выступаючы ў Менску ў гордай адзіноце пад прыцэлам тутэйшых фотарэпарцёраў, можа, і не зважаў на прысутнасьць у кругабегу будняў Валянцінавага дня, дык цяпер… Што й казаць! Папулярны і, трэба думаць, шчасьлівы сямейны дуэт з Расіі, Анжаліка Варум ды Леанід Агуцін прысьвячаюць свае гастрольныя выступленьні сьвяту ўсіх закаханых. Заўтра… у Палацы Рэспублікі. Празь дзень… у Берасьці».

Наша Ніва
незалежная газэта
заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991
галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

сакратарка рэдакцыі	Наста Бакшанская
галоўны рэдактар	Андрэй Дынько
выпускны рэдактар	Сяргей Ёрш
карэктар	Сяргей Петрыкевіч
карэктарка	Галіна Рабянкова
нам. галоўнага рэдактара	Андрэй Скурко
тэхнічны рэдактар	Андрэй Чык
выдавец і заснавальнік	Фонд выданьня газэты «Наша Ніва»

АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:
220050, Менск, а/с 537
Tel/fax: (017) 284-73-29, (0296) 13-32-32.
E-mail: nn@promedia.by
On-line: www.nn.by

© **НАША НІВА**. Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая. 8 палос фарматам А2. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Менск, пр. Скарыны, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасьці за зьмест рэклямных абвестак. Кошт свабодны. Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня № 581 ад 4 ліпеня 2002 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусі. Юрыдычны адрас: г. Менск, вул. Калектарная, 20а, п. 2а.

Наклад 3852.

Нумар падпісаны ў друк 19.02.2003.

Замова № 971.

Рэдакцыйны адрас: Менск, Калектарная, 20а/2а

Наша Ніва КУПОН БЯСПЛАТНАЙ ПРЫВАТНАЙ АБВЕСТКІ

Запоўніце гэты купон, і мы надрукуем Вашу абвестку (ня больш за 15 словаў) бясплатна. 220050, Менск, а/с 537

Тэкст _____

_____

_____

Імя і прозьвішча _____

Адрас, тэлефон _____